Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 САКАВІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 52 (27910) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Пластыкавая картка... для дзяцей

СТАР. 4

Што рабіць з нічыйнай хатай?

СТАР. 6

Сямейная газета

Бежанцы з Украіны ў беларускай глыбінцы

ЦЫТАТА ДНЯ

Георгій ГРЫЦ, намеснік старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі:

«Індывідуальным прадпрымальнікам павінна хапіць падоўжанага тэрміну для рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці, увезеных без дакументаў. Пры гэтым хачу падкрэсліць, што перанос тэрмінаў — гэта чарговы крок улады насустрач малому бізнесу. Рашэнне прадаваць тавары лёгкай прамысловасці толькі пры наяўнасці сертыфікатаў, якія пацвярджаюць іх якасць, прымалася не толькі і не столькі Беларуссю. Яно было яшчэ ў рамках Еўразійскай эканамічнай прасторы, Мытнага саюза і накіравана на барацьбу з кантрафактнай прадукцыяй. Гэта трэба разумець і правільна ўспрымаць».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.03.2015 г.

Долар ЗША	15110,00	▲
Еўра	16000,00	▲
Рас. руб.	245,50	▲
Укр. грыўня	677,58	▼

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15052

НА БАЛЬ ДА РОБАТАЎ

У Мінск упершыню прыехала сусветна вядомае інтэрактыўнае шоу «Баль робатаў». Гэта своеасаблівы агляд найноўшых дасягненняў робататэхнікі з Еўропы, Амерыкі, Паўднёвай Карэі і Японіі. На робатаў можна не толькі паглядзець, але і самому праверыць іх у дзеянні. Выстава з першых дзён карыстаецца вялікай папулярнасцю ў студэнтаў-радыётэхнікаў і, безумоўна, у дзяцей.

Фота Анатоля КІПІШЧУКА.

ПРОСТА медсястра МАРЫЯ

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

Выглядаць «як жанчына» ў жорсткіх умовах ваенных выпрабаванняў было вельмі няпроста, але ж старшы сяржант медыцынскай службы 1-га Беларускага фронту, 235-га зенітнага артылерыйскага палка 65-й арміі Марыя Амяльчук імкнулася. Сёння 94-гадовая ветэран вайны расказвае: калі ў 1945 годзе ў Германіі з'явілася магчымасць наведаць цырульню, туды пабеглі ўсе дзяўчаты. Яны былі ўзрушаны, убачыўшы сівую немку, якой рабілі модную прычоску...

— Тады я падумала: «Вось так і трэба выглядаць, што б у жыцці ні здарылася. Жанчына і ў сто гадоў павінна заставацца жанчынай». Да гэтага часу згадваю той выпадак і думаю: людзі павінны глядзець сябе і ў старасці. Я ўсё жыццё імкнулася быць акуратнай жанчынай. Нават на вайне, — шчыра ўсміхаецца Марыя Аляксандраўна.

«НА РУКАХ У МЯНЕ ПАМІРАЛІ МНОГІЯ»

Між тым у 1941 годзе юная Марыя Лапцева (гэта яе дзявоцкае прозвішча), як і многія равесніцы, жыццёвых шляхоў не выбірала. Яна паспела да вайны на «выдатна» закончыць школу медсёстраў, працавала ў гарадской бальніцы Бабруйска.

— Адразу ж, калі вайна пачалася, Бабруйск бамбілі. Там жа размяшчаліся многія вайскоўцы: танкісты, артылерысты, лётчыкі. Памятаю, як яўрэі, якіх у горадзе шмат жыло, вельмі плакалі. Яны ж чулі, што фашысты робяць з прадстаўнікамі іх нацыянальнасці. Шпіталь наш фарміраваўся ў Магілёве, і нас тэрмінова перакінулі ў ваенны гарадок у Асіповіцкім раёне.

Адтуль для Марыі і пачалося адступленне аж да самай Масквы — шпітальныя палаткі часам ставілі пад бамбёжкай фашыстаў. Параненых прывозілі столькі, што не ведалі, куды іх класці. Забітых не паспявалі пахаваць як трэба. Марыя Аляксандраўна расказвае, што шпітальныя ўрачы давалі ім загад дапамагаць у першую чаргу не тым, хто крычыць ад болю, а тым, хто маўчыць:

— Такія параненыя не здольны былі нават крычаць. У іх была вялікая страта крыві. На руках у мяне многія паміралі. Мы тады ўвогуле пра сябе не думалі. Не было часу ні паспаць, ні паесці. Ля аперацыйнага стала хірург заўважыць, што ты ўжо страчваеш прытомнасць — тады гоніць: ідзі мый рукі, адпачні крыху. Было так, што спалі па 1-2 гадзіны за суткі.

Ветэран жа ўзгадвае, што жанчыны ў той нялёгкі час былі апрануты ва ўсё мужчынскае. Дарэчы, нікому з іх у галаву не прыходзіла, што магло быць неяк інакш.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Будзем рады сустрэчы!

Сёння ва ўсіх раённых вузлах паштовай сувязі Мінскай вобласці праходзіць Дзень падпісчыка! Пры ўсім жаданні наведацца ў кожны раён магчымасцяў у нас не хапае. Таму прадстаўнікі «Звязды» чакаюць сваіх чытачоў з 11 да 14 гадзін у Слуцкім, Стаўбцоўскім і Пухавіцкім аддзяленнях. Менавіта там кожны падпісчык у гэты дзень зможа атрымаць памятны падарунак ад рэдакцыі. Запрашаем на сустрэчу!

Рабочы візіт Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 19-20 сакавіка наведае з рабочым візітам Казахстан, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Праграмай візіту запланавана сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы з яго казахстанскім калегам, на якой будуць разгледжаны актуальныя пытанні двухбаковага парадку дня. Чакаецца, што падчас візіту Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у трохбаковай сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі, Казахстана і Расіі. Кіраўнікі дзяржаў плануюць абмеркаваць існуючыя гандлёва-эканамічныя выклікі ў рабоце Еўразійскага эканамічнага саюза. Чакаецца, што прэзідэнты разгледзяць таксама некаторыя пытанні міжнароднага парадку дня, якія закранаюць інтарэсы трох краін.

■ Блізкая ўлада

Сямён ШАПІРА:

«Несумленных схем на Міншчыне не будзе»

13 жыхароў Мінскага раёна прыйшлі на прыём да старшыні Мінаблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ. Большасць з іх цікавіла пытанне падвядзення інжынерных і транспартных камунікацый да мікрараёнаў індывідуальнай забудовы.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна ўважліва выслухаў кожнага заяўніка. Але не паабяцаў вырашыць пытанне на іх карысць. На гэта ёсць аб'ектыўныя прычыны. У Мінскай вобласці ўзводзіцца 24 тыс. індывідуальных жылых дамоў, у тым ліку 4 тыс. ужо амаль завершаны. Між іншым, сродкаў з бюджэту на будаўніцтва да іх адпаведнай інфраструктуры не хапае. «Для таго, каб яе падвесці, неабходна каля 2 млрд рублёў, — патлумачыў губернатар. — Зараз Банк развіцця выдзяляе 400 млн рублёў, якія дазволяць знізіць кошт узвядзення камунікацый на 20%. Грамадзяне, што будуюць сабе жыллё, павінны таксама паўдзельнічаць у фінансаванні, унесці суму, якой не хапае. Затраты на будаўніцтва інфраструктуры будуць кампенсаваны за кошт бюджэтных сродкаў толькі шматдзетным сем'ям».

Рашэнне праблемы павінна быць празрыстым і справядлівым. А механізм дзеяння аднолькавы для ўсіх, не толькі для тых, хто пабываў на прыёме. Праводзіць электрычнасць у населены пункт толькі таму, што яго жыхары трапілі на прыём, несправядліва ў дачыненні да іншых, — канстатаваў старшыня аблвыканкама.

Прадпрымальнік з Мінска звярнуўся з просьбай пасадзейнічаць яму прадоўжыць інвестыцыйны дагавор. Ён павінен быў пабудаваць у Мінскім раёне непадалёку ад вёскі Мар'яліва пасёлак з малапавярховых дамоў. Ды ў вызначаныя законам тэрміны не зрабіў гэтага. Грамадзянін атрымаў адмову.

— Мяркуецца, што чалавек будаваў бы жылыя дамы і прадаваў іх. Але разам з тым ён бы прадаваў і зямельныя ўчасткі, на якіх яны размяшчаюцца. У выніку атрымаў бы прыбытак ад продажу зямлі, якую яму перадалі фактычна бясплатна, — рэзюмаваў Сямён Шапіра. — А такіх несумленных схем бізнесу ў вобласці я не дапушчу. Усе зямельныя участкі будуць рэалізоўвацца толькі шляхам аўкцыёнаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

ЗВАНКІ ПА СУБОТАХ

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 21 сакавіка прамыя тэлефонныя лініі

Рэспубліканская і рэгіянальная ўлада адкажа на званкі насельніцтва. На прамой тэлефоннай лініі — гарадскія і абласныя выканаўчыя камітэты, а таксама кіраўніцтва раёнаў. У кожнага ахвотнага ў чарговы раз будзе магчымасць задаць і атрымаць адказ на хвалюючае пытанне. Як паказваюць вынікі дыялогу, у пераліку актуальных тэм — сфера жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і прыватызацыі, адукацыі.

Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 правядуць:

Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Цупрык Леанід Аляксандравіч (80162213121);

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Шарстнёў Мікалай Мікалаевіч (80212204260);

Намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Гарбачоў Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Лісковіч Віктар Андрэевіч (80152735644);

Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Ліпніцкі Іван Эдуардавіч (80175004160);

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Янкоў Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

Старшыня Мінскага гарвыканкама Шорац Андрэй Віктаравіч (80172224444).

Як вядома, сёлета ў краіне арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній у мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей. Такія прамыя тэлефонныя лініі стартавалі 17 студзеня і праводзяцца кожную суботу.

Утерянные страховые полисы добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 0710041, БА 0710078, БА 0709663, страховые свидетельства обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (договор внутреннего страхования) серии ВР 2830331 – ВР2830350, ВР 5451892 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

■ А вы чулі?

БІЗНЕС-АДУКАЦЫЮ БУДЗЕ РЭГУЛЯВАЦЬ МІНЭКАНОМІКІ

А ўсе рэгіёны краіны пачалі шукаць у сябе кластары

«Каб сказаць, дзе ў Беларусі існуюць кластары дэ-факта (гэта значыць, яны могуць не называцца кластарамі, але дзейнічаць у рамках кластарнай мадэлі), на рэгіянальным узроўні праводзіцца маніторынг, у выніку будзе зроблена дакладная карта кластараў і пададзена апісанне, што дазволіла лічыць гэтыя групы кампаній кластарамі», — адзначыў начальнік упраўлення навукі і інавацыйнай палітыкі Міністэрства эканомікі Дзмітрый КРУПСКІ.

СУБСІДЫІ НА ІНФРАСТРУКТУРУ

Кластарамі ў эканоміцы называюць сканцэнтраваныя на некаторай тэрыторыі групы ўзаемазвязаных арганізацый (кампаній, карпарацый, універсітэтаў, банкаў і інш.): пастаўшчыкоў прадукцыі, камплектуючых і спецыялізаваных паслуг; інфраструктуры; навукова-даследчых інстытутаў; ВНУ і іншых арганізацый, якія дапаўняюць адна адну і ўзмацняюць канкурэнтныя перавагі асобных кампаній і кластара ў цэлым. Дзмітрый Крупскі растлумачыў, што кластары найбольш паспяхова фарміруюцца ў тых галінах, дзе ўладальнікі кампаній разумеюць неабходнасць такога ўзаемадзеяння. У якасці прыкладу начальнік упраўлення прывёў Парк высокіх тэхналогій і навукова-тэхналагічную асацыяцыю «Інфапарк», якія аб'ядноўваюць ІТ-кампаніі.

Міністэрства эканомікі падрыхтавала метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і ажыццяўленні маніторынгу кластарнага развіцця эканомікі з дакладна прапісанымі ідэнтыфікацыйнымі прыкметамі, па якіх аб'яднанні прадпрымальнікаў могуць быць прызнаны кластарамі. «Ідэнтыфікацыя неабходна для таго, каб аблвыканкамы з імі пэўным чынам працавалі, аказвалі ім падтрымку. Выгада ў тым, што выканкаму лягчэй супрацоўнічаць з аб'яднаннем, напрыклад, у плане арганізацыі для яго выставы на замежным рынку, вылучэння нейкай мэтавай дапамогі», — лічыць Дзмітрый Крупскі.

Каб падтрымаць развіццё ў Беларусі інавацыйна-прамысловых кластараў, Міністэрства эканомікі распрацавала праект нарматыўна-прававога дакумента, у якім прапісаны пытанні фарміравання і дзяржаўнай фінансавай падтрымкі такім аб'яднанням. У прыватнасці, мяркуецца выдзяленне субсідый на стварэнне аб'ектаў інфраструктуры (да 50% кошту).

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ НЕКАМПЕТЭНТНАСЦЬ

У нашай краіне на ўсіх узроўнях загаварылі пра недастатковую эфектыўнасць кіраўніцкіх рашэнняў. На думку Дзмітрыя Крупскага, праблема ў функцыянальнай неасвечанасці кадраў. «Адзін з праектаў Мінэканомікі, які будзе мець грамадскі рэзананс, прадугледжвае зацвярджэнне канцэпцыі развіцця новай сістэмы бізнес-адукацыі ў Беларусі і плана мерапрыемстваў па яе рэалізацыі», — адзначыў Дзмітрый Крупскі.

Прадстаўнік ведамства прызнае, што ў краіне адчуваецца дэфіцыт кіраўніцкіх кадраў, між тым менавіта ад рашэнняў, якія прымаюць кіраўнікі, залежыць поспех кампаніі, забеспячэнне жыццяздольнасці цэлых галін эканомікі. «Мэта канцэпцыі — змяніць падыходы да арганізацыі і падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў для нацыянальнай эканомікі, каб праз стварэнне неабходных умоў і механізмаў якасць падрыхтоўкі гэтых кіраўніцкіх кадраў павысілася і, адпаведна, была вырашана праблема функцыянальнай неасвечанасці».

Канцэпцыя прадугледжвае, што функцыі дзяржрэгулявання сістэмы бізнес-адукацыі пяройдуць да Міністэрства эканомікі. Плануецца стварэнне двухузроўневай сістэмы, у якую ўваходзяць вышэйшыя школы бізнесу на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі і бізнес-школы на базе арганізацый, якія прапаноўваюць паслугі бізнес-адукацыі (у тым ліку навучальныя цэнтры буйных вытворчых прадпрыемстваў). Прадугледжана выкарыстанне механізму дзяржаўнага заказу на падрыхтоўку кіраўнічых кадраў для нацыянальнай эканомікі.

Па словах Дзмітрыя Крупскага, у Беларусі на рынку бізнес-адукацыі працуюць каля 90 арганізацый, у тым ліку ВНУ, інстытуты перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў, прыватныя кампаніі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Май на ўвазе!

ДЫЯГНОСТЫКУ АЎТО ЛЕПШ НЕ ІГНАРАВАЦЬ

Супрацоўнікі УП «Белтэхагляд», Дзяржаўтаінспекцыі МУС і транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый праводзяць сумесную рэспубліканскую дэкаду пад назвай «Дзяржтэхагляд».

Фота БЕЛТА.

Статыстыка сведчыць, што каля 20 працэнтаў аўтаматараў ігнаруюць працэдуру тэхагляду. Ім трэба мець на ўвазе, што за эксплуатацыю транспартнага сродку без своечасова пройдзенага дзяржтэхнагляду яны могуць быць пакараны штрафам у памеры да трох базавых велічынь, а пры паўторным цягам года парушэнні штраф павялічыцца да пяці базавых велічынь.

Падчас рэйдаў увага ў першую чаргу будзе звяртацца на аўтамабілі, якія эксплуатуюцца без дазвольнай наклейкі на ветравым шкле. Будуць правярацца транспартныя сродкі, якія маюць яўныя неадпаведнасці па знешнім выглядзе. Асаблівую ўвагу спецыялісты нададуць аўтатранспарту, што перавозіць пасажыраў — аўтамабілям-таксі і маршруткам.

Сяргей РАСОЛЬКА

В извещение, опубликованное в газете «Звязда» от 18.03.2015 г. № 51, о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, проводимого Гайненским сельским исполнительным комитетом,

ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩЕЕ ИЗМЕНЕНИЕ:

Аукцион проводится 22.04.2015 года в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области, здание Гайненского исполнительного комитета.

УНН 600181697

У ДЭЛЬТА БАНКА ЗАБРАЛІ ЛІЦЭНЗІЮ

Праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб адкліканні з 18 сакавіка 2015 года спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці ў закрытага акцыянернага таварыства «Дэльта Банк». Пра гэта паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

Гэта рашэнне прынята па выніках разгляду інфармацыі, атрыманай ад часовай адміністрацыі па кіраванні ЗАТ «Дэльта Банк», у сувязі з невыкананнем названым банкам асобных ліцэнзійных патрабаванняў, а таксама фінансавым становішчам, якое пацягнула за сабой невыкананне банкам сваіх абавязацельстваў перад укладчыкамі і іншымі крэдыторамі.

Вяртанне фізічным асобам грашовых сродкаў у беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаных на рахунках і (або) ва ўкладах (дэпазітах) у ЗАТ «Дэльта Банк», будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 года № 369-З «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб». **Інфармацыя пра месца і час прыёму ад фізічных асоб заяў аб выплаце кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) будзе апублікаваная Агенцтвам па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб у рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі.**

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

УП «ИНСТИТУТ «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

для выполнения разделов геодезические изыскания, геологические изыскания, организация железнодорожного транспорта на БМЗ по объекту «Строительство завода для производства специальных сталей объемом производства 300 000 тонн в год» обоснование инвестиций, здание первого класса сложности (К-1). Опыт работы по проектированию железнодорожных путей Белорусского металлургического завода в г. Жлобине.

Срок предоставления предложений – 25.03.2015.
Фондеранцева Наталья Семеновна, тел. 8-017-200-28-30.

УНП 100049147

УП «Институт «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»

ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

для выполнения раздела «Противодымная защита» по объекту «Реконструкция здания специализированного розничной торговли по проспекту имени газеты «Правда», 20».

Срок предоставления предложения – 26.03.2015.
Фондеранцева Наталья Семеновна, тел. 8-017-200-28-30.

УНП 100049147

Утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 4286637, 3484326, 3842321, 4295993 и бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ №№ 1259872, 1104217, 1260459-1260460 **считать недействительными.**

УНП 100782388

«БАЗАР» ЗНОЎ БУДЗЕ ЗДЗІЎЛЯЦЬ

Квіткі на некаторыя канцэрты міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будуць прадаваць ужо ў гэтую пятніцу.

Дваццаць чацвёрты па ліку фэст №1 на прасторы былога СССР афіцыйна стартуе 9 ліпеня, а завяршаецца 13 ліпеня. Па традыцыі канцэрты, спектаклі і іншае пройдуць і па-за межамі афіцыйнай часткі «базару».

У праграме ёсць і новыя праекты.

— Першыя тры дні пачатку рэалізацыі квіткоў яны будуць прадавацца толькі ў касах Віцебска. І гэта ўжо становіцца традыцыяй — у знак павагі да жыхароў горада, дзе праводзіцца фестываль. А з панядзелка, 23 сакавіка, іх можна будзе купіць праз інтэрнэт у любым месцы планеты... Стараемся захаваць дэмакратычныя цэны на квіткі. І сёлета ў сярэднім іх кошт павялічыўся на 15%. З кожным годам расце выручка ад рэалізацыі квіткоў, а ў выніку самаакупнасць фестывалю. У прыватнасці, летась ён сябе акупіў на 77,5%, — адказаў на пытанне карэспандэнта «Звязды» **Аляксандр СІДАРЭНКА, дырэктар міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Самыя танныя квіткі на, бадай, самы папулярны канцэрт фэсту — урачыстае адкрыццё — каштуюць 650 тысяч рублёў, а дарагія — 1 мільён 650 тысяч. Прычым пакуль прозвішчы артыстаў, якія выступяць на адкрыцці, не распаўсюджваюцца. У дырэкцыі «базару» гэта тлумачаць арганізацыйнымі пытаннямі. Вядома, трэба заключыць дагаворы з «зоркамі», пацвердзіць іх удзел... Але, паводле слоў дырэктара «базару», гледачы не будуць расчараванымі. Тым больш што захаваецца інтрыга. Ды і тыя, хто першымі купяць квіткі, могуць выбраць самыя лепшыя месцы.

Фота БЕЛТА.

— Першы этап продажу квіткоў — на 10 канцэртаў, у тым ліку на 6 сольных: Валерыя Меладзэ, Рыгора Лепса, Ірыны Алегравай, Валерыі, Алены Ваенгі і групы «Бі-2», а таксама на закрыццё «базару» і іншыя, — працягвае Аляксандр Сідарэнка.

Безумоўна, па добрай традыцыі галоўныя падзеі на фестывалі — міжнародныя конкурсы. Ужо паступілі ў дырэкцыю заяўкі на выступленні талентаў з 27 краін — у конкурсе маладых спевакоў, і 25 — у дзіцячым.... Сёлета журы конкурсу выканаўцаў эстраднай песні ўзначаліць спявак і кампазітар народны артыст Азербайджана Палад Бюльбюль аглы.

— Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу ўпершыню будзе ўключана ў праграму цырымоніі закрыцця фестывалю. Члены журы і «зоркі» эстрады ўручаць узнагароды канкурсантам і павіншуюць іх песнямі, — падкрэслілі ў дырэкцыі.

А «галоўным» у журы дзіцячага конкурсу стане народны артыст Расіі Дзмітрый Малікаў.

Сярод новых праектаў — маладзёжны «Europa plus TV. LIVE» ў Віцебску» і фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». Апошні насамрэч стане прыемным сюрпрызам. Артысты вулічных тэатраў возьмуць удзел у шэсці, пад адкрытым небам пакажуць перформансы, спектаклі... Дэкарацыямі стануць сцены дамоў, асвятленнем — вулічныя ліхтары. І гледачы змогуць стаць артыстамі...

Здаецца, ну чаго новага можна чакаць ад «базару»? Аказваецца, з кожным годам ён становіцца яшчэ больш цікавым і насычаным падзеямі. Усе сакрэты і сюрпрызы пакуль што журналістам не раскрываюць. Пачакаем і абавязкова напішам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Спорт-тайм

МОМАНТ ІСЦІНЫ

На заключным этапе Кубка свету па біятлоне вызначыцца ўладальніца Вялікага хрустальнага глобуса

Біятлонны сезон у розыгрышы Кубка свету падыходзіць да завяршэння. Заключны этап стартуе сёння ў расійскім Ханты-Мансійску.



Даша або Кайса: чыя возьме?

Агульны залік Кубка свету ўзначальвае Дар'я Домрачава: беларуская біятланістка захапіла лідарства пасля 8-га этапу Кубка свету ў нарвежскім Халменколене, пасунуўшы сваю галоўную канкурэнтку Кайсу Мякярайнен на другі радок.

На чэмпіянаце свету ў Фінляндыі Домрачава медалёў не выйграла, але яна захавала за сабой лідарства ў барацьбе за Вялікі хрустальны глобус і нават павялічыла сваю перавагу перад апаненткай да 21-го ачка. Такім чынам, у актыве беларускі — 957 ачкоў, у фінкі — 936.

Арыфметыка простая: на заключным этапе Кубка свету Дар'і Домрачавай дастаткова апынуцца ў выніковым пратаколе кожнай з трох асабістых гонак побач з Мякярайнен (за перамогу ў асабістай гонцы на этапе Кубка свету налічваецца 60 ачкоў, за другое месца — 54, за трэцяе — 48), што па сілах трохразовай алімпійскай чэмпіёнцы.

Праграму 9-га, заключнага, этапу Кубка свету ў Ханты-Мансійску 19 сакавіка адкрыюць мужчыны спрынтарскай гонкай на 10 км. 20 сакавіка ў спрынце на 7,5 км будуць спаборнічаць жанчыны. Гонкі пераследавання адбудуцца 21 сакавіка. Завершыцца сезон у Кубку свету па біятлоне двума масстартамі 22 сакавіка.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

НАСУСТРАЧ ЛЕТУ

Датацыі на пуцёўкі ў летнікі павялічваюцца

Памеры датацый на пуцёўкі ў летнікі для дзяцей на час летняй аздараўленчай кампаніі будуць павялічаны. Па інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў, на гэтыя мэты прадугледжваецца накіраваць Br292,4 млрд.

Плануецца, што са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на патанненне адной пуцёўкі ў аздараўленчыя, спартыўна-аздараўленчыя летнікі з кругласутачным знаходжаннем будзе накіравана Br1 млн 400 тыс. (летась было Br1 млн 200 тыс.), з дзённым знаходжаннем — Br580 тыс. (было Br500 тыс.) У профільныя аздараўленчыя летнікі з кругласутачным знаходжаннем не менш як 9 дзён — Br600 тыс. (было Br520 тыс.), у лагеры працы і адпачынку з дзённым знаходжаннем — Br650 тыс. (было Br560 тыс.)

Прагназуецца, што сярэдні кошт пуцёўкі ў лагер з кругласутачным знаходжаннем складзе сёлета Br3 млн 720 тыс. Такім чынам, датацыя пакрые каля 40% кошту пуцёўкі. Каб паменшыць бацькоўскую даплату (яна, як і ў папярэднія гады, складзе каля 10%) традыцыйна грашовыя сродкі выдаткуюць мясцовыя бюджэты, прадпрыемствы, прафсаюзы і ўласнікі аздараўленчых летнікаў.

На аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы стацыянарных аздараўленчых лагераў да працы ў летні час са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання будзе выдзелена Br4,7 млрд.

Увогуле цягам летніх месяцаў плануецца аздаравіць у лагерах усіх тыпаў як мінімум 344 тысячы школьнікаў — каля 35% дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сувеніры, што выраблялiся падчас майстар-класа ў сядзібе «Марцінова гусь».

■ Шануй сваё

КЕРАМІЧНЫЯ ЛЬВЫ, ТЭКСТЫЛЬНЫЯ ЛЯЛЬКІ

На Валожыншчыне і Маладзечаншчыне ствараюць уласныя сувеніры

У Валожынскім і Маладзечанскім раёнах вырашылі ўсур'ёз заняцца распрацоўкай сваіх брэндаў. «Рэгіянальныя сувеніры для інтэграцыі мясцовых супольнасцяў» — так называецца праект, які сумесна ладзяць грамадскае аб'яднанне людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Асаблівы свет» і гісторык Алесь Белы. З гэтай нагоды сёння ў Валожыне адбудзецца першая сустрэча, удзел у якой могуць прыняць усе ахвотныя: вас чакаюць па адрасе Партызанская, 15.

Увогуле ж арганізатары плануюць правесці серыю майстар-класаў і дыскусій у Валожынскім і Маладзечанскім раёнах, каб выявіць, якія матывы (графічныя, сімвалічная) і формы сувеніраў могуць найлепш прадставіць гэтыя мясцовасці. Напрыклад, для Валожынскага раёна гэта могуць быць керамічныя івянецкія львы, значкі з зімародкам. Ёсць прапанова іранічна абыграць тэму кантрабандыстаў 1920-1930-х гадоў, якая паступова набірае папулярнасць. Маладзечанскі раён могуць прадстаўляць сувеніры, прысвечаныя Міхалу Клеафасу Агінскаму (тым больш што сёлета будзе адзначацца 250-годдзе з дня яго нараджэння).

Найбольш папулярныя і перспектыўныя ўзоры сувеніраў выберуць сумесна падчас сустрэч. За час праекта будзе заказана распрацоўка мінімум 2-3 формаў для керамічных медальёнаў (плакетак) у кожным раёне.

Майстар-класы правядуць майстры, якія ўжо займаюцца вырабам сувеніраў. Яны падзеляцца сакрэтамі свайго майстэрства, адкрыюць некаторыя тэхналагічныя прыёмы. Той, хто хоча прыняць удзел у якасці слухача, можа далучацца. Частка ўдзельнікаў будзе адабрана сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія маюць мастацкія здольнасці і хацелі б паспрабаваць сябе ў вырабе сувеніраў. Падчас праекта яны пазнаёмяцца з сувенірамі, якія ўжо існуюць, з перспектыўнымі тэхналогіямі іх вырабу і запатрабаваннямі рэальнага рынку.

У аграсядзібах Валожынскага раёна некаторыя мясцовыя сувеніры ўжо прадаюцца. Напрыклад, керамічныя цацкі Міраслава Раманоўскага з Івянца, шкляны посуд з гравіроўкай Васіля Рубцова з Кіеўца, традыцыйныя тэкстыльныя славянскія лялькі ад некалькіх майстрых з экапаселішча «Росы» і іншыя. Дарэчы, праект ухвалены Праграмай падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада ФРГ.

Як бачым, у тым, каб добра прэзентаваць сваю мясцовасць, павінны быць зацікаўлены мы самі. Бо хто ж, як не жыхары раёна, так добра ведае ўсе яго іскрынкі, прывабныя бакі. Будзем дзяліцца сваімі ідэямі і адкрываць малую радзіму вялікаму свету.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Прыляцела

Палярнае ззянне ўжо і ў нас

На тэрыторыі краіны жыхары Мінска, Гомеля і іншых гарадоў і рэгіёнаў маглі бачыць увечары 17-га і ўначы 18 сакавіка незвычайнае для краіны палярнае (паўночнае) ззянне. У інтэрнэце з'явіліся шматлікія публікацыі фотаздымкаў, якія зафіксавалі гэту падзею. Навукоўцы тлумачаць відовішча моцнай магнітнай бурай, а добрую карцінку з'явы дапамагло ўбачыць сухое надвор'е.

Як паведамляў Белгідраметэацэнтр, на нашу планету 17 сакавіка «вылілася» вельмі моцная магнітная бура інтэнсіўнасцю ў 4 балы па пяцібальнай шкале геамагнетычных эфектаў. Гэта геамагнітны шторм, які выклікае шырокамаштабнае ўзнікненне перанапружанняў у прамысловай электрасетцы і няўстойлівую караткахвалевую сувязь. Таксама пагаршаецца на некалькі часоў GPS-рух, сярэдняхвалевая радыёнавігацыя можа адсутнічаць.

Адхіленні магнітнага поля нашай планеты адбываюцца пад уздзеяннем сонечных выбліскаў. Яны выкідваюць аблокі плазмы, якія за 1,5-2 сутак дасягаюць Зямлі, што выклікае пры гэтым рэзкія змены магнітнага поля — магнітную буру і ўтварэнне палярных ззянняў. Таму ў гэтую ноч жыхары многіх населеных пунктаў Расіі і Беларусі маглі назіраць прыгожую і рэдкую для сярэдніх шырот прыродную з'яву. Фотаздымкі неба, расфарбаванага яркімі колерамі, літаральна ўзарвалі сацыяльныя сеткі. Карыстальнікі пісалі, што ў небе дзеецца сапраўднае чараўніцтва.

Раней спецыялісты прагназавалі, што з-за сонечнай буры мяжа палярнага ззяння перамясціцца на поўдзень і гэтую з'ява можна будзе назіраць у цэнтральных раёнах ЗША, на большай частцы Расіі, у Германіі, Беларусі і Польшчы. Нагадаю, што 20 сакавіка беларусаў чакае не менш значная падзея — вялікае сонечнае зацьменне, якое пачнецца ў 13 гадзін 6 хвілін па мясцовым часе. Чакаем.

Сяргей ПАЛІНІН

■ Фінансавы выдатнік

«ПУЦЁЎКА» Ў ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ — У 6 ГАДОЎ

А ўласны рахунак малому бацькі могуць аформіць разам з пашпартам

Маё сур'ёзнае знаёмства з грашыма адбылося недзе ў пятым класе (прыкладна 35 гадоў таму). Тады бабуля падаравала на дзень нараджэння ажно 3 савецкія рублі. Гэта быў капітал, бо бохан хлеба каштаваў 14 капеек. Што я потым рабіў з той зялёнай банкнотай — дакладна і не памятаю, але сам факт знаёмства з дарослым жыццём зафіксаваўся ў галаве назаўсёды. Сучаснае маладое пакаленне пачынае цяпер карыстацца грашовымі знакамі значна раней, ды і папяровыя рублі сёння перадаюць эстафету плацежным карткам.

Звычайна фінансавы лікбез малым праводзяць бацькі, аднак бываюць выпадкі, калі сям'і няма. Днямі спецыялісты нацыянальнай плацежнай сістэмы «БелКарт» вырашылі правесці ўрок фінансавай асветы для сірот і дзетак, пакінутых без догляду бацькоў, у дзіцячай вёсцы «Вытокі», што знаходзіцца ў Бараўлянах пад Мінскам. Адразу 20 выхаванцаў ва ўзросце 7-9 гадоў даведаліся шмат новага і цікавага пра сваё будучае дарослае жыццё.

ПЕРШАЯ КАРТКА — З ЖОЎТАЙ ДАЛОНЬКАЙ

Цяпер камерцыйныя банкі краіны дазваляюць бацькам афармляць дзіцячыя плацежныя карткі сваім малым ужо з шасцігадовага ўзросту. Гэта менавіта той узрост, калі нашы дзеткі пачынаюць свае першыя крокі па жыцці ў школе. А ў школе ёсць буфет, для наведвання якога патрэбны кішэнныя грошы. Але ці ўсе бацькі ўпэўнены, што кішэнныя рублі будуць абавязкова патрачаны на булачкі, коржыкі і шклянку соку?

Дзіцячую картку афармляе менавіта нехта з бацькоў, калі далучае яе да свайго банкаўскага рахунку. Але хвалявацца дарослым у гэтым выпадку не трэба, бо нумар гэтага рахунку дзіця не бачыць, ды ён малому і не патрэбен. Для зусім маладых новых уладальнікаў карткі магчыма вызначыць сапраўды малыя па аб'ёмах грашовых сродкаў ліміты, а таксама абмежаванні па выкарыстанні такіх картак у пэўных крамах. Потым геаграфію дазволеных магазінаў можна павялічыць, як і памеры лімітаў па сродках. Дарэчы, такія ліміты можна вызначаць на адну пакупку, па суме на дзень, тыдзень або месяц.

Большасць бацькоў упэўнена, што сёння карысным будзе ўвогуле забараніць зняцце наяўных грошай з карткі, каб ў дзіцяці не было магчымасці набыць нейкія забароненыя тавары (прадукты) непасрэдна з рук.

Афармляюць дзіцячую картку дарослыя, але на самім пластыку друкуецца імя і прозвішча яго маладога ўладальніка. Памеры і функцыянальнасць карткі супадаюць з арыгіналам, а вось афарбоўка можа істотна адрозніваццa. У сістэме «БелКарт», напрыклад, маладым кліентам прапануюцца дзіцячыя карткі са спецыяльнай налепкай у выглядзе дзіцячай далонькі жоўтага колеру. Гэты знак больш прызначаны для прадаўцоў, якія цяпер будуць ведаць, што картка належыць менавіта дзіцяці і яна не была ўзята ў дарослых без дазволу. Былі выпадкі, калі малых з карткамі без такіх знакаў у крамах не абслугоўвалі, бо ўзнікалі сумненні. Сёння карткі з далонькамі эмітуюць у сістэме «БелКарт» Беларусбанк і Аграпрамбанк. Увогуле дызайн падобных картак бывае розным. Так, Беларусбанк прапануе сваім кліентам адлюстроўваць на такіх картках фота саміх дзетак або браціка, сястрычкі, мамы, таты, коткі, лепшай цацкі і г. д.

Віка і Ася грашовую азбуку ўжо ведаюць.

СВОЙ РАХУНАК

Калі бацькі пачынаюць даваць сваім дзеткам не толькі дробныя пакупкі ў суседняй краме, але і больш сур'ёзныя фінансавыя аперацыі, то магчыма пераходзіць на далейшы ўзровень самастойнасці. Наступным этапам сталення маладога чалавека ва ўзросце пасля 14 гадоў будзе ўласная картка са сваім індывідуальным рахункам. Праўда, і ў гэтым выпадку такая картка будзе эмітавана банкам толькі з пісьмовага дазволу бацькоў. Каб заказаць выраб дзіцячага пластыку з індывідуальным рахункам, у банк павінен наведацца нехта з бацькоў са сваім пашпартам і пашпартам дзіцяці. Потым гэты рахунак бацькі могуць папаўняць праз механізм інтэрнэт-банкінгу, або дзедаўскім спосабам — гатоўкай у касах аддзяленняў банка.

Нават па такой больш дарослай картцы бацькі могуць вызначаць ліміты і па сумах пакупак, і па групах тавараў.

КАНТРОЛЬ У РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

Даваць сваім самым блізкім членам сям'і — гэта цудоўна, але малых лепш адначасова і кантраляваць. Пажадана ажыццяўляць гэта ў рэжыме рэальнага часу праз паслугу SMS-апавяшчэння. У гэтым выпадку бацькі будуць заўсёды ведаць, у якой краме, на якую суму і дакладна ў які час ваш малы зрабіў нейкую пакупку. Пры нейкім сумненні бацькі могуць адразу звязацца з дзіцем і пацікавіцца ў яго аб мэце і неабходнасці плацяжу. У гэтым выпадку да мінімуму зніжаецца верагоднасць выкарыстання карткі трэцімі асобамі. Бо ўласнік рахунку можа амаль імгненна заблакіраваць такую картку пасля адпаведнага сігналу ў банк.

СТАЎЛЕННЕ ДА ГРОШАЙ НЕ САПСУЕЦЦА

Існуе памылковая думка, што карыстанне плацежнымі карткамі ў малым узросце можа сфарміраваць у чалавека паняцце лёгкіх грошай, з якімі не шкада і развітацца (ён іх у руках не трымаў і нават не бачыў). Ці можа ўзнікнуць уражанне, што такія грошы нічога не «важаць».

Начальнік аддзела па сувязях з грамадскасцю — прэс-сакратар плацежнай сістэмы «БелКарт» Марына РОМАН згаджаецца з тым, што выкарыстанне картак часткова правакуе страту сувязі карыстальніка з наяўнымі грашыма. Аднак гэта тычыцца менавіта дарослых, якія прывыклі мець папяровыя грошы ў кашальку. А вось у эру лічбавых тэхналогій і безнаяўных разлікаў, якія пачалі выкарыстоўвацца ў свеце яшчэ раней за нараджэнне новага пакалення, плацежныя карткі і электронныя грошы ўжо не з'яўляюцца нейкай навінкай для іх, а хутчэй нормай і патрабаваннем часу, лічыць спадарыня Роман.

«Мы ўжо некалькі гадоў наведваем школы са сваёй праграмай фінансавай асветы. Раней плацежныя карткі былі толькі ў аднаго-двух вучняў з класа, а цяпер колькасць такіх дзетак павялічылася ў некалькі разоў», — расказвае яна.

На дзіцячай картцы жоўтая далонька ў верхнім правым куточку.

Дзеткі будуць дакладна ведаць свой акрэслены ліміт і разумець, дзе і як можна сэканоміць, каб назбіраць грошай для здзяйснення сапраўды важнай пакупкі. А вось кішэнныя грошы звычайна разыходзяцца на дробязі значна хутчэй. Нездарма ў народзе існуе ўжо старая прымаўка аб тым, што грошы кішэню паляць...

Аўтар матэрыялу з пасылам Марыны Роман цалкам згодны. Напрыклад, у свой час мая дачка атрымала ад хроснай маці падарункавую картку, дзе было 250 тысяч рублёў. Гэтыя грошы з карткі яна на чыпсы не траціла. Доўга выбірала і купіла даволі прыгожы заплечнік. Менавіта картка прымусіла яе прымаць сапраўды дарослае рашэнне аб рацыянальным карыстанні грашыма.

ГЭТА ЦІКАВА ЎСІМ

Дзеткам з дзіцячай вёскі «Вытокі» ўрок аб фінансах спадабаўся. Малыя шчыра цікавіліся алгарытмам карыстання плацежнымі карткамі, якія для іх з'яўляюцца атрыбутам дабрабыту. Яны з цікавасцю вывучалі ўзоры картак і спрабавалі карыстацца плацежным тэрміналам.

Самыя актыўныя ўдзельніцы ўрока **Вікторыя БАНДАРЭВІЧ** і **Ася КАЗАРАН** расказалі мне, што цяпер яны ведаюць, як трэба захоўваць пін-код: яго трэба трымаць асобна ад пластыкавай карткі і нікому не паведамляць. Схаваць паперку з лічбамі можна і ў шкарпэтцы, але лепш трымаць такую інфармацыю ў галаве. Дзяўчынкі даведаліся, што абменьваць замежную валюту абменныя пункты банкаў будуць нават дзеткам ва ўзросце пасля 14 гадоў. А вось абменьваць долары прыватным спосабам з іншымі асобамі (у тым ліку ў краме) нельга, бо гэта ўжо незаконна і могуць забраць у міліцыю. А яшчэ цяпер яны ведаюць, што грошы не ляжаць нейкім чынам у пластыкавай картцы, а знаходзяцца ў банку. Картка проста звязвае кліента з банкам, пасля чаго грошы адтуль трапляюць праз тэрмінал у краму. Мне здаецца, што дакладна гэтую інфармацыю ведае нават не кожны дарослы.

❍ ❍ ❍

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефонах 8 (017) 292 38 02 і 8 (017) 287 17 51.

Сяргей КУРКАЧ.
Мінск — Бараўляны — Мінск

■ Праекты

ПАЛЯПШАЕМ ЭКАЛОГІЮ ПРАЗ ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Браслаў, Полацк і Чавусы атрымалі еўрапейскае фінансаванне ў памеры 2,36 млн еўра на рэалізацыю сваіх планаў па ўстойлівай энергетыцы. Гэтыя гарады далучыліся да «Пагаднення мэраў» — ініцыятывы Еўрапейскага саюза, удзельнікі якой жадаюць скараціць да 2020 года аб'ём выкідаў CO_2 не менш чым на 20%.

СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ПОЙДУЦЬ У АБЛАСНЫЯ ШКОЛЫ

Дзякуючы праекту жыхары Полацка атрымаюць лепшае гарадское асвятленне за меншыя грошы, Чавусаў — эканомію вады і паляпшэнне яе якасці, Браслава — меншыя рахункі за газ. «Пагадненне мэраў» падпісалі 6278 гарадоў па ўсім свеце, у Беларусі — 11 гарадоў: Полацк, Наваградак, Ашмяны, Браслаў, Рагачоў, Маладзечна, Чавусы, Лёзна, Слуцк, Мар'іна Горка і Іўе. У рамках гэтай ініцыятывы гарады атрымліваюць дадатковы доступ да сучасных распрацовак і тэхналогій у галіне энергазберажэння, вопыту іншых гарадоў, могуць атрымаць кансультацыю, грантавую і крэдытную дапамогу міжнародных фінансавых арганізацый па падтрымцы сваіх планаў па развіцці ўстойлівай энергетыкі.

Як адзначыў **намеснік старшыні Дзяржстандарту, дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей СЯМАШКА,** гэтая праграма з'яўляецца адным з кірункаў супрацоўніцтва з Еўрасаюзам у галіне эфектыўнага выкарыстання энергіі.

«У 2014 годзе, не самым простым з эканамічнага пункту гледжання, мы знізілі энергаёмістасць больш чым на 1,5%. Гэта досыць расходнае мерапрыемства, і мы ўдзячныя нашым партнёрам, якія нам дапамагаюць. Рэалізуем і іншыя праекты, што тысячца энергаэфектыўнасці ў галіне стандартаў, у галіне мадэрнізацыі нашых школ. Мы таксама пачалі новы праект, згодна з якім будуць мадэрнізаваны 3 школы ў Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай абласцях. У нас ёсць добрыя перспектывы», — расказаў Сяргей Сямашка.

Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Майра МОРА таксама нагадала на сустрэчы з журналістамі аб ужо існуючым праекце ўцяплення школы-інтэрната ў Іўі. Там, акрамя ўстаноўкі шклопакетаў, энергазберагальных лямпачак і ўцяплення сцен будынка, укаранілі сістэму рэкуперацыі паветра. Дзякуючы яе выкарыстанню змяншаюцца выдаткі на абагравание памяшканняў. Нагрэў вады адбываецца з дапамогай усталяванай сонечнай батарэі на даху будынка кацельні.

СВЯТЛО, ВАДА І ГАЗ ЗА МЕНШЫЯ ВЫДАТКІ

Праект у Браславе ставіць перад сабой мэту падрыхтаваць і пачаць рэалізацыю праграмы па скарачэнні выкідаў вуглякіслага газу ў Браслаўскім раёне. Гэта дасць магчымасць кожны год эканоміць каля 620 тон умоўнага паліва, скараціць штогадовыя выкіды вуглякіслага газу больш чым на 3000 тон, значна пашырыць выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі. Агульны бюджэт праекта — 735 тысяч еўра, з іх 584 тысячы — выдаткоўвае Еўрапейскі саюз. Асноўная сума выдаткуецца на ўстаноўку катлоў, якія працуюць на саломе, замену састарэлага абсталявання, закупку эфектыўных цеплаабменнікаў для шматкватэрных дамоў, сонечных калектараў для дзіцячых садкоў, цеплавой помпы, электрамабіля, роварaў.

Еўрапейскі праект «PubLiCity: энергаэфектыўная мадэрнізацыя гарадскога асвятлення» дазволіць Полацку знізіць выкіды CO_2, паменшыць спажыванне электраэнергіі, стаць больш зручным для саміх палачан і больш прывабным для шматлікіх турыстаў. На працягу 4 гадоў працы над праектам на 16 полацкіх вуліцах і праспектах будуць усталяваны 900 энергаэфектыўных лямпаў, а для падсвятлення 44 будынкаў і помнікаў — прыкладна 1000 дэкаратыўных лямпаў з мінімальным выдаткам электраэнергіі. Каб яшчэ больш аптымізаваць яе спажыванне, у Полацку з'явяцца 56 шафаў аўтаномнага кіравання асвятленнем: гэтыя прылады будуць рэгуляваць працу гарадскіх ліхтароў у залежнасці ад часу сутак на 63% тэрыторыі полацкіх вуліц. Бюджэт усяго праекта складзе 1,6 млн еўра, уклад ЕС — 1,3 млн еўра, пры гэтым больш за 1 млн будзе выдаткавана на закупку энергаэфектыўнага абсталявання. Мяркуецца, што абнаўленне сістэмы гарадскога асвятлення сэканоміць для Полацка каля 480 МВт электраэнергіі. А выкіды CO_2 знізяцца на 220 тон. Гэта наблізіць горад да дасягнення мэты па памяншэнні аб'ёмаў CO_2 на 20% да 2020 года. Мэта праекта «Сістэма аўтаматызацыі працэсу ўліку выдаткаванай энергіі і вады: беражыце ваду» ў Чавусах — комплексная і інавацыйная мадэрнізацыя гарадскога водаканала, у выніку якой плануецца дасягнуць эканоміі вады (на 8%) і электраэнергіі (на 3%), палепшыцца якасць і надзейнасць камунальных паслуг, скароцяцца выкіды парніковых газаў (на 2,8%) і агульнае забруджванне навакольнага асяроддзя, павялічыцца ўцягнутасць насельніцтва ў працэсы эканоміі вады і энергіі. Бюджэт праекта складае 595 тысяч еўра. Уклад ЕС — 476 тысяч.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■ Залатыя рукі

У Бразілію праз... Казань

адправяцца лепшыя ў сваёй прафесіі

У жніўні гэтага года ў бразільскім Сан-Паўла адбудуцца «алімпійскія гульні» сярод прадстаўнікоў рабочых прафесій, удзел у якіх упершыню возьмуць і беларусы. У студзені 2014 года Беларусь далучылася да руху WorldSkills.

— Сёння нікога не трэба пераконваць у важнасці прафесійнай адукацыі для нашай краіны, — падкрэслівае **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.** — Для таго, каб забяспечыць беларускую эканоміку рабочымі кадрамі, на працягу бліжэйшых пяці гадоў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі мы павінны прымаць на вучобу не менш як 35 тысяч чалавек. І гэта пры тым, што кантынгент школьнікаў скарачаецца. Да таго ж большасць выпускнікоў сярэдняй школы нацэлены на атрыманне вышэйшай адукацыі....

Дарэчы, тэндэнцыя зніжэння ў моладзі інтарэсу да рабочых прафесій носіць агульнасусветны характар. Вось чаму папулярызацыі рабочых прафесій надаецца выключная ўвага на самым высокім дзяржаўным узроўні — так, падчас адкрыцця апошніх спаборніцтваў у Лейпцыгу ўдзел у мерапрыемстве прымала нават канцлер Германіі. Але спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб дапамагчы прадстаўнікам самых розных краін павысіць прафесійныя кампетэнцыі і спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў.

— Патрабуецца пераасэнсаванне ў грамадстве напаўнення і зместу рабочых прафесій. Сучасныя рабочыя — людзі з самай рознай адукацыяй. Ёсць прафесіі, дзе ад рабочага персаналу патрабуецца наяўнасць сярэдняй спецыяльнай і нават вышэйшай адукацыі. Узяць тую ж робататэхніку, — тлумачыць **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь ШКЛЯР.** — Інавацыйная эканоміка патрабуе меншую колькасць кадраў, але кадраў самай высокай кваліфікацыі. Далучэнне нашай краіны да **WorldSkills International (WSI)** дало нам магчымасць атрымаць доступ да новых кампетэнцый, што прымяняюцца ў перадавых краінах. Для нас гэта магчымасць «зверыць гадзіннікі» ў сістэме прафесійнай адукацыі і зразумець, чаму ў адной краіне для падрыхтоўкі рабочага дастаткова 10 ці 12 месяцаў, а ў іншай яго рыхтуюць на працягу трох гадоў. Трэба, каб усе зразумелі — у Бразіліі патэнцыяльныя інвестары будуць ацэньваць перш-наперш нашу краіну: ці ёсць у Беларусі кадры, якія могуць працаваць на самым сучасным абсталяванні. І для ацэньвання будуць выкарыстоўвацца міжнародныя індыкатары якасці...

Аляксандр Шкляр расказаў, што ў маі бягучага года беларусы адправяцца ў Казань, дзе пройдзе чэмпіянат WorldSkills для краін СНД (па 40 кампетэнцыях). Беларусы будуць удзельнічаць у спаборніцтвах па 18 кампетэнцыях, і ўжо па выніках выступлення ў Расіі і атрыманых водгукаў з боку міжнародных экспертаў будзе прымацца рашэнне, каго адправіць змагацца за гонар нашай краіны ў Бразілію. Пакуль што Беларусь заявілася на 16 кампетэнцый з 56, хоць, хутчэй за ўсё, мы зможам рэальна замахнуцца на 3—5 кампетэнцый — там, дзе ёсць шанцы выступіць на годным узроўні.

З кандыдатамі ў нацыянальную каманду зараз праводзяцца трэніровачныя зборы. За кожнай прафесійнай кампетэнцыяй замацаваны эксперт (спецыяліст з установы адукацыі ці прадпрыемства), перакладчык і куратар.

— Вымушаны канстатаваць, што ў Беларусі мы пакуль не можам падабраць экспертаў, якія б маглі забяспечыць поўную адпаведнасць стандартам WorldSkills, таму імкнёмся прыцягваць міжнародных экспертаў і адпраўляць маладых рабочых для ўдасканалення іх прафесійнага майстэрства ў іншыя краіны. Напрыклад, наш хлопец удзельнічаў у прафесійным чэмпіянаце ў ЗША па зварцы: гэта каштоўны досвед, бо, як высветлілася, там зваршчык павінен валодаць чатырма відамі зваркі, а мы выпускаем рабочых, якія асвоілі толькі адзін яе від, — распавёў Аркадзь Шкляр. — Нядаўна з Італіі вярнулася каманда па кулінарным мастацтве. У Германію адправіліся нашы спецыялісты па фрэзерных і такарных работах. Спецыялісты па мехатроніцы паедуць у Фінляндыю, па кабельных сістэмах — у Нідэрланды.

Пры падрыхтоўцы да міжнародных спаборніцтваў даводзіцца ўлічваць шмат нюансаў. Напрыклад, у Бразіліі кухарам давядзецца гатаваць стравы з паўднёваамерыканскіх прадуктаў. Таму праблемай можа стаць нават прыгатаванне рысу: іншы сорт — іншы час гатавання. Драўніна, цэмент — усё адрозніваецца...

Адным з найбольш складаных і нечаканых заданняў у намінацыі «Кандытарскае мастацтва» для беларускіх канкурсантаў стаў выраб шакаладных цукерак. Справа ў тым, што гэтая тэма ўвогуле адсутнічае ў вучэбных праграмах нашых навучальных устаноў кандытарскага профілю.

— Мы вельмі ўдзячныя ўсім прадпрыемствам і арганізацыям (і дзяржаўным, і недзяржаўным), якія дапамагаюць нашым камандам: даюць неабходную сыравіну, абсталяванне, арганізуюць майстар-класы і гэтак далей, — падкрэсліў Аркадзь Шкляр.

Кажуць, што ў гісторыі руху WorldSkills не было выпадку, каб краіна, якая толькі што далучылася да спаборніцтваў, адразу здзейсніла магутны рывок і трапіла ў «топ» пераможцаў. Але Аркадзь Шкляр настроены аптымістычна: «Мы не збіраемся займацца шапказакідальніцтвам, але ёсць намінацыі, дзе ў нас захоўваюцца высокія шанцы...»

Надзея НІКАЛАЕВА

Нацыянальны чэмпіянат прафмайстэрства «WorldSkills Belarus — 2014». Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Асацыяцыя *WorldSkills International (WSI)* была створана ў 1946 годзе ў Іспаніі для папулярызацыі рабочых прафесій, у тым ліку праз правядзенне міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве. Гэта своеасаблівы міжнародны камітэт па прафесіях. Першы чэмпіянат WorldSkills прайшоў у Мадрыдзе ў 1950 годзе. Апошнія міжнародныя спаборніцтвы праводзіліся ў Лейпцыгу ў 2013 годзе і сабралі 200 тысяч гледачоў, расцягнуўшыся ажно на чатыры дні. Арганізацыя ахоплівае больш як 70% насельніцтва планеты і ўсе кантыненты. Беларусь стала 69-й краінай, якая далучылася да WSI. Пасля нас у клуб «залатыя рукі» ўступілі яшчэ тры краіны, у тым ліку Казахстан. Такім чынам, у Бразіліі спаборнічаць будуць прадстаўнікі ўжо 72 краін.

■ «Разумны» ўніверсітэт

АПЫНУЦЦА НА «ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ»

Змогуць прагульшчыкі ў «МІТСО»

Днямі найстарэйшая прафсаюзная ВНУ краіны атрымала новы вучэбны корпус. На яго ўрачыстым адкрыцці пабывалі карэспандэнты «Звязды».

— Адкрыццё новага корпуса ўстановы і арганізацыя Рэспубліканскага вучэбна-метадычнага цэнтра прафсаюзаў сімвалізуюць сабой новы крок у развіцці прафсаюзнага руху ў краіне, — лічыць **рэктар «МІТСО» Станіслаў КНЯЗЕЎ.** — Наша галоўная задача цяпер — выйсці на пазіцыі smart-універсітэта, дзе будуць выкарыстоўвацца ўсе самыя сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Новы корпус, здадзены ў эксплуатацыю, — гэта адзін з крокаў рэалізацыі такой задумы. У ім могуць навучацца да 500 студэнтаў адначасова. Будынак насычаны самым розным электронным і мультымедыйным абсталяваннем. Знаходзячыся ў аўдыторыі, кожны студэнт праз унутраную сетку можа атрымліваць усе неабходныя матэрыялы. Існуе магчымасць правядзення дыстанцыйных лекцый для нашых студэнтаў, што навучаюцца ў віцебскім і гомельскім філіялах, і шмат іншых.

Па словах рэктара «МІТСО», стварэнне раённых і гарадскіх аддзяленняў прафесійных саюзаў, што адбываецца зараз, вымагае ад сістэмы прафсаюзнай адукацыі адпаведных падыходаў. Цяпер такіх аддзяленняў ужо 150, і кожнаму з іх неабходны спецыялісты высокага ўзроўню. Займацца іх падрыхтоўкай будзе Рэспубліканскі вучэбна-метадычны цэнтр прафсаюзаў, які стаў адной са структурных адзінак «МІТСО», а таксама яго аддзелы ў кожнай з абласцей. Ужо з 1 красавіка на базе гэтых пляцовак пачнецца актыўны працэс па падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі прафсаюзных кадраў, актыву і іншых бакоў сацыяльнага партнёрства.

Падчас невялікай экскурсіі для журналістаў па новым корпусе былі прадэманстраваны яго перавагі. Напэўна, галоўная асаблівасць будынка — яго эрганамічнасць. Якасныя і ўстойлівыя да зносу матэрыялы, мінімалістычны і ў той жа час зусім не «сумны» дызайн, арганізацыя аўдыторый і іх электроннае начынне — першае, што кідаецца ў вочы. Усе дэталі новага корпуса пералічыць немагчыма, але некаторыя асаблівасці згадаць варта. Адно з найцікавейшых канструктарскіх рашэнняў датычыць «аўдыторый-трансформераў». Тры, здавалася б, асобныя пакоі могуць лёгка ператварацца ў два або адзін вялікі шляхам дэмантажу перагародак паміж імі. Такі крок дазволіць найбольш рацыянальна выкарыстоўваць прастору корпуса.

У афіцыйным адкрыцці корпуса ўдзельнічаў Міхаіл ОРДА.

Ёсць тут і іншыя цікавыя кабінеты, напрыклад зала судовых пасяджэнняў, якая дакладна паўтарае свае аналагі ў сапраўдных судах. Тут будуць практыкавацца студэнты юрыдычных спецыяльнасцяў «МІТСО», а кожны прагульшчык зможа апынуцца на лаве абвінавачанага. На першым паверсе замест звыклага стэнда — зона з дысплеямі, на якіх будуць адлюстроўвацца студэнцкія праекты, расклад заняткаў, змены ў ім і многае іншае.

Кульмінацыяй мерапрыемства стала цырымонія афіцыйнага адкрыцця вучэбнага корпуса і Рэспубліканскага вучэбна-метадычнага цэнтра прафсаюзаў, удзел у якой узялі студэнты, адміністрацыя Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» і **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА.** Удзельнікі павіншавалі ўніверсітэт з атрыманнем новай адукацыйнай пляцоўкі і заклалі капсулу з пасланнем пакаленню студэнтаў 2030 года, што ўскрыюць падчас святкавання 100-гадовага юбілею «МІТСО».

Дарэчы, удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы прафсаюзнай ВНУ не спыняецца. У стадыі праектавання знаходзяцца новы студэнцкі інтэрнат і спартыўны комплекс непадалёк ад галоўнага корпуса.



Замест традыцыйнага раскладу і аб'яў — вадкакрысталічныя дысплеі. Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Гісторыя прафсаюзнай адукацыі ў Беларусі налічвае ўжо 85 гадоў. У сакавіку 1930 года ў сталіцы пачала працаваць Вышэйшая школа прафруху. Пасля атрымання краінай незалежнасці і ўтварэння Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ўзнікла патрэба ў адпаведнай адукацыйнай установе, якой стаў створаны ў 1992 годзе на базе згаданай школы Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін. У чэрвені 2011 года ВНУ перайменавана ў Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО».

У Ждановічах вядзецца будаўніцтва спартыўна-аздараўленчага комплексу. Арыенціровачны тэрмін здачы новых аб'ектаў — 2018 год.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

МЕДЫЦЫНСКІ СУДОВЫ ЭКСПЕРТ: ПРАФЕСІЯ ЦІ ПРЫЗВАННЕ?

Аб працы медыцынскіх судовых экспертаў большасць з нас ведае па кнігах і фільмах. Сапраўдная сутнасць гэтай, безумоўна, важнай прафесіі схавана ад цікаўных вачэй. Карэспандэнт газеты «Звязда» наведала ўпраўленне Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці і даведалася пра ўсе тонкасці незвычайнай працы.

Адказнасці не менш, чым у хірурга!

У морг прыязджаю з раніцы. Каля ганка — журботныя родныя памерлых, некаторыя з кветкамі. Вялікі ўказальнік на пахавальнае бюро. У «невясёлым двары» мяне сустракае Васіль Бурак, начальнік упраўлення судова-медыцынскіх экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці.

— Як бы дзіка для кагосьці гэта ні гучала, але я люблю сваю прафесію і ад сваёй працы атрымліваю задавальненне. Адны мяне разумеюць, іншыя — не. Але, як паказвае практыка, мая справа карысная і неабходная, — быццам адразу настройвае мяне на патрэбную хвалю мой суразмоўца.

У прафесіі я гадоў пятнаццаць, і, ведаеце, ніколі не ўзнікалі думкі заняцца чымнебудзь іншым. Яшчэ з першых курсаў медыцынскага ўніверсітэта адчуваў моцны інтарэс да таго, як уладкавана чалавечае цела. Вядома, спачатку было трохі страшна. Але не ад таго, што з трупамі працаваць трэба, а ад таго, што няправільнае заключэнне дасі, — узгадвае Васіль.

Цікава, сёння ў «звычайных» людзей існуе меркаванне, што судмедэксперт не нясе ніякай адказнасці за свае дзеянні: «Ну, напіша што-небудзь не так, пераблытае. Якая розніца? Мёртвым ужо ўсё роўна». На самай справе, праца медыцынскага судовага эксперта — вялікая адказнасць не толькі перад законам, але і перад людзьмі. Яго заключэнне — гэта нейкая рыса, што падводзіцца пад чалавечым жыццём. Важна і тое, якія адказы даў эксперт на пытанні следчых органаў. Ад іх нярэдка залежыць лёс іншых людзей.

А па панядзелках «здымаем пабоі»

Працоўны дзень у Васіля ненармаваны, хоць афіцыйна пачынаецца ў 9.00. Калі трэба, эксперт прыязджае на працу да шасці раніцы і раней за 17.00 ніколі не сыходзіць. Бываюць і начныя дзяжурствы, і сутачныя, калі прыходзіцца выязджаць з міліцыяй на месцы здарэнняў. Дарэчы, сваю працу судмедэксперты ўмоўна дзеляць на тры часткі.

Першая — гэта абследаванне жывых асоб. Так афіцыйна гучыць тое, што ў народзе называюць «зняць пабоі». У гэтым выпадку эксперт дае заключэнне аб тым, калі і якім чынам чалавек мог атрымаць пашкоджанні і якая ступень іх цяжкасці. «Часцей за ўсё наплыў тых, «хто добра адпачыў», назіраецца пасля выхадных, — дзеліцца Васіль Бурак.

Другая частка працы медыцынскіх судовых экспертаў — гэта даследаванне трупаў. Забойства, ДТЗ, самагубства, няшчасныя выпадкі, раптоўная смерць у маладым узросце — у сярэднім 2-3 трупы ў суткі.

— Для мяне і для маіх калег заўсёды моцны шок, калі на стале ляжыць дзіця. Не важна, месяц яму або 15 гадоў. Цяжка бачыць людзей, якія, заблытаўшыся ў той ці іншай сітуацыі, вырашаюць праблему кардынальна — лезуць у пятлю, — кажа Васіль.

Трэцяя частка — непасрэдны кантакт экспертаў з усімі, хто мае дачыненне да судовай медыцыны: дапамога следству, дача тлумачэнняў, выезды на месцы здарэнняў, праца з судамі і медработнікамі.

У кіно ўсё ідэалізуецца

— Васіль, не магу не спытаць, чым праца судмедэксперта адрозніваецца ад працы патолагаанатама? Бо ў разуменні большасці — гэта адно і тое ж, — цікаўлюся я.

— Тут усё проста. Калі патолагаанатамы працуюць у асноўным з целамі людзей, якія памерлі сваёй смерцю, у шпіталях, то медыцынскім судовым экспертам дастаюцца самыя складаныя выпадкі — ахвяры злачынстваў, няшчасных выпадкаў, самазабойцы, бамжы, неапазнаныя целы і гэтак далей, — адказвае спецыяліст.

Па словах Васіля, апазнанне ў некаторых выпадках — справа цяжкая, таму што правядзенне генетычнай экспертызы займае не адзін дзень. Прычыну смерці можна вызначыць амаль заўсёды, і толькі калі цела моцна пашкоджана, тады эксперты сутыкаюцца з цяжкасцямі.

— А ці праўда, як паказваюць у фільмах, што па характары пашкоджанняў цела можна вызначыць прыкладны рост, вагу забойцы, праўша ён ці ляўша?

— У кіно гэта ўсё ідэалізуецца, прыбіраюцца многія моманты. Аналізы, якія ў фільмах робяць за дзве хвіліны і даюць стапрацэнтны вынік, — гэта няпраўда. Па існуючых тэхналогіях некаторыя аналізы робяцца і некалькі тыдняў. Ніякая генетычная экспертыза ніколі не дасць стапрацэнтны вынік, але максімальна набліжаныя да ісціны звесткі атрымаць можна.

Экспертам прыходзіцца абследаваць розных людзей,

і яны ніколі не ведаюць, чым хварэў той ці іншы чалавек, які трапіў да іх. Пранцы, ВІЧ, СНІД, вірусны гепатыт, сухоты — вось далёка не поўны пералік тых захворванняў, што «ўтойваюць» у сабе целы загінулых і памерлых.

— Мы імкнёмся ўсё рабіць акуратна, каб не парваць пальчатку, не запэцкацца крывёю. Калі раптам кропля крыві трапляе, напрыклад, на твар, праца прыпыняецца — эксперт ідзе мыцца і апрацоўваць скуру. Трэба берагчы сябе. І кожны гэта разумее, — падкрэсліў Васіль Бурак.

Суперажываць забараняецца

Пасля размовы Васіль усё ж такі вырашае звадзіць мяне ў морг, каб я лепш зразумела ўсе тонкасці складанай прафесіі. Я атрымліваю белы халат і мы спускаемся ў самы «цэнтр падзей». Морг зусім не такі, як паказваюць у фільмах, — з халодным неонавым святлом, радамі цынкавых сталоў і біркамі на пальцах. Проста калідор, з якога ідуць некалькі дзвярэй. За дзвярыма — пакоі, аздобленыя белай кафляй.

— А як жа ўдаецца экспертам выконваць сваю працу, не паддаючыся эмоцыям? — пытаюся ў спецыяліста.

— Разумець, што яшчэ ўчора гэты чалавек пра нешта марыў, а сёння ляжыць у мяне на стале, цяжка. Але суперажываць, калі праводзіш ускрыццё, забараняецца. Пачуцці могуць захліснуць — і ты якасна не зробіш сваю працу. Калі не можаш стрымаць эмоцый, то трэба сыходзіць з прафесіі, — тлумачыць эксперт.

Ахвотных працаваць у моргу не шмат. Прафесія медыцынскага судовага эксперта не толькі складаная, але і патрабуе сур'ёзнай падрыхтоўкі. Тут трэба ведаць не толькі прадмет па сваёй спецыялізацыі, але і ўсю медыцыну цалкам!

— Васіль, а як адносіцца царква да вашай працы? — цікаўлюся я.

— Наша дзейнасць царквой не забараняецца, таму што накіравана на пошук праўды і ў кожным выпадку прыносіць людзям карысць. Ад нашых дзеянняў будзе залежаць, напрыклад, ці панясе забойца пакаранне.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Нефармат

На парозе забытае хаты...

НЕ скажу, што тэма новая альбо мне не выпадала пісаць пра праблему зносу нічыйных дамоў на вёсцы, але нядаўна давялося паездзіць на Пружаншчыне па многіх населеных пунктах і ўбачыць хаты-сіроты дзясяткамі. І гэта аказалася не проста надзвычай сумным, але цяжкім відовішчам. Дамы без дзвярэй, а дзе-нідзе ўжо і без акон, зарастаюць хмызняком, які аж буяе ад радасці, што ніхто не выкарчоўвае і не прыбірае. Адны з іх развальваюцца, там павыдзіралі кафлю і цэглу з печаў, а іншыя стаяць, быццам бы зусім нядаўна клапатлівая рука гаспадыні павесіла сціплыя вясковыя фіранкі. У пакоях на сценах, пэўна, яшчэ прымацаваны сямейныя фотаздымкі, а на паліцах засталіся рэчы, што памятаюць былых гаспадароў. І гэтыя хаты вельмі хутка пойдуць пад бульдозер. Пляцоўку пад імі потым разраўняюць і засеюць якой-небудзь сельгаскультурай. Гэтыя хаты нічые. Яшчэ зразумела, калі ў доме жыў адзінокі чалавек, потым памёр. Але ў абсалютнай большасці выпадкаў у былых гаспадароў ёсць нашчадкі, што жывуць у гарадах. Яны адракліся ад бацькоўскіх сядзібаў, не захацелі паклапаціцца аб іх продажы ці падтрыманні ў належным стане, па сутнасці здрадзілі ім.

Бо не такая гэта цяжкая справа — навесці мінімальны парадак у родным доме, нават калі ўдаецца прыехаць усяго раз на год. Купляюць жа дамы побач з Белавежскай пушчай мінчане, масквічы. Што, яны часцей сюды прыязджаюць? Цяпер можна нават не афармляць шмат дакументаў, дастаткова напісаць заяву ў сельсавет, што ты бярэш абавязацельства клапаціцца пра домаўладанне, абкошваць яго, высякаць хмызняк.

НА жаль, пакаленне дзяцей вяскоўцаў, хто з такімі нейкімі маверным цяжкасцямі будаваў свае хаты, адвыкла працаваць, баіцца фізічнай працы. Паказальная ў гэтым сэнсе гісторыя адной брэсцкай сям'і. Сям'я ўжо вялікая, жыве ў трохпакаёвай кватэры фактычна тры сям'і: бацькі і жанатыя дзеці. Зяць часова нідзе не працуе, бо знаходзіцца ў пошуку работы, якая б яго задаволіла, няспешна шукае, дзе б працаваць менш, а атрымліваць больш. Дык вось яны нядаўна прадалі дом за паўсотні кіламетраў ад абласнога цэнтра за бясцэнак. Дом вельмі добры, той, хто яго ўзводзіў, быў майстрам на ўсе рукі. Але страшэнна запушчаны, бо яго ніхто не даглядаў, і за хмызняковымі джунглямі з дарогі хату не было відаць. Дык вось дзядуля, сваяк гэтых гора-прадаўцоў, плакаў, гледзячы на сваіх дзяцей. І сапраўды, хіба не маглі б тыя ж маладыя з дужым непрацуючым зяцем навесці парадак, падрамантаваць і жыць? Пры вялікім жаданні і работу знайсці можна было б на месцы альбо ездзіць у горад. Але ў тым і рэч, што жадання не ўзнікла.

Здзіўляе і гісторыя масквіча, які жыве ў машыне з дзецьмі. Ці то праз непасільны крэдыт ці з іншай прычыны чалавек застаўся без кватэры. Днём ён працуе таксістам, а вечарам раскладвае сядзенні — і машына ператвараецца ў спальню для дзяцей. Гісторыю паказалі па тэлебачанні. Кіраўнік аднаго з сельгаспрадпрыемстваў адразу адрэагаваў і запрасіў галаву сям'і да сябе. Таксіст прыехаў у вёску, яму прапанавалі дом з усімі выгодамі. Жыллё гараджаніну спадабалася, і ён пацікавіўся, дзе давядзецца працаваць. «На ферме», — пачуў у адказ. Той адразу развярнуўся: лепш жыць у машыне, але ў Маскве, чым у вясковым доме і працаваць жывёлаводам.

ВОСЬ вам і складнік сучаснага крызісу. На прадпрыемствах ідуць вялікія скарачэнні, застаюцца без работы будаўнікі, работнікі мясакамбінатаў. Але ніхто не кідаецца ехаць у вёску, каб узяць нават бясплатна пустуючы дом, абжыць яго, развесці там падсобную гаспадарку. Не ўсе ж у горадзе маюць прэстыжную работу, добрую зарплату. Ніхто не звяртаецца ў сельсаветы, каб разабраць дом з аддаленай вёскі і перавезці яго ў вёску бліжэй да горада. Цяпер такія магчымасці ёсць — няма попыту. Калі не хопіць усім работы на палях і фермах, можна было б стварацца нейкія невялікія вытворчасці, адкрываць сваю справу. У рэшце рэшт калі не ленавацца і трымаць сем кароў, рэальна наладзіць дабрабыт сваёй сям'і, а не гараваць у горадзе на два-тры мільёны. Але трэба многа і цяжка працаваць. Так гаворацца старыя людзі, з якімі давялося перамовіцца падчас паездкі па неперспектыўных вёсках Пружаншчыны.

Адна бабулька згадвала, як цяжка будаваліся яе суседзі. Жанчына з малымі дзецьмі адмаўляла сабе ва ўсім. У краму хадзіла апошняй, каб людзі не бачылі, што яна на вялікую сям'ю бярэ толькі адзін бохан хлеба. Са скуры вылузваліся гаспадары, каб было не горш, чым у іншых. А маці сямейства заўсёды казала, што яна згодная гараваць, каб толькі дзецям потым жылося лягчэй. Вельмі любіла, даглядала хату, спадзявалася, што ўнукі будуць прыязджаць хоць бы на адпачынак. Усе дзеці і праўда з'ехалі ў горад. Старэйшы сын некаторы час потым жыў з бацькамі, бо яго выгнала жонка за п'янку, а потым памёр і ён. Хату ніхто не аформіў у спадчыну. Яе нядаўна разабралі. Суседка сказала, што не вельмі шчасліва склалася жыццё і ў дачок, і ў малодшага. І ўсё праз гарэлку. Мацярынскае пажаданне жыць лягчэй дзеці няправільна зразумелі. І хаце роднай яны, выходзіць, здрадзілі.

Многія з «герояў» будучага Указа пра дармаедства таксама выхадцы з нічыйных пакінутых хат. Нездарма ж кажуць, што лёс карае таго, хто выракаецца сваіх каранёў, забывае бацькоўскі падмурак. А сведкамі гэтага бяспамяцтва стаяць нечыя хаты, якія неўзабаве разбурыць і зруйнуе тэхніка.

...А загаловак — радок з вельмі шчымлівага верша Ларысы Геніюш пра вечар, што «ціхенька сеў на парозе забытае хаты».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Краіна моцная рэгіёнамі: Наваполацк

ДРУГАЯ МАЛАДОСЦЬ НАФТАГРАДА

З журналістамі «Звязды» гутарыць старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ.

Цэнтральная плошча Наваполацка.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Дзмітрый Уладзіміравіч нарадзіўся ў Полацку. Скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Служыў у праваахоўных органах. Узначальваў Наваполацкае ЖРЭА, потым працаваў першым намеснікам кіраўніка гарадской «вертыкалі». У пачатку гэтага года прызначаны старшынёй Наваполацкага гарвыканкама. Прызнаецца, што аднолькава любіць Полацк і Наваполацк і ганарыцца гэтай святой зямлёй, яе багатым мінулым і ўкладам у гісторыю славянскага свету.

— Эканоміка горада ў мінулым годзе складвалася нядрэнна, і Наваполацк выйшаў на ўстаноўленыя параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця. Такімі вынікамі мы абавязаны прамысловым прадпрыемствам, перш за ўсё рабоце нашага нафтахімічнага комплексу: яго «вага» ў эканоміцы горада па выніках года складае 98,2 працэнта. Мы не можам сказаць, што калектыву «Нафтана» яго лідарства даецца проста, калі ўспомніць сітуацыю на сусветных рынках з цэнамі на нафту. Але і «Нафтан», і горад увогуле маюць пэўны запас моцнасці і пазіцый не здаюць. Невыпадкова па выніках мінулага года вельмі прэстыжнае ў Прыдзвінскім краі званне «Чалавек года Віцебшчыны» атрымалі адразу тры прадстаўнікі праслаўленага калектыву, у тым ліку яго генеральны дырэктар Уладзімір Канстанцінавіч Траццякоў.

Зараз на «Нафтане» рэалізуецца сем буйных інвестыцыйных праектаў з агульным гадавым аб'ёмам каля 2,5 трыльёна рублёў. Нядаўна віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка праводзіў тут штаб і падкрэсліў, што праекты мадэрнізацыі «Нафтана» будуць у прыярытэце. Яны дазволяць у доўгатэрміновай перспектыве перапрацоўваць звыш 12 мільёнаў тон нафты ў год і істотна павялічыць глыбіню яе перапрацоўкі. Горад ускладвае вялікія надзеі на тое, што праекты будуць рэалізаваны паспяхова, бо праграма мадэрнізацыі абяцае захаваць рабочыя месцы, нарошчваць аб'ёмы выпрацоўкі, а значыць, павялічыць даходы ў гарадскі бюджэт.

Развіваем і іншыя кірункі прамысловасці. Ёсць патэнцыял у радыёэлектроніцы. Раней на ўвесь Савецкі Саюз гучаў завод «Вымяральнік», нават прымаў удзел у касмічных праграмах. Цяпер ён больш завязаны на ўнутраны рынак, выпускаюць радыёэлектроннае абсталяванне для машынабудавання. А калі айчынныя прадпрыемствы пачалі адчуваць складанасці са збытам прадукцыі, то гэта негатыўна адбілася і на нашым заводзе. Тым не менш лічым, што ў прадпрыемства ёсць патэнцыял і перад калектывам можна ставіць сур'ёзныя задачы.

Паспяховая работа эканомікі патрэбна яшчэ і для таго, каб стварыць неабходную горада і яго насельніцтву сацыяльную інфраструктуру, задаволіць сацыяльныя і бытавыя патрэбы людзей. Мы бачым свае задачы і ў сферы культуры, і ў сферы аховы здароўя і спорту, у падтрымцы ўстаноў адукацыі. Шмат увагі надаецца добраўпарадкаванню горада і рамонту жыллёвага фонду.

Каб не быць галаслоўным, раскажу пра ахову здароўя. Праведзена рэканструкцыя корпуса бальніцы, будзем дааснашчаць яе, устанаўліваць сучаснае медыцынскае абсталяванне, у тым ліку шматфункцыянальны рэнтгенапарат.

Бюджэтам прадугледжаны і неабходныя сродкі для завяршэння будаўніцтва комплексу яслі – дзіцячы сад — пачатковая школа ў новым мікрараёне. Горад імкліва развіваецца, а інфраструктура крыху адстае. Намеснікам прэм'ер-міністра Наталляй Іванаўнай Качанавай у бытнасць яе старшынёй нашага гарвыканкама было ініцыявана прыняцце рашэння аб будаўніцтве такога комплексу на 517 чалавек. Высокая ступень гатоўнасці па корпусе дзіцячага сада на 280 чалавек, так што навасельне не за гарамі. Другім этапам стане завяршэнне работы па школе. І ў планах на блізкую перспектыву – узвядзенне ў новых мікрараёнах яшчэ аднаго дзіцячага садка прыкладна на 300 чалавек.

— Раскажыце, калі ласка, пра формы ўплыву выканкама на рэальны сектар.

— Прасцей з камунальнымі прадпрыемствамі, бо выканкам з'яўляецца іх фундатарам. Тут уплыў прамы і непасрэдны, пачынаючы ад кантрактаў з кіраўнікамі, пастаянных кантактаў з імі, іх справаздач аб выніках дзейнасці прадпрыемстваў, абароны бізнес-планаў у пачатку года. Калі бачым, што недзе сітуацыя пагаршаецца, сустракаемся і стараемся разабрацца. І калі патрэбна дапамога, яна будзе аказана. У нейкія дробязныя дэталі функцыянавання прадпрыемстваў мы не ўмешваемся, не падмяняем кіраўнікоў. Дырэктар павінен валодаць свабодай манеўру: гэта выхоўвае адказны падыход да выканання ўласных рашэнняў.

Мы ведаем сітуацыю ў працоўных калектывах. Калі складваецца так, што работу таго ці іншага з іх патрэбна прааналізаваць у выканкаме, робім гэта незалежна ад формы ўласнасці. Заслухоўваем на пасяджэннях выканкама, на сесіях Савета альбо ў рабочым парадку — у старшыні ці намесніка, у адрэлах. Калі два нашыя прадпрыемствы — Наваполацкі хлебазавод і той жа «Вымяральнік» — дапусцілі адставанне ў рабоце ў параўнанні з дасягнутымі раней паказчыкамі, праводзілі выязныя пасяджэнні выканкама, заслухалі справаздачы дырэктараў, разам вызначыліся са стратэгіяй.

Сваю місію выконвае гарадскі Савет дырэктараў, яго ўзначальвае генеральны дырэктар «Нафтана» Уладзімір Канстанцінавіч Траццякоў. У дапамогу створаны арганізацыйны камітэт з аўтарытэтных, паважаных прадстаўнікоў дырэктарскага корпусу. Збіраецца Савет раз у квартал, у асноўным практыкуем выязныя пасяджэнні, каб дырэктары маглі пазнаёміцца са станоўчым вопытам таго ці іншага прадпрыемства. І гэта дае свой плён. Як і чыста прафілактычныя выступленні супрацоўнікаў праваахоўных органаў з паведамленнямі антыкарупцыйнай накіраванасці. Хацеў бы падкрэсліць асаблівую ролю Савета ў вырашэнні сацыяльных праблем горада. У кіраўнікоў калектываў ёсць пэўныя фінансавыя магчымасці, і, калі выносім на іх разгляд пытанні развіцця горада, заўсёды знаходзім падтрымку.

— Ці даводзілася гарадскім уладам ратаваць тое ці іншае прадпрыемства, Дзмітрый Уладзіміравіч?

— У 2014 годзе прадпрыемствы працавалі больш-менш стабільна. Хаця рэгулярна адчуваліся складанасці, узнікалі і «няштатныя» сітуацыі, якія вырашалі ў тым ліку з нашым удзелам. Даводзілася збіраць прадстаўнікоў некаторых калектываў, каб яны змаглі дамовіцца па ўзаемных разліках. Сур'ёзных праблем з выплатай зарплаты ці запазычанасцю за энерганосьбіты не было. У гэтым годзе пытанні ўзнікаюць. У студзені зніжэння аб'ёмаў выпрацоўкі не адбылося, і ўвогуле месяц прайшоў нармальна. Зарплату нашым прадпрыемствам удалося захаваць на ўзроўні 2014 года. Тым не менш студзень мы жылі напружана, адчуваўся недахоп фінансавых рэсурсаў, у тым ліку крэдытных. Стаўкі па крэдытах пад 50 працэнтаў і вышэй, я лічу, не стымулююць развіццё прамысловасці. Нават каб перахапіць сродкі на тыдзень, для аператыўнага вырашэння нейкіх балючых пытанняў, і то ўзнікалі праблемы з нашымі фінансавымі ўстановамі. Цяпер найбольш буйныя з іх атрымалі статус філіялаў з цэнтральным апаратам у Мінску — ад іх тут нічога не залежыць. Пытанні пераадрасоўваліся ў Мінск, а там даходзіла да таго, што і пагаварыць няма з кім: ніхто не адказвае на тэлефонныя званкі. А рэальныя грошы яны зарабляюць тут, у нашым горадзе. Трымаем у іх немалыя сродкі гарадскога бюджэту, прадпрыемствы і грамадзяне таксама размяшчаюць у іх грошы на дэпазітах. І такія штучна ствараемыя перашкоды не на карысць эканоміцы.

— Жыццё пераконвае, што ў вашай падтрымцы мае патрэбу і прыватны сектар эканомікі.

— Вось яскравы прыклад таго, што клопат гэты не на апошнім месцы. У 2014 годзе Наваполацк падчас рэспубліканскага конкурсу прызнаны лаўрэатам у намінацыі «Найлепшы горад для бізнесу Беларусі — 2014» у катэгорыі з насельніцтвам звыш 50 тысяч. Мы вельмі зацікаўлены ў развіцці прадпрыемстваў прыватнага сектара эканомікі. Яшчэ і таму, што ўвесь падатак на іх прыбытак паступае ў гарадскі бюджэт. У Наваполацку сёння больш за 700 прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу.

Летась у жніўні да нас прыязджала дэлегацыя з горада-пабраціма Электрасталь, былі і прадстаўнікі бізнесу. Нешта зачапіла іх: яны ўзялі ў арэнду памяшканне ў нашым Доме быту, зрабілі там прыстойны рамонт, заказалі цікавы праект. І вось учора адбылося адкрыццё новай дзіцячай кавярні «Мульцяшка». Справы ў новым прадпрыемстве грамадскага харчавання павінны пайсці добра. А інвестары з горада-пабраціма маюць яшчэ ідэі.

— Вы па-ранейшаму пазіцыянуеце свой горад як маладзёжны?

— Сярэдні ўзрост жыхароў — 38 гадоў. Як кажуць, узрост другой маладосці. З улікам гэтага развіваем сацыяльны сектар, плануем узводзіць новыя аздараўленчыя і спартыўныя збудаванні. У нас ёсць парк культуры і адпачынку, размешчаны ў пойме Дзвіны, ён мае патрэбу ў карэннай рэканструкцыі, у стварэнні інфраструктуры для адпачынку. І мая мара — з цягам часу належным чынам добраўпарадкаваць набярэжную Дзвіны. Ідэі на гэты конт маюцца даўно, і даволі цікавыя. Магчыма, прыйшоў час вярнуцца да іх з улікам новых рэалій.

У нас ёсць планы, падтрыманыя кіраўніком дзяржавы, па ўзвядзенні Лядовага палаца. Мы разглядаем магчымыя варыянты, падбіраем аптымальнае праектнае рашэнне. Хацелася б, каб гэта быў шматфункцыянальны комплекс — не толькі спартыўны (лядовая пляцоўка) і аздараўленчы, але і культурны. І каб там быў аквапарк. Шукаем патэнцыяльнага інвестара, які зацікавіўся б развіццём свайго бізнесу ў гэтым комплексе.

У нас разнастайнае і цікавае грамадскае жыццё. Цяпер праходзяць мерапрыемствы, звязаныя з 70-годдзем вызвалення Беларусі. Запланавана іх больш за тысячу, так што праграма святкавання насычаная. Пры падтрымцы нашага дэпутата ў Нацыянальным сходзе Вадзіма Анатольевіча Дзевятоўскага цікавая акцыя адбылася ў Мінску. Вучні школ абодвух нашых гарадоў-суседзяў чыталі творы знакамітых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, прысвечаныя мінулай вайне, у новым будынку музея Вялікай Айчыннай вайны. Мы прысутнічалі там разам з Наталляй Іванаўнай Качанавай, і я быў у захапленні. Дарасламу чалавеку складана было стрымаць слёзы, настолькі ўсё атрымалася пранікнёна і шчыра. Дзіцячымі звонкімі галасамі гучала праўда аб той вайне. Праўда, якую наш народ ведае і свята захоўвае.

МОВАЙ ЛІЧБАЎ

За мінулы год прамысловым комплексам Наваполацка выраблена прадукцыі на 56,2 трлн рублёў, што па індэксе фізічнага аб'ёму да 2013 года складае 110,9%. 70% пастаўлена на экспарт у 44 краіны свету.

За 12 месяцаў 2014 года асвоена 4,2 трлн рублёў інвестыцый, альбо 113,5% да 2013 года. Уведзена ў эксплуатацыю 26 358 кв. метраў агульнай жылой плошчы.

Сярэднямесячная заработная плата па горадзе за мінулы год склала 7615,8 тысячы рублёў, за снежань — 8232,1 тысячы рублёў.

Прыгожы комплекс яслі — дзіцячы сад — пачатковая школа ў адным з новых мікрараёнаў Нафтаграда.

ПАД АБАРОНАЙ МЕРКУРЫЯ

Пачнем з таго, што ААТ «Базіс — Наваполацк» — адно з нешматлікіх у Беларусі настолькі шматфункцыянальных гандлёвых прадпрыемстваў. Займаецца і рознічным, і аптовым гандлем, а ў 2009 годзе да яго далучылі «Плодаагароднінагандаль» з буйной базай, рэстаранам, магазінам і рынкам.

— Складанасць была ў тым, што ўсе далучаныя калектывы з'яўляліся стратнымі і іх спатрэбілася «выцягваць». Тая ж плодаагароднінная база і сёння прыносіць пакуль страты, якія даводзіцца пакрываць за кошт іншых падраздзяленняў, — расказвае **дырэктар ААТ «Базіс — Наваполацк» Надзея КНЫРКО.** — Справіліся, паднялі ўсіх на ногі, навялі парадак. А тут 29 студзеня 2013 года даручаюць яшчэ адно даволі складанае прадпрыемства — сетку грамадскага харчавання «Верасы» (яны кармілі ў асноўным дзяцей у школах). Там самае «маладое» абсталяванне было 1983 года выпуску. Праблемныя кадры, зарплата невялікая, і трэба было адразу падняць яе да нашага ўзроўню.

Цяпер мы можам сказаць, што дзяцей кормім смачна. Ацаніце такі факт: загадчыца вытворчасці сталовай гімназіі № 1 Іна Крыўко заняла першае месца сярод повараў на рэспубліканскім конкурсе кулінарнага мастацтва і сэрвісу. Калі пра гэта даведаўся наш міністр, ён быў прыемна здзіўлены: не рэстарана, не кавярні... І школы цяпер праводзяць у сябе дэгустацыі, якія ператвараюцца ў сапраўдныя святы смаку «У гасцях у казкі». Удзельнічаюць і настаўнікі, і вучні, з песнямі, — цэлыя тэатралізаваныя паказы. І ўсім падабаецца.

Пазітыўныя змены сталі магчымымі яшчэ і таму, што цалкам пераабсталявалі кандытарскі цэх, павялічылі аб'ёмы выпуску прадукцыі, адначасова робім яе і для школ, і ў магазіны. У выніку гандлюем у асноўным тортамі ўласнай вытворчасці, а таксама прапануем пакупнікам асобныя віды прадукцыі аб'яднання «Мінскхлебпрам». Кормім свежымі булачнымі вырабамі вельмі высокай якасці. У нас маецца свая тэхналагічная лабараторыя, якая за гэтым уважліва сочыць. Усё робіцца на натуральнай сыравіне. Людзі ведаюць пра гэта, і наша прадукцыя карыстаецца ўстойлівым попытам. Нават госці з далёкага замежжа ў захапленні ад нашага «Кіеўскага торта». А калі чытаюць, з чаго згатаваны, у іх проста шок, што недзе яшчэ засталася такая натуральнасць.

Калі расказваць далей пра нашы «стратэгічныя» навіны, то адрадзілі кулінарны цэх, памянялі там усё абсталяванне. А сёлета ўзяліся за цэх гародніны. Як вы ведаеце, у нас свая база і пастаянна захоўваецца гародніна. Чаму б яе не перапрацоўваць? Тым больш што гандлёвая сетка ў горадзе пашыраецца, з'яўляюцца арганізацыі-канкурэнты, і трэба думаць, як утрымаць свайго пакупніка, шукаць нешта новае. Пачалі саліць агуркі і квасіць капусту. Ведаеце, пайшло вельмі добра. Прадукцыя атрымалася смачная і надта запатрабаваная.

Наша наватарская думка, будзем так казаць, не спіць. Вырашылі: плошчы дазваляюць, можам заняцца разборам птушкі. Цяпер адпрацоўваем тэхналагічныя пытанні.

Клапоцімся даводзіцца пра ўсе сегменты нашай разгалінаванай гаспадаркі. У нас дастаткова вялікая сетка кавярняў. Але ў ранейшага нашага мэра, цяпер віцэ-прэм'ера Наталлі Іванаўны Качанавай, была мара адкрыць дзіцячую кавярню. І летась пасля рэканструкцыі і перапрафілявання кафетэрыя мы адкрылі дзіцячую кавярню «Верасок». Цяпер можам гаварыць, што гэта дабротная кавярня, як і «Лілея» — былая дыетычная сталовая. Можна ўспомніць, што па выніках 2013 года наша «Лілея» заняла першае месца ў рэспубліканскім конкурсе «Лепшы рэстаран, кавярня года» ў намінацыі «Адкрыццё года».

І даволі ўдалыя кавярні «Усмешка» і «Усмешка плюс». Адна разлічана на хуткае харчаванне, а ў другую прыходзіш і разумееш, што гэта добрае месца для няспешнага адпачынку. Там скураныя канапы, унутры прыгожа, можна пасядзець, прыемна пагутарыць.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Надзея Мікалаеўна родам з Добруша. Скончыла Гомельскі кааператыўны інстытут. Па размеркаванні трапіла на Віцебшчыну. Працавала тавараведам на аптова-гандлёвай базе ў Глыбокім. Калі пераехала да мужа ў Наваполацк, працяглы час адпрацавала ў Доме гандлю. З 2002 года ў ААТ «Базіс — Наваполацк»: начальнік аддзела, намеснік дырэктара, а з 2009 года —дырэктар. Калектыў мае дзве вышэйшыя ўзнагароды Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь — «Бронзавыя Меркурыі»; трэці — персанальны — у дырэктара.

На здымку Надзея Мікалаеўна дэманструе падарункавы сертыфікат на мільён рублёў.



Вырабы з айчынных ільняных тканін у магазіне «Ялінка» прапануе прадавец Святлана БЫКАВА.

Вялікім галаўным болем быў рынак — звычайны разнамасны палатачны гарадок. У 2012 годзе з немалымі складанасцямі пабудавалі новы прыгожы рынак з ралетнымі кіёскамі. Цяпер у стадыі рэканструкцыі мініторынак «Дзвіна» ў цэнтральнай частцы горада. Яго адкрыццё плануецца сёлета ў красавіку.

Ну і, безумоўна, па-ранейшаму вялікая ўвага надаецца крамам. У складзе нашай гандлёвай сеткі 12 харчовых магазінаў універсальнага асартыменту і 5 спецыялізаваных па продажы нехарчовых тавараў. Наш гонар — крама «Паўлінка» на цэнтральнай плошчы. Ёсць цудоўная крама №26. Абедзве рэканструявалі, павялічылі гандлёвыя плошчы за кошт арыгінальнага планіровачнага рашэння. Пасля рэканструкцыі ў складзе гандлёвага цэнтра «Бярозка» адкрылі прасторны абутковы магазін. Пакупнікам падабаюцца «Дзіцячы свет», «Мэбля», «Арбіта», «Ялінка». Так што гандлёвая сетка дастаткова вялікая. Працуе 1570 чалавек, усіх трэба заняць з карысцю для справы.

— За тыя тры гады, якія мы не бачыліся, што яшчэ з'явілася новага ў гандлёвай сетцы? Калі ў горадзе ідзеш па вуліцы, то ўзнікае такое ўражанне: куды не павернешся — усюды гандлёвыя аб'екты з лагатыпам «Базіса».

— Новых гандлёвых пунктаў пакуль не адкрывалі, але вось зараз на вуліцы Маладзёжнай, у дзявятым мікрараёне, узводзім па інвестыцыйным праекце вялікі магазін. Адзін паверх падземны, два з паловай — зверху. На яго плошчах размесціцца харчовая крама з універсальным асартыментам тавараў, кавярня, кандытарскі і кулінарны ўчасткі. Гандлёвыя плошчы аднаго паверха плануем здаваць у арэнду. І зараз шукаем партнёраў — буйных «якарных» арандатараў. Я ўвесь час хацела мець такі гандлёвы пункт у спальным раёне, дзе жывуць работнікі нашых прамысловых прадпрыемстваў. Разлічваем, што ў сярэдзіне гэтага года мы яго адкрыем.

Больш пакуль новага нічога не будуем, затое займаемся рэканструкцыяй. У гэтым сэнсе ў нас ёсць над чым працаваць. Патрабуе рэканструкцыі гандлёвы цэнтр «Дзвіна», ён нам дастаўся ад агароднінагандлю. Патрэбна пашыраць гандлёвыя плошчы і ў прамтаварным магазіне «Івушка», і ў краме «Мэбля». Ёсць куды пашырацца, ёсць куды рухацца, патрэбен час.

Працуем ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Нягледзячы на зніжэнне долі ААТ «Базіс — Наваполацк» у рознічным таваразвароце горада з 28 да 25,4 працэнта, чысты прыбытак арганізацыі ўзрос у 5 разоў. Усе зароблены сродкі накіроўваем на развіццё сеткі, укараненне сучасных формаў гандлю, стварэнне камфортных умоў для пакупніка.

Мы настроены аптымістычна. Гараджане ведаюць нашы магазіны, ведаюць, што цэны ў нас прымальныя, і мы гандлюем у асноўным прадукцыяй айчынных вытворцаў. Нашу стратэгію вызначае лозунг «Купляйце беларускае». Значыць, і цана больш даступная. Нават скажу інакш: пакупніка больш задавальняюць суадносіны цаны і якасці. Узровень заработнай платы ў горадзе дастаткова высокі, тым не менш гараджанін — чалавек ашчадны.

— Раскажыце крышачку пра вашы акцыі, Надзея Мікалаеўна.

— Што датычыць маркетынгавых крокаў, без якіх нельга, — праводзім цікавыя акцыі. У нас не хапае гандлёвых плошчаў, але той тавар, які пакупнік павінен убачыць, ён убачыць — мы выстаўляем яго «на людзі», на пярэдні план. Сумесна з пастаўшчыкамі праводзім каля ста акцый штомесяц. У іх удзельнічаюць са сваёй прадукцыяй ААТ «Савушкін прадукт», ЧП УП «Дарыда», ЗАТ «Мінскі завод безалкагольных напіткаў», КУП Віцебскі кандытарскі камбінат «Віцьба» і яго полацкі філіял, «Наваполацкі хлебазавод», ААТ «Піўзавод «Аліварыя», ААТ «Полацкі малочны камбінат», ААТ «Крыніца» і гэтак далей. Падчас такіх акцый і мы, і вытворцы даём зніжку на тавары, і ў выйгрышы пакупнік.

У нас пастаянная пяціпрацэнтная зніжка на прадукцыю аб'яднання ААТ «КІМ», падтрымліваем сувязь з ААТ «Элема», ААТ «Світанак» з Жодзіна, са шклозаводамі, ААТ «8 сакавіка»... Шукаем паразуменне з дзяржаўнымі контныя карткі «Любімы пакупнік», якія даюць права на 3-працэнтную зніжку пры куплі на любую суму і ў прамысловых, і ў харчовых магазінах «Базіса», і ў нашым грамадскім харчаванні, у тым ліку ва ўсіх нашых кулінарыях. А для тых, хто асабліва часта карыстаецца нашымі крамамі, ёсць дысконтная картка «Самы любімы пакупнік».

Асобна зніжкі прадугледжаны для пенсіянераў. У нас для іх дзейнічае некалькі мэтавых праграм. У чатырох магазінах з раніцы на пэўны пералік тавараў зніжка 2 працэнты. А ў краме «Селена», самай папулярнай сярод пенсіянераў, пры прад'яўленні пенсійнага пасведчання яны атрымліваюць практычна на ўсе тавары зніжку ад 4 да 11 працэнтаў. Там тое, што патрэбна заўсёды — мука, малочныя і макаронныя вырабы, крупы, каўбасы, садавіна і гародніна... За выключэннем спіртнога. І нягледзячы на тое, што магазін знаходзіцца ў вельмі нявыгадным месцы (побач канкурэнты), ён запатрабаваны ў навапалачан.

— Але ж вы і для сваіх работнікаў робіце многае.

— Увялі сертыфікаты для сваіх работнікаў на святы, па якіх даецца зніжка да 25 працэнтаў. Адштурхнуліся ад гэтага першага вопыту і пачалі рабіць падарункавыя сертыфікаты і на продаж — розным наміналам: па 100, 200 і па 500 тысяч. Ёсць і па мільёне. Згадзіцеся, цудоўны падарунак, нетрадыцыйны, з выдумкай. Бо цяпер такі час, калі не ведаеш, што дарыць. А так падарыў блізкаму чалавеку сертыфікат, і няхай ён сам ідзе да нас у магазін, у які хоча — прамтаварны ці іншы, і сам выбірае, што яму па гусце.

— Ці шырока ўкараненыя разлікі пластыкавымі карткамі?

— Тэрміналамі для такіх разлікаў аснашчаны ўсе нашы гандлёвыя прадпрыемствы. У тым ліку грамадскага харчавання, кулінарныя аддзелы і магазіны. Па нашай сетцы разлік пластыкам ажыццяўляецца амаль па 30 працэнтах гандлёвых аперацый. У параўнанні з іншымі гандлёвымі сеткамі гэта нядрэнна. Тым больш што некаторыя нашы харчовыя магазіны выходзяць на ўзровень 37 працэнтаў, а асобныя прамтаварныя — і на 50. А вось у грамадскім харчаванні больш прывыклі разлічвацца грашыма. Таму стараемся стымуляваць разлікі пластыкам, праводзім з гэтай мэтай разнастайныя конкурсы, пераможцаў заахвочваем.

Асабіста мне здаецца, — падкрэсліла ў завяршэнне Надзея Мікалаеўна, — што пра кожны наш магазін і нашу ўстанову можна расказваць доўга, яны таго заслугоўваюць. І школьныя сталовыя — таксама. І думаю, што ўсё ў нас атрымаецца з такім калектывам. Бо калектыў вельмі добры, гэта сплаў маладосці і вопыту. Мне больш за ўсё падабаецца пачуццё патрыятызму, для яго характэрнае, — да свайго горада і да свайго прадпрыемства.

Клапоцімся пра пераемнасць вопыту і традыцый. У нас з'явілася сваё таварыства ветэранаў працы, яны вядуць дастаткова актыўны лад жыцця. Калі ў горадзе нейкія святочныя мерапрыемствы, запрашаем на іх сваіх ветэранаў, даём запрашальныя білеты, арганізуем для іх экскурсіі. Бо гэта яны стваралі наша прадпрыемства — моцны і схільны да наватарства «Базіс — Наваполацк».

Функцыянальнасць і прастора характэрны для гандлёвай залы папулярнага ўніверсама № 26.

У дзіцячай кавярні «Верасок».

УНП 300043764

Сямейная газета

Выпуск № 5 (28)

■ Пусціць карані

БОЛЬШ, ЧЫМ ПРОСТА ПРЫТУЛАК

Знайшлі ў беларускай глыбінцы бежанцы з Украіны

«Паўгода назад мы сыходзілі на працу ў пяць раніцы і прыходзілі ў прыцемках перад сном, бо хаты бамбілі з раніцы і надвячоркам. І мы не ведалі, ці прачнёмся на наступны дзень. Цяпер уладкоўваемся на новым месцы, чакаем пасведчанне на права жыхарства, а таксама ўнучку-беларуску», — распавядае ўкраінская сям'я з-пад Данецка, якая, страціўшы дом на Радзіме, будуе новае жыццё ў Беларусі.

Сям'я Лондараў разам з будучай беларускай нявесткай.

Святлана і Аляксандр Лондары, іх сын Антон і дачка Кацярына — гэтых людзей ведае, мабыць, кожны ў Карэліцкім раёне. Яны апынуліся ў Мінску пасля трох сутак язды на цягніку і аўтобусе, аддаўшы за праезд апошнія грошы. Рэшткаў зберажэнняў хапіла, каб даехаць да мястэчка Турэц з таксістам Канстанцінам, што адгэтуль родам. У іх былі пры сабе толькі ўласныя рэчы і поўная невядомасць, а праз некалькі гадзін — хата, праца і першыя грошы, сабраныя неабыякавымі людзьмі.

ТРОЕ СУТАК ДА НОВАГА ЖЫЦЦЯ

Насамрэч, у сям'і Лондараў, якая жыла ў сяле Наватроіцкае, трое дзяцей. Але старэйшы сын Дзмітрый застаўся ва Украіне змагацца на баку апалчэнцаў Данецкай Народнай Рэспублікі (ДНР). Бацькам і малодшым дзецям нічога не заставалася, як бегчы з краіны, тым больш што ўлады ўжо настойліва цікавіліся іх лёсам і заняткамі старэйшага, а ад хаты, у якую трапіў снарад, нічога не засталося.

— Першапачаткова мы не думалі з'язджаць, — успамінае Святлана. — Мы былі ў пансіянаце ў Данецку разам з сем'ямі іншых апалчэнцаў, куды выехалі часова на 20 дзён, калі даведаліся, што нашай хаты больш няма. Атрымалася, што з часовага прытулку вяртацца было ўжо няма куды і няма як, бо нас ужо шукалі, каб даведацца пра Дзіму. Цяжка было ў гэта паверыць, мы нават не бачылі руін хаты, бо калі б і выпала вярнуцца, знайшліся б добраахвотнікі, якія выдалі нас.

— Я глядзела ў акно і не верыла, што гэта адбываецца на самай справе, — дадае Каця. — Калі лячылася ў бальніцы, баялася, што нас узарвуць, бо побач ляжалі параненыя салдаты. А ў пансіянаце ад абстрэлу трэсліся шыбы.

Лондары вагаліся ў выбары накірунку ад'езду паміж Расіяй і Беларуссю. Перамагла апошняя, бо ў Гомелі жыла Каціна сяброўка, якая са сваім хлопцам з'ехала раней. Аднак доўга не маглі набыць білеты, а праз нейкі час высветлілася, што і з жыллём там будуць праблемы. Здымаць жа кватэру не было грошай. Суседка па пансіянаце параіла ехаць у Любчу (туды накіравалася ўжо шмат яе родных), дзе знойдзецца і жыллё, і праца, аднак і туды даехаць сям'я не змагла.

Дачка Каця цяпер ужо жыве асобна.

— Мы дабіраліся да Беларусі трое сутак. Было вельмі страшна, асабліва ў Кіеве, дзе мы прасядзелі на вакзале 8 гадзін да аўтобуса, амаль не ўзнімаючы вачэй і не гаворачы, каб ніхто не пачуў нашу гаворку, блізкую да расійскай, і не зразумеў, адкуль мы, — распавядае Святлана. — На ўкраінскай мяжы ўсе нашы рэчы доўга праглядалі і вывучалі, а калі б паехалі на цягніку, напэўна, было б яшчэ горш.

У Мінску здарылася новая непрыемнасць — грыўні мы памянялі па курсе ў чатыры разы меншым, чым дзейнічаў на той час насамрэч, і гэтых грошай ужо не хапіла б ні на адну паездку. Дзякуй таксісту, які амаль «за так» давёз нас да Турца, перад гэтым яшчэ дамовіўшыся з мясцовымі ўладамі, што нас прымуць.

Сям'ю адразу прывялі ў свабодную хату і прапанавалі абжывацца. Вяскоўцы сабралі для іх рэчы і грошы, прынеслі прадукты. Праз колькі дзён у Лондараў з'явілася мэбля, халадзільнік і нейкая ўпэўненасць у будучыні.

ВОЧЫ НЕ БАЯЦЦА — І РУКІ РОБЯЦЬ

На новым месцы Лондары адразу паказалі, якія яны руплівыя гаспадары: прыехалі ў жніўні, а да зімы ўжо выправілі трубу ў печы, пачысцілі ўсю хату і збудавалі новую прыбіральню. Наконт апошняй гаспадар жартуе, што гэта часовы будынак — потым зробіць «як дома».

— У мяне ў сяле прыбіральня была памерам два на тры метры, і ўсё там было зроблена як мае быць, — кажа Аляксандр. — І палічкі пад розныя рэчы, і нават дыван набыў, каб абабіць, але не паспеў — вайна...

Гаспадыня ўвосень пасадзіла перад хатай клубніцы, салату і два кусты ружаў, а з прынесенай суседзямі гародніны нават крыху закатак закрыла на зіму. Сваімі рукамі таксама змайстравала некалькі тых маленькіх і ўтульных рэчаў, якія робяць будынак сапраўдным жыллём — «чырвоны кут» з вуглавой канапкі, мяккія прыгожыя цацкі...

— Толькі агарод мы не паспелі перапахаць на восень, а ён ужо і так увесь зеллем зарос, — турбуецца Святлана. — Па вясне ў першую чаргу трэба яго да парадку даводзіць. А пакуль на суседскіх градах можна колькі радкоў пасадзіць — усё роўна імі ніхто не карыстаецца, бо гаспадара не стала ўзімку.

Працаваць усё сямейства ўмее. Спачатку Святлана Іванаўна была звычайным падсобнікам на сельскагаспадарчых работах — куды накіруюць, там і працавала. Але нядаўна атрымала пастаяннае месца на ферме, куды яе на некалькі дзён накіравалі мыць бідоны. Убачыўшы яе работу, кіраўніцтва фермы адразу аформіла жанчыну прыбіральшчыцай, каб пакінуць у сябе на ўвесь час. Яно і не дзіва: дома Святлана працавала санітаркай у бальніцы і на ферме адразу навяла сапраўдны бляск і чысціню.

(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)

І ВАМ НЕ ХВАРЭЦЬ!

«Прабач, — гучыць у тэлефоне засмучаны голас сястры, — але на гэтым тыдні сустрэцца ўжо не атрымаецца — мы зноў на бальнічным». «Мы» — гэта амаль 5-гадовы пляменнік Дзімка, які, зрэшты як усе дзеці, «чапляе» ці то ў садку, ці то ў іншых грамадскіх месцах нейкую заразу. Дзеці перыядычна хварэюць — і гэта нармальна. Не нармальна толькі, па маім глыбокім перакананні, тое, што некаторыя бацькі з прычыны ўсякай дзіцячай балячкі... вымушаны апраўдвацца перад навакольнымі.

Стаўленне да хваробы — рэч нагогул вельмі суб'ектыўная. «37,5?! — палохаецца бабуля. — Сядзіце дома, піце чай з мёдам і тэрмінова выклікайце ўрача!» — «Дзіця кашляе? — недаверліва перапытваюць на працы асобныя калегі ці начальства. — І што, абавязкова адразу ісці на бальнічны, нельга малое на дзень-другі пакінуць з бабуляй? Вы ж толькі ў мінулым месяцы хварэлі!» І ў вачах выразна чытаецца падтэкст — вялікімі чырвонымі літарамі: «Мы вось у свой час так часта бальнічны не бралі, бо мелі сумленне і трымаліся за працу, а ты, відаць, у ёй проста не зацікаўлены». У садку ж адваротная карціна: большасць бацькоў абураецца, і небеспадстаўна, паводзінамі тых несвядомых, хто ўпарта прыводзіць у групу дзіця «па калена ў саплях», маўляў, праз гэта і астатнія ўвесь час хварэюць...

Зрабіць так, каб былі задаволены ўсе названыя катэгорыі, абсалютна немагчыма. Ды, напэўна, і не трэба. Але пачуццё віны ў многіх бацькоў гэтыя заўвагі, развагі, касыя позіркі абуджаюць і культывуюць — будзь здароў! Таму і адбываецца дзіўнае: многія дарослыя, разумныя, здавалася б, самастойныя і самадастатковыя людзі пачынаюць кідацца ў крайнасці. Адны, скупіўшы пачкамі лекі, нават з самай банальнай прастудай ці не месяц трымаюць дзіця дома, каб перастрахавацца. Ды толькі часцяком наступная непазбежная сустрэча з вірусам дзіцячага арганізма, вытрыманага ў цяплічных умовах, зноў заканчваецца хваробай... Іншыя ў памкненні да перфекцыянізму, наадварот, выбіваючыся з сіл пачынаюць здзяйсняць працоўныя подзвігі, каб не падвесці калег, здаць у час запланаваны праект, не згубіць перспектыўных заказчыкаў, зарабіць на водпуск (ці мала тут можна прывесці тлумачэнняў і апраўданняў?)... Хоць пры гэтым у глыбіні душы ўсе мы цудоўна разумеем, што ніводны паспяхова выкананы праект, хай сабе і падмацаваны грашовай прэміяй, праз колькі гадоў не сядзе з табой піць чай ля тэлевізара, не абдыме і не скажа на вуха: «Мамачка, я так цябе люблю!»

Залатая сярэдзіна паміж крайнасцямі, безумоўна, недзе ёсць, і можна клапаціцца пра здароўе дзіцяці, не робячыся пры гэтым «ворагам народа» ў вачах працадаўцы. Але знайсці гэтую сярэдзіну не так проста, як падаецца. Чамусьці (у каторы раз заўважаю) збоку заўжды лепш бачна, як мусіць зрабіць іншы чалавек, і на бацькоў сыплюцца бясконцыя парады на гэты конт. Да іх можна прыслухоўвацца або ігнараваць, але перадусім, і гэта самае важнае, вы павінны прыняць сваё асабістае рашэнне — для каго старацца? Прыняць — і потым не шкадаваць аб ім.

Адкашляўшыся, шчыра жадаю ўсім, хто таксама хварэе гэтай вясной, хутчэй ачуняць і папраўіцца. А лепш наогул не хварэйце, хіба толькі за любімых спартсменаў...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ У вас будзе дзіця

«ЗВЯЗДА» + АНТ

«Каб усе былі дома» — пад такім дэвізам чацвёрты год на тэлеканале АНТ выходзіць рубрыка «У вас будзе дзіця» (у рамках праграмы «Пакуль усе дома», а з нядаўняга часу — і ў пятнічных выпусках праграмы «Наша раніца»). Стваральнікі беларуска-расійскага праекта дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі, любові і клопату, адшукаць новыя сем'і. За гэты час 57 дзяцей ужо змянілі сцены дзіцячых дамоў на цяпло і ўтульнасць сямейнага ачага.

Казка для Дашы

«Звязда», што летась таксама далучылася да праекта, працягвае знаёміць чытачоў з маленькімі героямі рубрыкі, якія, магчыма, для кагосьці стануць самымі блізкімі і роднымі людзьмі...

4-гадовая Даша жыве ў Мінскім дзіцячым доме №7. Выхавальнікі характарызуюць яе як вельмі самастойную, жвавую і разам з тым ласкавую дзяўчынку. Даша любіць гуляць у сюжэтна-ролевыя гульні і дапамагаць дарослым.

«Яна сама сябе абслугоўвае, апранаецца і есць, спрабуе засцілаць ложак, прыбірае ў пакоі, — пералічвае педагог Соф'я Астроўская. — А яшчэ, калі іншых дзяцей часта трэба чымсьці займаць, то Даша знаходзіць сабе занятак самастойна — можа доўга і засяроджана збіраць пазлы або маляваць, займацца гульнямі на развіццё логікі і мыслення, разглядаць карцінкі ў кніжках, слухаць казкі». Але, безумоўна, самай галоўнай, любімай і цікавай казкай з добрым

канцом для яе была б магчымасць знайсці новы дом і клапатлівых бацькоў...

Калі вы хочаце даведацца пра Дашу больш, патэлефануйце па нумары: (017) 284-71-51. Гэта тэлефон Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.

ОЙ, МАМАЧКІ!

У раддом — без страху і нерваў

Роды могуць пачынацца двума спосабамі: з рэгулярных схватак і з адыходу водаў. Правільным лічыцца першы «сцэнарый». У гэтым выпадку схваткі набываюць пэўную перыядычнасць, становяцца больш працяглымі і хваравітымі, а інтэрвал паміж імі змяншаецца. Калі схваткі рэгулярныя і цягнуцца па 20-30 секунд з інтэрвалам 7-10 хвілін, то можна накіроўвацца ў раддом. Калі прамежкі паміж імі вялікія і пры гэтым у будучай матулі няма скаргаў, надта спяшацца не варта. Значна прасцей перачакаць пачатак схватак дома, у звыклай абстаноўцы, і толькі пры змяншэнні інтэрвалаў або адыходзе водаў накіроўвацца ў раддом.

Часцей за ўсё воды адыходзяць у пачатку або ў сярэдзіне родавай дзейнасці, на фоне схватак, — тлумачыць **загадчыца кансультатыўна-дыягнастычнага аддзялення (гарадскі цэнтр планавання сям'і) Мінскага гарадскога клінічнага радзільнага дома №2 Жанна РАМАНЧУК.** — Прапусціць гэты момант немагчыма. Каляплодныя воды — гэта пэўная колькасць бясколернай вадкасці з салодкім пахам. Калі яны адышлі, а схватак няма, ехаць у раддом неабходна тэрмінова: працяглае знаходжанне ў бязводнай прасторы можа пагражаць інфіцыраваннем плода і ўнутранай абалонкі маткі. Тэрмінова трэба ехаць у радзільную ўстанову і калі ў водах ёсць кроў або яны зялёнага колеру.

Воды могуць адыходзіць не поўнасцю за раз, а паступова падцякаць. Калі жанчына не можа звычайныя выдзяленні адрозніць ад падцякання, неабходна звярнуцца па дапамогу ў жаночую кансультацыю ці прыёмны пакой радзільнага дома.

Ехаць у раддом трэба на машыне хуткай дапамогі, а не на асабістым транспарце. Усё ж такі хуткая мае перавагу на дарозе, а таму можна не баяцца пробак. Акрамя таго, спакайней ехаць пад кантролем медыкаў.

ШТО ЎЗЯЦЬ З САБОЙ?

Адзенне і прыналежнасці для немаўляці родныя могуць падвезці і пазней, а без 5 хвілін мама павінна прыхапіць толькі самае неабходнае:

- ✓ пашпарт і абменную картку
- ✓ мабільны тэлефон
- ✓ гумавыя шлёпанцы
- ✓ шкарпэткі
- ✓ халат
- ✓ бялізну
- ✓ мыла (лепей вадкае)
- ✓ туалетную паперу
- ✓ пракладкі
- ✓ расчоску
- ✓ зубную шчотку і пасту
- ✓ рушнік
- ✓ кубак, талерку, лыжку, відэлец
- ✓ бутэльку пітной вады.

Калі плануюцца партнёрскія роды, абавязкова з сабой павінен быць дагавор, пасведчанне аб праходжанні курсаў падрыхтоўкі да партнёрскіх родаў, пашпарт і медыцынская даведка мужа (або таго, хто будзе партнёрам у родах).

ШТО ЧАКАЕ Ў РАДДОМЕ?

Хуткая прывозіць будучую маму ў прыёмны пакой, дзе адбываецца агляд, пераапрананне і афармленне дакументаў. Жанчына трапляе ў радзільнае аддзяленне, перадродавую палату. Ад стандартнай бальнічнай палаты перадродавую адрозніваюць хіба прыстасаванні для палёгкі падчас схваткаў: гэта могуць быць шведская сцяна, фітбол, душ. Такая палата звычайна разлічана на 3-5 чалавек. У выпадку партнёрскіх родаў гэта будзе, вядома, асобнае памяшканне.

ЯК АДБЫВАЮЦЦА РОДЫ?

Першы перыяд (раскрыццё). Самы працяглы. Раскрываецца шыйка маткі ад 0 да 10 см. Адбываецца гэта няхутка (1 см за 1,5-2 гадзіны) і ў жанчын, якія раджаюць упершыню, можа цягнуцца 8-10 гадзін. У гэты час можна хадзіць, стаяць на карачках, сядзець на фітболе ці бідэ, прымаць душ, правільна дыхаць, рабіць самамасаж.

Другі перыяд (выгнанне). Адбываецца ў радзільнай зале пад кантролем урача і акушэрак. Працягласць — 20-30 хвілін. Схваткі працягваюцца, і для таго, каб прасунуць дзіця па родавых шляхах, жанчына тужыцца. У гэтым удзельнічаюць многія мышцы (прэса, спіны, бёдраў), так што роды — вельмі цяжкая фізічная праца.

Трэці перыяд (пасляродавы). Нараджаецца паслед (плацэнта і плодныя абалонкі). Працягласць — 15-20 хвілін. Урачы аглядаюць родавыя шляхі, у выпадку разрываў або трэшчын накладваюцца швы. Далей мама яшчэ 2 гадзіны знаходзіцца ў родавым аддзяленні, а медыкі кантралююць, як скарачаецца матка, робяць масаж маткі і кладуць холад на жывот.

ЦІ МОЖНА АБЯЗБОЛІЦЬ?

Прымяняцца можа абязбольванне медыкаментознае і немедыкаментознае. Першае праводзіцца анестэзіёлагам па строгіх паказаннях. Доза вывяраецца так, каб не нашкодзіць плоду. У другім выпадку дапамагаюць спецыяльныя позы (стаянне на карачках), правільнае дыханне, масаж пэўных кропак на целе, прыняцце душу, джакузі, сядзенне на фітболе і інш. Такія метады ніяк не могуць нашкодзіць ні маці, ні дзіцяці.

ШТО АДБЫВАЕЦЦА З ДЗІЦЕМ ПАСЛЯ НАРАДЖЭННЯ?

Немаўля аглядае ўрач-неанатолаг, які ацэньвае яго стан па шкале Апгар (у балах ад 0 да 10 па пяці асноўных крытэрыях: колер скуры, частата сардэчных скарачэнняў, рэфлексы, мышачны тонус, дыханне). Калі стан нованароджанага здавальняючы, то пасля пераразання пупавіны яго прыкладваюць да грудзей. Пасля малое ўзважваюць, мераюць рост, апрацоўваюць пупочную ранку, спавіваюць і ўхутваюць у коўдру, паколькі нованароджаныя прывыклі да тэмпературы мамінага цела і вельмі схільныя да пераахалоджвання.

Праз 2 гадзіны маму пераводзяць у пасляродавую палату і аддаюць малое. Калі жанчына вельмі стамілася або прымяняўся наркоз для накладвання швоў, то дзіця могуць аддаць пазней. Тады яно будзе знаходзіцца ў дзіцячым аддзяленні, і яго будуць прывозіць толькі на кармленне.

ЯК ДОЎГА ТРЭБА БЫЦЬ У РАДДОМЕ?

Пры першых родах і нармальным іх завяршэнні мама з дзіцем выпісваюцца на 4-5-я суткі, пасля другіх родаў — на 3-4-я.

У першыя дні пасля родаў важна знаходзіцца пад наглядам урача. Для мамы важна навучыцца догляду малога, грудному кармленню, якое спрыяе лепшаму скарачэнню маткі. Парадзіхам рэкамендуецца ляжаць на жываце, прыкладваць холад, выконваць спецыяльную гімнастыку і практыкаванне Кегеля, насіць бандаж. Пры неабходнасці, могуць прызначацца фізіятэрапеўтычныя працэдуры, прычым непасрэдна ў палаце.

Лічбавая і бытавая тэхніка ў раддоме не вітаюцца. Ноўтбукі дазваляюцца толькі ў платных палатах, чайнікі і кіпяцільнікі забароненыя. Дапускаецца толькі мабільны тэлефон і невялікі фотаапарат-«мыльніца».

А КАЛІ КЕСАРАВА СЯЧЭННЕ?

Калі прызначана планавая аперацыя кесарава сячэння, то шпіталізацыя можа адбыцца пачынаючы з тэрміну даношанай цяжарнасці (з 38 тыдняў). У раддоме цяжарную абследуюць і прызначаць дату аперацыі. Звычайна яны выконваюцца раніцай, нашча. Пры адсутнасці проціпаказанняў можна выбраць від анестэзіі — спінальная ці агульная. У першым выпадку прыкладання да грудзей усё роўна не будзе, паколькі ў арганізме знаходзяцца абязбольваючыя прэпараты.

Прадвеснікі

Прыкладна за тыдзень да падзеі цяжарная адчувае падманныя схваткі, жывоцік апускаецца, у паясніцы цягне, з'яўляюцца санлівасць і апатыя, есці не хочацца, а кішэчнік штосьці «бунтуе».

Першыя 10-12 гадзін пасля аперацыі мама знаходзіцца пад наглядам медыкаў у рэанімацыі, а дзіця — у дзіцячым аддзяленні. Пасля жанчыну пераводзяць у пасляродавую палату. Дзіця аддаюць матулі, калі яе самаадчуванне прыходзіць у норму. Кесарава сячэнне — досыць сур'ёзная паласная аперацыя, таму патрабуецца час для аднаўлення. А да таго дзіця прывозяць на кармленне ў пэўныя гадзіны. Выпіска пасля кесарава сячэння адбываецца на 5-6-я суткі, пасля зняцця швоў.

ЦІ МОЖНА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА РОДАЎ?

Можна і трэба! Пэўны настрой і падрыхтаванасць вельмі важныя. Роды — цяжкая праца, на якую трэба настроіцца, каб не ўскладняць працэс. Так што, будучыя мамы, наведвайце спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы да родаў!

Святлана БАРЫСЕНКА



Дома і сцены дапамогуць?

Павел ЖЫВІЦА, аўтамеханік прыватнай СТА:

— Калі ў жанчыны ўсё добра са здароўем і няма паказанняў да шпіталізацыі, не бачу прынцыповай неабходнасці абавязкова ехаць у радзільню. Тым больш, як паказвае наша з жонкай практыка, у медыцынскай установе можа быць самае сучаснае абсталяванне, свежы рамонт і кваліфікаваны персанал, але калі да парадзіхі ставяцца абыякава, нават бяздушна, маўляў, «цярпі, няма чаго тут крычаць, усе нараджалі — і ты народзіш», гэта аказвае моцны негатыўны ўплыў на яе псіхаэмацыянальны стан і ў рэшце рэшт на цячэнне родаў. Дома ж, у звыклай абстаноўцы, калі няма дадатковых стрэсавых фактараў, жанчына менш перажывае і больш засяроджваецца на самім працэсе.

Так, нельга падыходзіць да пытання дамашніх родаў без адпаведнай падрыхтоўкі і глыбокага вывучэння тэмы, яшчэ лепш папярэдне пракансультавацца з урачамі, якім вы даверыцеся, і трымаць пад рукой іх нумары тэлефонаў. Але калі жанчына ўпэўнена ў сваіх сілах, фізічна і псіхалагічна падрыхтавана, то чаму не?! Мая стрыечная сястра, што жыве пад Ярославлем, нараджала сваё другое дзіця менавіта дома, у ваннай — і не нарадуецца на тое, якая ў яе моцная і здаровая дачушка.

Вікторыя КУЗЬМІЦКАЯ, менеджар па рэкламе:

— Асабіста я катэгарычна супраць гэтай моды. Так, лічу дамашнія роды менавіта модай і блазнотай асобных «прасунутых» будучых маці, якія начыталіся форумаў у інтэрнэце і лічаць, што ведаюць сітуацыю лепш за ўрачоў. Нават калі жанчына па стане здароўя блізкая да касманаўта (што на апошніх тыднях цяжарнасці, будзем шчырыя, наўрад ці праўда), ніхто не можа даць стапрацэнтнай гарантыі спрыяльнага зыходу самастойных родаў. Калі ж, крый Божа, здарыцца нешта непрадбачанае (адкрыецца крывацёк, упадзе ціск ці ў мамы банальна не хопіць сіл на патугі), не факт, што нават самая хуткая дапамога паспее давезці парадзіху да бальніцы і што з ёй і дзіцем усё будзе нармальна. І што потым, чые локці кусаць — медыкаў, што недагледзелі, або ўсё ж свае, што недадумалі?.. Яшчэ ў ВНУ, калі я наведвала курс па медыцыне, добра запомніла заўвагу практыкуючага ўрача: «Дома нараджаць, у прынцыпе, можна — калі ў вас пад рукой рэанімабіль, брыгада вопытных медыкаў і набор усёй той апаратуры, што ёсць у стацыянарным раддоме».

Многія любяць разважаць, што раней жанчыны і ў полі нараджалі, не адрываючыся ад працы. Так, нараджалі. Але вы распытайце ў сваіх бабуль і прабабуль, колькі з тых жанчын і немаўлят выжывалі... Дый сёння, няхай лічба мацярынскай і дзіцячай смяротнасці ў Беларусі адна з самых нізкіх у свеце, няўжо хтосьці добраахвотна падвергне сябе рызыцы трапіць у гэтыя некалькі нешчаслівых працэнтаў?! Словам, я абедзвюма рукамі супраць самадзейнасці і самаўпэўненасці ў гэтым пытанні.

■ Трэці ўзрост

ПАШЫЮ САБЕ... КАРЦІНУ

Як з непатрэбнага адзення стварыць аб'ект мастацтва

Модны вобраз ад Маргарыты Іванаўны. Сумка, дарэчы, зроблена з рэшткаў тканіны, што засталіся пасля раскрою спадніцы і блузкі.

З майстрам народнай творчасці Маргарытай КОТАВАЙ мы пазнаёміліся на яе выставе. Модная вопратка, яркія вусны, бліскучыя вочы... Назваць гэтую прыгожую і энергічную жанчыну бабуляй (а Маргарыта Іванаўна ўжо колькі гадоў на пенсіі) язык не паварочваецца. Праводзіць дні ў адзіноце перад тэлевізарам ці на лаўцы ля пад'езда — гэта не для яе. Маргарыта Іванаўна, філолаг па адукацыі, цікавіцца мастацтвам, наведвае галерэі, а галоўнае, сама стварае тэкстыльныя карціны. Лапікамі тканіны жанчына «малюе» анёлаў, прыгожыя краявіды і жывёл.

Працуе яна ва ўнікальнай тэхніцы тэкстыльнай мазаікі.

— Такую тэхніку можна параўнаць з жывапісам: лапікі — гэта фарбы, а шывок — лінія, — тлумачыць Маргарыта Іванаўна. — Я паставіла сабе задачу працаваць з любой тканінай, ад драпу да шыфону. Напрыклад, каб перадаць адценні неба ў карціне «Лесвіца ў нябёсы», накладвала некалькі слаёў шыфону розных колераў. У некаторых працах выкарыстоўваю нават мэблевую тканіну — вельмі эфектна выглядае.

Тэкстыль для творчасці яна знаходзіць... ва ўласнай шафе: бязлітасна рэжа старыя сукенкі і касцюмы. У ход ідзе любы матэрыял. Нават беражкі тканіны, якія швачкі звычайна зразаюць, каб пазбегнуць дэфектаў пры раскроі. З іх Маргарыта Іванаўна вырабляе сурвэткі: пераплятае беражкі, як кошык, а знізу падкладвае іншае палатно. А дзеля працы «Гартаючы стары альбом» майстрыца не пашкадавала нават шаліка з выявай «Мадонны» Бацічэлі, прывезенага з Луўра. Смяецца, што родныя былі ў шоку: прывезці рэч з Францыі і пусціць яе на шматкі! Але ў справе мастака без рашучасці нічога не атрымаецца.

— Ведаеце, якая мая любімая крама? З тканінамі. Ніколі не праходжу міма. Бывае, спадабаецца тканіна, але я пакуль не ведаю, над якой карцінай буду працаваць — вазьму паўметра. Не збяднею: па кошце гэта як кубак кавы з пірожным, — кажа жанчына.

Сярод работ — больш чым за 10 гадоў творчасці іх сабралася каля сотні — не толькі карціны, але і сумкі, капялюшыкі, падкоўдранікі. Ёсць нават накідкі на чайнік у выглядзе курыцы і каровы, якія мы спачатку прынялі за цацкі. Па словах Маргарыты Іванаўны, калі заварыць духмяныя травы, а потым накрыць іх такой «курачкай», пах ад гарбаты па ўсёй кухні будзе неверагодны. Каб пашыць лапікавы падкоўдранік, дастаткова тыдня (пры ўмове, што ўся тканіна ўжо ёсць, а на карціну спатрэбіцца каля месяца. Некаторыя з тэкстыльных прац вісяць у родных і сяброў, іншыя разышліся па прыватных калекцыях. Жартую: «Можа, вы ўжо бізнес наладзілі на сваёй творчасці?» Але жанчына прызналася, што прадала толькі пару работ: дарыць жа прыемней у тысячу разоў. Тым больш, калі прадаеш, дык разбураеш калекцыю, а адна карціна мала што кажа пра аўтара. Таму лепш, калі творы знаходзяцца разам.

Дзеля працы «Гартаючы стары альбом» майстрыца не пашкадавала нават шаліка з выявай «Мадонны» Бацічэлі, прывезенага з Луўра. Смяецца, што родныя былі ў шоку

Тэкстыльныя мазаікі Маргарыты Іванаўны выстаўляліся ўжо разоў 20 (цяпер іх, дарэчы, можна пабачыць у бібліятэцы №12 Ленінскага раёна сталіцы, выстава будзе доўжыцца да 6 красавіка). Тройчы карціны ездзілі ў Парыж. Пенсіянерка ў Францыі таксама была:

— Парыж для мяне — гэта Арсэ і Луўр. І яшчэ некалькі прыватных музеяў. А спытайце, ці была я ў французскіх буціках адзення — ніколі! Мне там няма чаго рабіць. Дарэчы, вельмі спадабалася, што ў французаў ты — мадам. А калі прыязджаеш да нас — жанчына.

У Парыжы жыве малодшая дачка Ірына. Яна выйшла замуж і 12 гадоў таму пераехала ў Францыю, абараніла магістарскую дысертацыю, працуе мастаком-графікам. Сама Маргарыта Іванаўна жыве з мужам у Мінску. З усмешкай кажа, што яе муж — вельмі цярплівы чалавек: даруе жонцы, што лапікамі тканіны завалены ўвесь дом.

— А дзе работы захоўваеце? — пытаюся ў жанчыны.

— Шафы-купэ запоўнены пад завязку! Цяпер уборы з паліц — прэч, а туды — карціны. Куток, дзе майструю, знаходзіцца на кухні. Там і швейная машынка, якая ўжо як член сям'і. Памяняць яе на больш дасканалыя замежныя апараты нават за грошы не згаджуся. Машынка ж такая рэч: чым даўжэй на ёй працуеш, тым больш яна шліфуецца, становіцца некапрызнай.

Падчас персанальнай выставы Ірыны Котавай у Нясвіжскім замку, што праходзіла летась, арганізатары зацікавіліся і работамі Маргарыты Іванаўны. Таму цяпер жанчына працуе над цэлай серыяй карцін, прысвечаных Нясвіжу і роду Радзівілаў, якія наведвальнікі замка змогуць убачыць ужо сёлета. Цяпер пенсіянерка натхняецца мастацтвам: гартае альбомы па жывапісе і, вядома, ходзіць на выставы.

— Быў час, калі ў Мінску толькі адзін Нацыянальны мастацкі музей працаваў, — успамінае майстрыца. — А цяпер безліч галерэй. Музей раз на месяц абавязкова наведваю. І, калі няма новай выставы, перажываю. Яшчэ не было, каб я выйшла з мастацкай галерэі і мяне нічога не натхніла.

Вечары паэзіі, выставы, тэатры... З такой насычанай культурнай праграмай сумаваць на пенсіі не прыходзіцца. Ды і няма калі: столькі карцін яшчэ трэба пашыць...

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ, фота Сяргея НІКАНОВІЧА

■ Наш фармат

ЖАНЧЫНАМ ПАТРЭБНА ЎВАГА

На мінулым тыдні былі падведзены вынікі VII Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2014». З якіх прычын яго фармат у параўнанні з мінулымі гадамі змяніўся і якія перспектывы бачацца найбольш верагоднымі ў найбліжэйшай будучыні, расказала сустаршыня Беларускага саюза жанчын Антаніна МОРАВА.

— У мінулым годзе ў нас было 10 намінацый, а ў гэтым годзе толькі пяць, плюс спецыяльны прыз «За вернасць Беларускаму саюзу жанчын», — адзначае Антаніна Пятроўна. — Яго сёлета атрымалі восем жанчын, якія стаялі каля вытокаў стварэння БСЖ і ўнеслі вялікі ўклад у працу арганізацыі. Колькасць намінацый змянілі, абапіраючыся на вопыт мінулых гадоў. Справа ў тым, што некаторыя з іх у мінулых конкурсах пераклікаліся і праз гэта было даволі складана выбіраць пераможцу. Напрыклад намінацыя «За прафесіяналізм» і намінацыя «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва». Яны ўзаемазвязаны і пераклікаюцца, таму ў гэтым годзе мы пакінулі адну. Былі намінацыі, ад якіх мы проста адмовіліся — напрыклад, у катэгорыі «За жаночую мужнасць» прэтэндэнтаў заўсёды аказвалася зусім няшмат: нам прыходзілася выбіраць з трох чалавек.

Затое сёлета была ўведзена новая намінацыя «За грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі». Бягучы год у дзяржаве аб'яўлены Годам моладзі, больш за тое, па краінах СНД аб'яўлены Год ветэранаў. І, безумоўна, тыя падзеі, што адбываюцца ва Украіне, падштурхоўваюць нас да таго, каб яшчэ больш уважліва займацца пытаннямі патрыятычнага выхавання ў Беларусі.

— Змяніліся толькі намінацыі?

— Не, з'явілася таксама істотнае абмежаванне для ўдзельнікаў: кандыдаткі абавязкова павінны быць членамі БСЖ.

Яшчэ адно значнае змяненне — фармат правядзення конкурсу. Да гэтага нам з абласцей прысылалі кандыдатуры і іх эсэ, потым рэспубліканскі арганізацыйны камітэт выбіраў найлепшых. У гэтым годзе мы пайшлі па іншым шляху: кожная вобласць Беларусі і горад Мінск самі выбіралі сваіх пераможцаў, а мы ўжо пацвярджалі іх прапанову.

Раней здаралася, што на наша рашэнне крыўдзіліся: маўляў, мы выбралі не тую жанчыну, якую на месцах лічылі больш вартай узнагароды. Цяпер абласныя арганізацыі БСЖ самі выбіралі найлепшых. І мы ведаем, што гэта не простае рашэнне. Думаю, што ў нас усё атрымалася. Праўда, мы яшчэ будзем збіраць і вывучаць меркаванні абласных арганізацый.

— Ці значыць гэта, што ўмовы конкурсу і фармат ізноў могуць змяніцца?

— Хутчэй за ўсё, гады два мы будзем праводзіць конкурс у такім фармаце. Але жыццё не стаіць на месцы, усё рухаецца, таму думаю, што праз некаторы час можна ізноў чакаць змяненняў. Гэты конкурс вельмі запатрабаваны. Раней у нас былі думкі ладзіць яго раз у два гады, як праводзіцца конкурс «Сям'я года», але гэтую ідэю не падтрымалі. Жанчынам патрэбна ўвага, патрэбна, каб іх намаганні і дасягненні ўбачылі. Яны працуюць, каб была магчымасць паказаць сябе. І менавіта жаночая актыўнасць падштурхоўвае да таго, каб конкурс быў штогадовы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ

■ Вазьму твой боль...

ДОЎГІ ШЛЯХ СКЛАДАЕЦЦА З МАЛЕНЬКІХ КРОКАЎ

У мяне часта пытаюцца, як я жыву пасля адыходу ад справы свайго жыцця — дабрачыннага «Клуба 5000». Добра жыву. Гадую сына, узнімаю настрой мужу. Пайшла на фітнес. Назіраю за клубам збоку. І радуюся. Радуюся таму, што ўсё склалася менавіта так.

Калі збіраецца шмат спраў, я панікую. Панікую ад іх колькасці, ад сваёй бездапаможнасці. Ад страху, што не спраўлюся. І калі я працягну паніка ваць, то сапраўды не спраўлюся. Тады бяру сябе ў рукі, забываюся на шматлікія справы і пачынаю выконваць толькі адну. І думаю выключна пра яе. Калі яна скончана, пачынаю другую. І так я «разграбаюся».

Доўгі шлях складаецца з маленькіх крокаў. І я ніколі не думаю пра гэты шлях, але думаю пра кожны асобны крок.

Часам гляджу на людзей, якія шмат дасягнулі, чытаю іх інтэрв'ю і здзіўляюся: я так не змагла б. І тут жа разумею чаму. Яны расказваюць, што поспех не падае з неба, што стваралі ўсё ўласнымі сіламі, напорыста ішлі наперад, не здаваліся, бачылі мэту, глядзелі ў будучыню і, як руплівы конь, аралі-аралі-аралі...

Я не з тых, хто шмат плануе, ставіць мэты, ідзе напралом і дасягае задуманага нягледзячы ні на што. Я раблю толькі тады, калі ўсё кладзецца гладка. І ў мяне атрымліваецца толькі тады, калі ўсё робіцца само.

Я не веру ў забабоны і прыкметы, але прыглядаюся да знакаў. Бо лічу, што іх падае сам Гасподзь.

...Першую кнігу Джоан Роўлінг пра Гары Потэра надрукаваў толькі трынаццаты выдавец. Дванаццаць чалавек да гэтага вярталі ёй безнадзейны рукапіс і адназначна рэкамендавалі забыцца на мару паказаць яго свету. Але яна не здавалася. І стала самай высокааплочваемай пісьменніцай у свеце, напісала цыкл самых прадаваемых кніг за ўсю гісторыю.

Хто б з вас дайшоў да трынаццатага выдаўца? Так і чую, як гэта пытанне задае трэнер на занятку па павышэнні самаацэнкі і выпрацоўцы настойлівасці. Я не буду задаваць яго, каб падштурхнуць вас да рэалізацыі ўсіх сваіх ідэй.

Я хачу сказаць: а што б змянілася ў свеце, калі б у ім не было Гары Потэра? Джоан Роўлінг не стала б пісьменніцай. Яна магла б прыслухацца да знакаў, пакорпацца ў сабе і знайсці іншае прызванне. Магчыма, яна ідэальная настаўніца і выхавала б не аднаго Праметэя, падарыўшы слабым заступніка, а свету — святло. Мы не ведаем, як склалася б жыццё, калі б спадарыня Роўлінг не была такой упартай. Магчыма... значна лепш, чым склалася цяпер.

Я прыглядаюся да знакаў. Пры гэтым не напісала неўміручы раман, мае песні не гучаць з кожнай форткі, мае ролі не разбіраюць па цытатах, мае шэдэўры не выстаўляюць у галерэях, маё вынаходніцтва не падарыла людзям свабоду, маю вытворчасць не прадаюць па ўсім свеце. Больш за тое, я не ведаю, чым хачу займацца і як прыносіць карысць. Усё яшчэ шукаю знакі. Але тое-сёе ў мяне ўсё ж атрымалася.

«Клуб 5000», які ўжо шосты год дапамагае анкахворым дзецям і іх сем'ям, быў створаны і працуе сёння дзякуючы знакам. Мой удзел у яго стварэнні перабольшаны. Я проста назірала і выконвала заданні. Я не ставіла мэты і не магла нават уявіць, што з гэтага атрымаецца. Ішла паступова. Не глядзела наперад, не азіралася. Пад ногі, толькі пад ногі, канцэнтруючыся на кожным маленькім кроку. А на карце дабрачыннага руху побач з маімі слядамі з'яўляліся іншыя. І цяпер пратаптаных сцежак шмат, «Клуб 5000» сабраў і аб'яднаў мноства цудоўных людзей.

Не скажу, што мой шлях на ніве дабрачыннасці быў лёгкім. Гэта каб вы разумелі, што я не здаюся адразу, і не думалі, што ў любой перашкодзе бачу «знак». Ішла і праз сцюжу, і ў лівень, застала пясчаны буран. Але ў тыя хвіліны нешта мне падказвала, што непагадзь часовая. Трэба проста глядзець пад ногі. І рабіць неабходны крок.

Кажуць, што перашкоды ладзіць нечысць. Як толькі палкі ў колы — значыць, добрая справа. Вунь, як чорт вар'яцее! А я не веру ў чорта. Я веру ў Бога. І шукаю Яго знакі.

МНЕ было неверагодна складана пакінуць сваё дзецішча «Клуб 5000». Не хачу нават прыгадваць, як прымала рашэнне і перажыла той момант. Але тады я ведала, што на гэта Яго воля. Не шкадую і цяпер. Дабрачыннаму руху ідзе на карысць маладая кроў. Старыя валанцёры раскрываюцца, з'яўляюцца новыя ўдзельнікі. Рух жыве, адкрывае новыя праекты і кірункі дзейнасці. А я любуюся ім на адлегласці. Так лепш відаць.

Я хачу сказаць: а што змянілася з маім сыходам з «Клуба 5000»? Правільна, нічога. Магчыма, калі б я засталася, то было б значна горш, чым склалася сёння. Я магла зацягнуць яго ў балота. Ці не зрабіць нешта новае, што яшчэ наканавана. Я пакуль не ведаю, што канкрэтна. Але веру, што Ён нешта падрыхтаваў для мяне.

І позна ўначы, нарэшце паклаўшы сына спаць, гляджу на дзіцячыя цацкі, раскіданыя па кватэры. Валюся ад стомы і панікую, што не здолею навесці парадак. А пасля бяру адну цацку і кладу ў скрыню. За ёй другую. І так прыбіраю ўсе. Усміхаюся. Цалую сонная малога. І чакаю знакі.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА, стваральніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»

І ГЭТА ЎСЁ ПРА ЯЕ

З якога боку вы будзеце глядзець на гэту царкву, такой яе і ўбачыце. Гэта падарожжа-квест, падарожжа-інтрыга, падарожжа-атракцыён. І якраз той выпадак, калі дзеля аднаго аб'екта не шкода ехаць за сотні кіламетраў. Ёсць, праўда, побач месца больш актыўнага паломніцтва. Пра якое, між тым, мала хто ведае нешта вельмі цікавае...

Ці бачыце (пакуль што на здымках), якая яна шматаблічная і наколькі загадкавая? Цяжкія сцены, магутныя вежы, байніцы — не царква, а сапраўдная цытадэль. Шчыт-франтон мала што займае ледзь не палову фасада, дык яшчэ да самага карніза ўшпілены рознафарматнымі (невядома навошта) нішамі.

З усіх больш-менш прывабных версій аб паходжанні храма ў Сынкавічах (раней сказалі б, Слонімскага павета Дзярэчынскага благачынння, цяпер — проста Зэльвенскага раёна) самай цікавай падаецца тая, што звязана з прышэльцамі.

Што можна пакінуць дома

ФОТААПАРАТ

Тысячы фотаздымкаў з дзясяткаў аднадзённых паездак? У такім выпадку заўсёды ёсць чым пахваліцца перад гасцямі, якіх пасля сытнай вячэры, торта і кавы няма чым заняць. Але гэта не фокус. Фокус і найвышэйшы пілатаж — гэта не прывезці з паездкі ніводнага фотаздымка. Вось сапраўднае разуменне сэнсу падарожжа як такога. Тое, што зафіксаваў фотаапарат, не так надзейна адкладаецца ў памяці, як тое, чаго ён не фіксаваў.

Названыя татарамі, яны літаральна дзясяткамі сем'яў рушылі сюды з імі ж перанаселенага Слоніма і пабудавалі тут такую адмысловую мячэць, што можна ў ёй не толькі малітвы ўзносіць, але і скарбы захоўваць, і абараняцца, калі раптам што. Між тым, гэтай дзіўнай царкве прыпісваецца не толькі мусульманскае, але і язычніцкае паходжанне. Навошта, маўляў, падвойныя сцены, як не для таго, каб зладзіць у іх «дыянісава вуха»?

Сцены царквы і насамрэч падвойныя: вакол усёй будыніны ў прасценку цягнецца ход, які можа падвесці цікаўнага даследчыка да кожнай вежы. Некалі, паўтара стагоддзя таму, яшчэ айцом Плакідам Янкоўскім з блізкіх Жыровічаў нябачныя звонку лесвіцы апісваліся, як вузенькія і так добра сцёртыя ад шматгадовай і частай хадзьбы, што па іх хіба толькі караскацца. Яшчэ некалі ён, Плакід Янкоўскі, з'яўляючыся семінарскім прафесарам, атрымаў ад свайго начальства ўстаноўку хаця б зрабіць спробу дазнацца наконт і своеасаблівасці дойлідства, і прычыны ўхілення ад формы хрысціянскай царквы, і пра час пабудовы, і пра ўласна фундатара. І вось пра што яму распавядаў тады стары святар, глухі і мілажальны. Трэба, маўляў, вашай Вялебнасці ведаць, што ранейшыя айцы мелі куды больш розуму і прыстойнасці — будавалі храмы каменныя, незгаральныя, а ў іх, натуральна, уладкоўвалі тайнікі для захавання сваіх досыць сціплых пажыткаў. Бо, як вядома, і непрыяцель набеглы, і злодзей мясцовы заўсёды задумаюцца, перш чым пачаць рабаваць: усё-такі не ў хаціне ўбогай, а ў храме святым злачынства іх павінна адбыцца. І няхай сабе вялебныя айцы-рэвізоры забараняюць сцерагчы скарб насельніцтва ў храме, рабіць гэта ўсё ж вельмі карысна. Бо не будзь у храме такога дабра — і не даклічашся выратавання, хоць ты ў набат які бі з усёй моцы. Бо вёска — далёка. Між тым, калі скарб у храме, хоць дзеля жарту ў маленькі званок загудзі — і вёска ўся ўраз тут як тут!

Паслядоўнікам

Падарожжа ў Сынкавічы ўдала спалучаецца з паломніцтвам у Жыровіцкі манастыр. Але ў такім выпадку вельмі крыўдна будзе прапусціць, не пабачыць магілу згаданага святара — Плакіда Янкоўскага. А каб не прапусціць, трэба ведаць, што ў склад Жыровіцкай абіцелі ўваходзіць невялічкая старая драўляная цэркаўка на мясцовых могілках. Там усталявана пліта з надпісам: «Родителям протоиерею Плакиду Янковскому (1810-1872) и Елене Янковской (1817-1867). Дети». Наведайце гэтае месца замест агульнапрынятага дзейства ў купальні: далібог, гэта болей карысна.

Знутры Сынкавіцкая царква здзіўляе не менш, чым звонку. Па-першае, як аказалася, тут месціцца «Усецарыца» — спісаны з афонскага арыгінала і прыкладзены да дзясяткаў тамтэйшых святынь цудатворны абраз, які выратоўвае хворых на анкалогію. Па-другое, вось што хавалася пад пластамі фарбы, а цяпер шчасліва адкрыта для сузірання і пераведзена з грэчаскай для ўсеагульнага разумення:

Не ўсялякаму духу верце, але выпрабоўвайце духаў, ці ад Бога яны (апостал Іаан).

Глядзіце, браты, каб хто не завабіў вас філасофіяй і спакусай паводле падання чалавечага і стыхіі свету, а не паводле Хрыста (апостал Павел).

Прыведзеныя радкі выпісваліся на сценах як быццам у XIII стагоддзі. А татары ў нас сялілі ся, як ведаем, пазней. Іншымі словамі кажучы, даследаваць ёсць яшчэ што. І той самы Плакід Янкоўскі, падаўшы ў 1841-м «выканаўчую запіску» пра даследаванне дадзенай царквы свайму начальству і пачуўшы, што гэта, маўляў, не факты, а толькі здагадкі, даведаўся, між іншым, яшчэ і наступнае. Быццам былы завадатар слонімскай шляхты Адальберт Пуслоўскі (нашчадкам якога на той год належалі Сынкавічы) яшчэ на два дзесяцігоддзі раней склаў падрабязнае, па-сапраўднаму гістарычнае апісанне пабудовы. І разам з планам яе, а таксама арыгіналамі дакументаў, што хаваліся ў фамільным архіве, па просьбе аматара старажытнасцяў Восіпа Сераковскага справадзіў у Варшаву. Калі б тыя фундушы захаваліся, то няўжо б мы пра тое ніяк не празналі? Хаця хто яго ведае...

Рамантыкам

Наведаўшы Жыровіцкі манастыр, нельга не зазірнуць у кавярню «Манастырская трапеза». Стравы там гатуюцца па бласлаўленні, з любоўю і ў суправаджэнні малітвы. Мае дзеці Сяргейка і Паўлічак каторы год ужо са смакам у роце ўспамінаюць «манастырскія» булачкі. І не дзіва! Агонь у кухні, дзе яны гатаваліся, запальваецца ад нязгаснай лампады каля цудатворнай Жыровіцкай іконы. Самая простая ежа аздабляецца тут падзякай у славу Божую. Таму скажыце гаспадыні, якая падасць вам шарлотку або тварожнікі, не звычайнае «спасибо», а «спаси, Господи!». Так тут прынята.

Цікаўнасць нашых продкаў тым істотна ад нашай адрозная (гэта я амаль цытую Плакіда Янкоўскага), што яны ніколі не спяшаліся даверяць друку ні сваіх назіранняў, ні дакументаў. Растрачваюць, маўляў, апошнія праз танны друк сваю каштоўную ўрачыстасць. І што ў выніку? У выніку — і рукапісныя запісы тых назіранняў, і дакументы-сведкі знішчае ненажэрны час. І хоць яго апетыт спісваецца ў большасці сваёй на няўстойлівасць матэрыялу і неахайнасць тых, хто яго ахоўвае, але што з таго нам, сённяшнім? Архівы ж ва ўсе часы мелі дрэнную звычку гарэць, а жывыя паданні — блытацца і забывацца. Вось і не маем мы цяпер пра некаторыя аб'екты сваёй цікаўнасці нічога больш-менш дакладнага. Хіба што версіі. Але тым і вабяць нас такія вось падарожжы-загадкі...

Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.

Што вабіць асабліва

ЛІХТАРЫ І ЛІХТАРШЧЫК

Кожнага турыста асабліва прываблівае нешта такое, што не сустрэнецца яму больш нідзе і ніколі. Толькі там, куды ён, кінуўшы справы, гадзінамі ехаў, павінна мецца гэта «нешта». Дзе ў нас яшчэ ёсць алея ліхтароў, дзе яшчэ яны сілкуюцца газай, дзе яшчэ гэтыя ліхтары запальвае адмысловы персанаж Ліхтаршчык, паводле адмысловага пісьмовага, адбітага ў бронзе загаду Кажана, а час запальвання паказвае адмысловы гадзіннік? Толькі ў Брэсце, на вуліцы Савецкай (не блытаць з вулкай Гогаля ў тым жа горадзе, на якой таксама ўсталяваны ліхтары, і таксама не вельмі звычайныя).

ДАЛЁКА І БЛІЗКА



Пра яго некалі казалі, быццам ён і на лаціне чытаць не ўмее, і Цыцэрона з Квінтыліянам змешвае, а грэчаскай мовы нават не нюхаў. Цяпер яму пакланяюцца. Ён — той, хто любіў прыдумляць чалавецтву загадкі кшталту вось такой: людзі жорстка б'юць тое, што ёсць прычына іх жыцця. Што гэта? Не здагадваецеся? Малацьба хлеба! Хто ён? Леанарда да Вінчы, зразумела! Увесь сакавік у Мінску выстаўляюцца яго вынаходніцтвы. Адрас паломніцтва — Нацыянальны мастацкі музей.

Вам хочацца казкі, дабрыні і прыгажосці? Вам хочацца ўдыхнуць — і доўга не выдыхаць? Ну, іншымі словамі, нечага такога, такога, такога... Не-ве-ра-год-нага?! У гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» да 5 красавіка доўжыцца выстава пад красамоўнай назвай «Спадарыня Лялька: Кніга казак».

Прыхільнікам коміксаў, фэнтэзі і камп'ютарных гульняў! У сярэдзіне красавіка ў Мінску на 2000 квадратных метрах «Чыжоўка-Арэны» пройдзе вялікі фэст UniCon. У праграме: сустрэчы з робатамі, лекцыі аб тэлепартацыі, спецыяльныя кірмашы незвычайных сувеніраў, канцэрты, дэфіле персанажаў касцюміраваных гульняў (касплэяў), аўтограф-сесіі куміраў — Аляксея Пехава, Вольгі Грамыкі, Сяргея Слюсарэнкі ды іншых. Час збірацца! Кошт квітка — 300 000 рублёў, але для ўдзельніка дэфіле прадугледжана зніжка.

Поўнае зацьменне Сонца адбудзецца ўдзень, ад поўдня да паабеддзя, у пятніцу, наступную пасля пятніцы 13-га, — 20 сакавіка. Прыхільнікам астранамічных з'яў пра спецыяльныя фільтры для назірання за такой з'явай нагадваць не трэба, астатніх варта папярэдзіць: назіранне сонечнай кароны ўзброеным вокам (праз бінокль або тэлескоп) выклікае моцны апёк сятчаткі. Адзінае, што насамрэч патрэбна, — добра зацемненае шкло або надзейна засвечаная фотаплёнка.

Мацейскі кірмаш — гэта нагода ўзяць вясновы настрой і выправіцца з ім у Прагу, а там на свае вочы пераканацца ў тым, што кірмаш Святога Мацея — гэта «нешта нейкае». Больш за сотню атракцыёнаў, дзясяткі вясёлых забаў, неперадавальная атмасфера і неверагодная смаката ў выглядзе імбірных пернічкаў, бульбяных шкубанчыкаў, булачак-завіванцаў, сардэлек-утапленцаў, багемскіх баклажанаў і шмат яшчэ чаго вартага ўвагі — сёлета кірмаш доўжыцца з 1 сакавіка да 30 красавіка.

Фестываль цыбульных культур — гэта не казка пра Чыпаліна, а быль пра Кокенхоф, самае прыгожае вясновае свята Нідэрландаў. Цюльпаны, гіяцынты, нарцысы, фрэзіі ды іншыя кветкі з цыбулькамі паміж сцяблом і коранем прадстаўлены будуць з 28 сакавіка ў Лісе. 34 гектары кветак, 15 кіламетраў сцяжынак, тысячы ўсмешак, мільён новых мар!

Радаслава АЛАДАВА:

«Мама была нашым святам!»

Алена АЛАДАВА і справа яе жыцця — Нацыянальны мастацкі музей.

Унёсак Алены Аладавай у беларускую культуру настолькі значны, што не заўважыць яго немагчыма: Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, які лічыцца адным з сімвалаў беларускай сталіцы, — дзецішча Алены Васільеўны. Гэта яна, надзвычай энергічная і працалюбівая жанчына, апантаная справай збіральніцтва і калекцыянерства мастацкіх твораў, стала натхняльніцай яго будавання, напаўнення духоўнымі каштоўнасцямі і беражлівага захоўвання іх для народа і гісторыі. Дзіўна склаўся прафесійны лёс гэтай жанчыны. У 1937 годзе Алена Васільеўна стала навуковым супрацоўнікам групы па стварэнні першай у Беларусі Дзяржаўнай карціннай галерэі, якая афіцыйна адкрылася ў 1939 годзе. І роўна праз 40 гадоў, у 1977-м сышла з пасады дырэктара гэтай установы — ужо Дзяржаўнага мастацкага музея БССР...

На сталічнай вуліцы Карла Маркса, у доме, які здаўна называецца «пісьменніцкім», у кватэры Аладавых і сёння амаль так, як было пры жыцці Алены Васільеўны. Тут жыве дачка Аладавых Радаслава Мікалаеўна — музыказнаўца, прафесар кафедры гісторыі музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Яна і захавала атмасферу «аладаўскай» кватэры.

Радаслава Аладава нарадзілася ў пераможным, 1945, годзе: трэцяе дзіця ўжо немаладых бацькоў, доўгачаканая дачка пасля двух, ужо падрослых, сыноў. Напэўна, у сям'і звычайнай ёй быў бы наканаваны лёс спешчанага дзіцяці. Але яна нарадзілася ў сям'і незвычайнай. На яе маленства выпала напружаная праца маці па аднаўленні карціннай галерэі і плённая праца бацькі па стварэнні новых музычных твораў.

«Бацькі былі закончанымі працаголікамі, людзьмі, да кроплі адданымі сваёй справе. Я прывыкла ў дзяцінстве прачынацца — а з-за адвечнай цеснаты мой ложак стаяў у нагах бацькоўскага — ад размоў на прафесійныя тэмы, абмеркаванняў тых або іншых службовых сітуацый. Маім выхаваннем займаліся «ўсім светам» — у доме жыло шмат народу: абедзве маміны сястры з дзецьмі, асірацелая падчас вайны татава пляменніца, студэнтка Ганна, якая была на правах дачкі. Апроч таго, гасцявалі сябры братоў, Вальмена і Гельміра, нейкі час знаходзіліся дзеці маскоўскіх сяброў маіх бацькоў, якія сталі студэнтамі мінскіх ВНУ...» — так праз гады напіша Радаслава Мікалаеўна ў сваіх успамінах пра маці і бацьку. Прызнацца, мяне кранула тая цеплыня, з якой былі напісаны гэтыя ўспаміны, дарэчы, пад назвай «Пра маму — з любоўю».

— У дзяцінстве, вядома, яна шмат часу не магла мне аддаваць, і маім выхаваннем займалася Любоў Іванаўна Керкорыус, добры і светлы чалавек, сапраўдны інтэлігент. Але мама — гэта роднае, гэта... нельга выказаць словамі... Калі я ішла з ёю поруч па вуліцы, я вельмі ганарылася. Мама была святам!

Для нас маміна жыццё заўсёды было нагодай для гонару. Для ўсіх нас, яе дзяцей, я ведаю. Магчыма, яшчэ таму, што яна была дырэктар. Бо, калі вакол цябе шмат людзей, у якіх ёсць асаблівае стаўленне да тваёй маці, гэта перадаецца і дзіцяці. Мне здаецца, да яе ўсе ставіліся з пашанай. Мама ж аднолькава паважліва ставілася да ўсіх, нягледзячы на іх пасады. І я бачыла людскую любоў да яе ў адказ...

ЖЫЦЦЁ ЯК РАМАН

Біяграфію Алены Аладавай цяжка расказаць некалькімі радкамі. Жыццеапісанне гэтай выдатнай жанчыны варта захапляльнага рамана.

Алена Васільеўна Аладава (у дзяводстве — Пук) нарадзілася 22 мая 1907 года ў Пружанах. Яе бацька, Васіль Ісаевіч, паходзіў з сялян Кобрынскага павета, але быў адукаваны і скончыў у Маскве Настаўніцкі інстытут. Маці, Алена Сільвестраўна, — з сям'і настаўнікаў: яна, тры яе сястры і іх мужы выкладалі ў школах, а родны дзядзька — у Маскоўскім універсітэце.

У 1915 годзе бацькі атрымалі прызначэнне на працу ў Парычы Бабруйскай акругі. Тут Алена скончыла школу 2-й ступені, пачала маляваць, займалася ў драматычным гуртку і спявала ў хоры, якім кіраваў яе бацька.

У 1925 годзе сям'ю спасцігла вялікае гора — памерла маці. Бацька хутка ажаніўся зноў, і сям'я пераехала ў Жлобін. Але ў 1930 годзе яго

Апошні прыжыццёвы здымак 1986 года: Алена Васільеўна з роднымі і калегамі. Другая справа — дачка Радаслава.

арыштавалі і расстралялі як контрэвалюцыянера (ён быў рэабілітаваны толькі пасля XX з'езда КПСС). Алена, як старэйшая сястра, узяла на сябе ўсе клопаты пра малодшых дзяцей. Гэты абавязак яна пранесла праз усё сваё жыццё. У яе доме заўсёды знаходзілі надзейны прытулак і сапраўдную падтрымку яе родныя, сваякі мужа, сябры і нават зусім чужыя людзі...

Знайсці жыллё ў горадзе, перапоўненым бежанцамі, было не проста. Першы час, пакінуўшы дзяцей у знаёмых, Аладавы начавалі на лаўках у скверах.

У 1921 годзе Алена пачала вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на прыродазнаўча-гістарычным аддзяленні педагагічнага факультэта, адначасова працавала ілюстратарам у Беларускім дзяржаўным музеі, увечары наведвала мастацкую студыю пры Доме мастака, а яшчэ паспрабавала сябе ў ролі экскурсавода на Першай усебеларускай мастацкай выстаўцы і пачала друкавацца ў прэсе пад псеўданімам Аглядач... Жыццярадасная, актыўная дзяўчына пастаянна знаходзілася ў віры творчага жыцця.

Пасля заканчэння ўніверсітэта Алена Васільеўна выйшла замуж за кампазітара Мікалая Ільіча Аладава, будучага народнага артыста Беларусі, аднаго са стваральнікаў і кіраўнікоў Беларускай кансерваторыі.

Мікалай Аладаў, нашчадак старажытнага пецярбургскага шляхетнага роду, быў чалавекам энцыклапедычных ведаў і любіў усё прыгожае, незвычайнае. У 1930 годзе у маладой сям'і нарадзіўся сын Вальмен, праз тры гады — сын Гельмір. Калі пасля вайны нарадзілася дачка, бацька даў ёй імя Радаслава.

...Дзяржаўная карцінная галерэя адчыніла свае дзверы ў 1939 годзе і да вайны арганізавала дзве вялікія мастацкія выстаўкі, адна з якіх з поспехам прайшла ў Маскве падчас Дэкады беларускага мастацтва. Алена Аладава ўжо была ў штаце супрацоўнікаў галерэі. Усё складвалася, здаецца, добра. І раптам — вайна!..

«ВЫРАТУЙЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ!»

Немцы былі ўжо пад Мінскам, а Алена Васільеўна з трыма супрацоўнікамі ўсё яшчэ спакоўвалі экспанаты галерэі. Найлепшыя карціны вымалі з рам і складвалі ў скрыні. Але як вывезці ўсё, калі вадзіцель грузавой машыны галерэі ў першы ж дзень вайны пайшоў у ваенкамат?.. Яны тэлефанавалі ва ўсе інстанцыі: «Дайце машыны! Выратуйце нацыянальныя каштоўнасці!..» Але ніхто машын не даў. А хутка замаўчалі і тэлефоны.

Мінск ужо гарэў, калі дырэктар карцінnай галерэі Мікалай Міхалап аб'явіў, што трэба тэрмінова сыходзіць — немцы могуць акупаваць сталіцу ў любы момант. З болем у сэрцы, пакінуўшы галерэю на двух вартаўнікоў, Аладавы разам з іншымі супрацоўнікамі пайшлі ў бок Калодзішчаў. Там, на станцыі, з вялікай цяжкасцю яны селі ў цягнік, які ішоў у Маскву. Але ў рэшце рэшт — дзе на цягніку, дзе пешшу, дзе на спадарожных машынах — апынуліся ў Саратаве.

Знайсці жыллё ў горадзе, перапоўненым бежанцамі, было не проста. Першы час, пакінуўшы дзяцей у знаёмых, яны начавалі на лаўках у скверах. Яшчэ цяжэй аказалася знайсці працу. Таму бедавалі, галадалі. Муж хадзіў у ваенным лётным шынялі, дзеці — у чужых абносках...

Ці не гэтая страшная нястача ваеннага ліхалецця адгукнецца праз гады ў Алены Васільеўны жаданнем купляць падчас паездак штосьці прыгожае і дарыць блізкім, і перш за ўсё — маленькай дачцэ?

— Памятаю сваю самую прыгожую ляльку, нямецкую — яна была ў мяне ледзьве не да старасці, — з усмешкай расказвае Радаслава Мікалаеўна. — Яшчэ ўзгадваю, як мама мяне апранала. Маім гардэробам асабліва ніхто не займаўся. Я была, бадай што, адзінай дзяўчынкай, якая прыходзіла на вечарыны ў школьнай форме. Гэта, дарэчы, мяне не вельмі хвалявала, таму што ў нас дома не было традыцыі прыбірацца. Але часам у мамы ўзнікала жаданне мяне ўпрыгожыць... Аднойчы яна прывезла мне з Масквы нейкую ўнікальную сукенку. Я была здзіўлена яе памерам і зацікавілася, як у яе ўлезу. А мама спакойна адказвае: «Ну, так, напэўна, не ўлезеш. Але яна была такая прыгожая! Я не магла яе не купіць!» Потым гэтую сукенку камусьці аддалі...

Гэта было ўжо пасля вайны, а тады, у эвакуацыі, страшная нястача прыводзіла Алену Васільеўну ў адчай. І яшчэ яе трывожылі думкі пра пакінутыя экспанаты карцінnай галерэі. Пастаянна прыгадвала: каб у той цяжкі час з імі быў вадзіцель грузавой машыны, можа, атрымалася б вывезці хаця б самае каштоўнае... Усё гэта падштурхнула Алену Васільеўну пайсці вучыцца... на шафёрскія курсы. Хутка яна атрымала пасведчанне вадзіцеля 3-га класа. І тут жа ёй прапанавалі пасаду намесніка дырэктара Саратаўскага мастацкага музея імя Радзішчава. А потым і Мікалая Ільіча ўключылі ў штат эвакуіраванай Маскоўскай кансерваторыі. Аладавы сталі атрымліваць зарплату, харчовыя карткі, у іх з'явілася жыллё...

ЧАМАДАН, ПОЎНЫ ГРОШАЙ

У маі 1944 года Саўнаркам БССР выдаў пастанову аб аднаўленні Дзяржаўнай карцінnай галерэі БССР, і Аладавай было даручана ўзначаліць гэтую работу. У лютым 1945 года вагоны з першымі творамі, набытымі для Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР, адправіліся з Масквы ў Мінск...

Памятаючы пра страчаныя ў гады вайны каштоўныя экспанаты, Аладава вырашыла стварыць музей, які па багацці калекцыі не саступаў бы найлепшым музеям Масквы і Ленінграда. І ў яе гэта атрымалася. У 1957 годзе адчыніў свае дзверы Дзяржаўны мастацкі музей БССР — даўнейшая мара і шматгадовы клопат Алены Васільеўны.

У пасляваенныя гады ў Аладавай адкрыўся сапраўдны талент збіральніцы твораў. Яна расшуквала адрасы і доступ у прыватныя калекцыі Масквы і Ленінграда і сама вяла перамовы з уладальнікамі. Гэта былі калекцыі яшчэ дарэвалюцыйных часоў, і састарэлыя гаспадары ці іх нашчадкі звычайна саступалі тую ці іншую карціну настойлівай госці з Мінска. З грашовым разлікам затрымкі не было. Алена Васільеўна здолела ўпэўніць урад рэспублікі вылучыць сродкі на набыццё новых экспанатаў. Хутка за Аладавай замацавалася легенда, што яна «ездзіць па краіне з вялікім чамаданам, поўным грошай». Ёй пачалі пісаць калекцыянеры з усіх куткоў СССР, і яна ездзіла, глядзела, адбірала, купляла... З многімі калекцыянерамі яна цесна кантактавала. Асабліва пасябравала з Лідзіяй Русланавай, у якой купіла 37 палотнаў. Вядомая спявачка называла яе ласкава «Паляшучкай»... Нярэдка, выпраўляючыся ў дарогу па новую карціну ў Маскву ці Ленінград, Алена Васільеўна брала з сабой пачастункі — бруснічнае варэнне, пірагі, настойкі, засмажаныя кумпякі, а часам проста мех бульбы...

Пакінуўшы дырэктарскую пасаду, Алена Васільеўна Аладава да апошняга свайго дня, 29 мая 1986 года, працавала кансультантам музея, без якога не магла жыць...

— Аснову калекцыі складалі творы рускага мастацтва, якое было маміным захапленнем. У яе нават з Караткевічам на гэты конт былі спрэчкі. Уладзімір Сямёнавіч, дарэчы, жыў у суседнім пад'ездзе, так што магчымасці для нефармальных стасункаў былі. Ён казаў: «Добрую справу робіш, што гэта знаходзіш». Гэта наконт таго, што ў маці быў асаблівы накірунак пошуку: яна ў першую чаргу старалася адабраць для музея карціны тых рускіх мастакоў, хто меў беларускія карані або, як Шышкін, пісаў беларускую прыроду... У той час з маміным удзелам быў выдадзены набор паштовак «Рускі жывапіс», дзе былі прадстаўлены рэпрадукцыі менавіта гэтых карцін. Уладзімір Сямёнавіч вельмі абураўся з прычыны пазначанай тут нацыянальнай прыналежнасці мастакоў. На яго думку, трэба было пісаць «Беларускі жывапіс».

Трэба адзначыць, што ў 1960-я гады Алене Васільеўне ўдалося расшукаць і вярнуць з музеяў Масквы, Ленінграда, Паўлаўска, Ноўгарада, Вільнюса шмат экспанатаў даваеннай Дзяржаўнай карцінnай галерэі — тых, за якія так балела душа ў эвакуацыі.

Ужо ў 1946 годзе Аладава арганізавала навуковую экспедыцыю па знаходжанні помнікаў старажытнага беларускага мастацтва. Яе задачай было выявіць і ўзяць на ўлік творы беларускага мастацтва да XIX стагоддзя, якія знаходзяцца ў культавых будынках і музейных зборах у розных рэгіёнах Беларусі. Усяго ў 1950 — 1980-я гады адбылося больш за 100 такіх экспедыцый, у выніку былі знойдзены і выратаваны больш за 2000 помнікаў старажытнабеларускага мастацтва: слуцкія паясы, старажытныя абразы, помнікі алтарнай скульптуры і разьбы, старажытныя кнігі, манускрыпты, вырабы ювелірнага мастацтва і ткацтва, творы народных майстроў...

З пасады дырэктара музея Алена Аладава пайшла ва ўзросце 70 гадоў. Па сутнасці, музей стаў справай яе жыцця. Дарэчы, пакінуўшы дырэктарскую пасаду, Алена Васільеўна Аладава да апошняга свайго дня, 29 мая 1986 года, працавала кансультантам музея, без якога не магла жыць...

— Сёння Алена Аладава вельмі ўшанавана, — гаворыць Радаслава Мікалаеўна. *— З вялікай помпай адзначылі яе 100-гадовы юбілей. Нават вуліцу назвалі — вуліца Аладавых. Але, галоўнае, пасля выхаду кнігі пра маму «Алена Аладава. Музей — яе лёс» шмат хто змог дакрануцца да яе спраў і думак і, спадзяюся, палюбіць яе...*

Тамара БУНТА.

Мікалай і Алена Аладавы з сынамі. 1937 год.

■ Гісторыі з каморы

КЛУМБА ДЛЯ «КВЕТАК ЖЫЦЦЯ»

Многім сучасным бацькам, напэўна, здаецца, што дзіцячыя садкі існавалі заўжды і галоўная праблема толькі ў тым, як туды «прабіцца». Між тым у шэрагу адукацыйных установ яны самыя маладыя, адно слова, што дзіцячыя. Як былі арганізаваны першыя «дзіцячыя кветнікі», каго ў іх прымалі і якія ўспаміны пакідалі ў большасці выхаванцаў? Давайце ўзгадаем!

Дзіцячыя садкі ў датах...

Самую першую ўстанову падобнага кшталту арганізаваў яшчэ ў 1802 годзе ў шатландскім Нью-Ланарку сацыяліст-утапіст Роберт Оўэн. Называлася яна «школай для малых», дзейнічала пры фабрыцы яго цесця і складалася з ясляў для малых ад 1 да 3 гадоў, дашкольнай групы для дзяцей ад 3 да 5 гадоў і пляцоўкі для гульняў. Зрэшты, саму назву «дзіцячы садок» прапанаваў у 1837 годзе прускі педагог Фрыдрых Фробель. На нямецкай мове гэта гучала хоць і дзіўна, але прыгожа — «Кіндэргартэн», бо дзеці, як тлумачыў Фробель, які быў сапраўды таленавітым педагогам і вельмі любіў малых, — гэта кветкі жыцця, што патрабуюць умелага і клапатлівага догляду. А вырошчваннем іх, раскрываючы ўсе таленты і здольнасці кожнага дзіця, мусілі займацца «садоўніцы» — менавіта так называлі першых выхавацелак. Прапанаваная Фробелем ласкавая назва прыжылася.

У Расіі першыя дзіцячыя садкі былі адкрыты ў другой палове XIX стагоддзя. Тут існуе разыходжанне ў меркаваннях, каму аддаць пальму першынства — прадстаўніку заможнага роду горназаводчыкаў Анатолю Дзямідаву, які яшчэ ў 1837 годзе па просьбе сваіх работніц — працуючых маці — стварыў пры Дзямідаўскім доме працалюбства пакоі дзённага знаходжання для больш як 100 дзяцей, можа, прафесарскай жонцы Соф'і Люгебіль з яе цецярбургскім прыватным садком 1863 года «нараджэння» або жонцы ўрача-педыятра, адукаванай паненцы Адэлаідзе Сімановіч з яе платным «кветнікам» для дзяцей заможных бацькоў, дзе малыя, дарэчы, не толькі гулялі і адпачывалі, але таксама вывучалі народную творчасць, працу і побыт сялянства... Зрэшты, абодва садкі праз некалькі гадоў былі зачынены з банальнай прычыны недахопу сродкаў. У 1866 годзе з'явіўся першы бясплатны дзіцячы садок — дабрачынная ўстанова пры «Таварыстве танных кватэр для дзяцей працаўніц Пецярбурга», які даваў маці больш часу для працы, а дзяцей вучыў простым ручным работам. На пачатку XX стагоддзя дзейнічалі ўжо некалькі дзясяткаў разнастайных дзіцячых садкоў: платных і бясплатных, для шляхты, інтэлігенцыі і рабочых, а таксама прытулкі для дзяцей-сірот.

Масавая арганізацыя садкоў пачалася пасля рэвалюцыі 1917 года, каб вызваліць максімальную колькасць неабходных краіне рабочых рук. У лістападзе 1917-га была прынята афіцыйная «Дэкларацыя па дашкольным выхаванні», якая гарантавала бясплатную адукацыю і выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту. Дарэчы, у першыя гады існавання СССР садкі для дзяцей 3—7 гадоў і яслі для немаўлят ад 2 (!) месяцаў да 3 гадоў існавалі асобна: першымі займаліся ведамствы народнай адукацыі, другімі — органы аховы здароўя. Працэс рэарганізацыі ў адзіную ўстанову — яслі-сад — пачаўся значна пазней. Па некаторых звестках, у 1967 годзе дашкольныя ўстановы ў СССР наведвалі ўжо звыш 9 мільёнаў дзяцей. Праўда, месца ў садку і тады было дэфіцытам, асабліва ў сельскай мясцовасці, дзе іх было ў некалькі разоў менш, чым у гарадах. З мэтай паляпшэння сітуацыі ўрад распрацаваў вялізную праграму падтрымкі дашкольных установ на вёсцы. Тады нават існаваў лозунг: «Кожнаму калгасу — дзіцячы садок!» Затое пазней, калі будаўніцтва новых садкоў не паспявала за дэмаграфічнымі ўсплёскамі, была прынята процілеглая стратэгія — вызваліць жанчын ад працы на больш працяглы тэрмін, каб «разгрузіць» садкі. Тады і з'явіўся беспрэцэдэнтны для іншых краін свету водпуск па доглядзе дзіцяці спачатку да года, а потым ажно да 3 гадоў.

Садок на прагулцы, 1931 год.

Марыя Мантэсоры з выхаванцамі.

Дарэчы

Больш як стагоддзе таму, у 1907 годзе, адкрыла свой садок для дзяцей рабочых у Рыме знакаміты педагог Марыя Мантэсоры. Распрацаваныя ёй метады дашкольнай педагогікі карыстаюцца папулярнасцю і сёння.

Садок на ўскраіне Масквы, 1949 год. Дарэчы, у той час была прынята пастанова, паводле якой адзінокія маці, што атрымлівалі сярэдні і нізкі заробак, плацілі за садок толькі 50% выдаткаў.

...і ўспамінах

Як прыгадваюць гарадскія жыхары, у 1960—1970 гады мінулага стагоддзя садкі для працуючых былі «наша ўсё». «А што рабіць: два месяцы да родаў, два месяцы пасля — і, калі не можаш сабе дазволіць звольніцца ды сядзець дома, даглядаць дзяцей, выходзь на працу! — распавядала яшчэ мая бабуля Роза Іванаўна. — Некаторыя, калі атрымлівалася, нейкім чынам цягнулі час: па чарзе бралі водпуск маці, бацька, бабулі і дзядулі, але бліжэй да года практычна ўсе дзеці трапляліў садок. Там і хадзіць вучыліся, і гаварыць: не ўмееш карыстацца гаршком — калектыў навучыць, не любіш манную кашу — калектыў прымусіць...»

«Я садок ненавідзела. Не проста не любіла, а без перабольшання — ненавідзела! — эмацыйна прызналася мая добрая знаёмая, якой крыху менш за 40. — За тое, што прымушалі днём спаць усіх без разбору і без угавораў, толькі пад прымусам, за тое, што, па меркаванні нашай выхавацелькі, трэба было абавязкова даесці ўсё, што ляжыць у талерцы, за «любімы» педагагічны метад — ставіць у кут... Толькі ў старэйшай групе, калі ў нас памянялася выхавацелька, я нарэшце адчула і харство ранішнікаў, і цікавасць да вырабаў сваімі рукамі (падарункаў маме), і нават з тушанай капустай нейкім чынам прымірылася. І свайго сына я ў садок не павяду, пакуль буду мець магчымасць альтэрнатыўных формаў адукацыі — бабулі, нянькі і г.д.»

Вялікім попытам ужо тады карысталіся кругласутачныя садкі — так званая «пяцідзёнка» для дзяцей прадстаўнікоў тых прафесій, хто працаваў у начныя змены або мусіў часта ездзіць у камандзіроўкі. Малых адводзілі туды з раніцы панядзелка да вечара пятніцы. Менавіта ў такі садок, калі памятаеце, трапіў на «перавыхаванне» герой фільма «Вусаты нянь», пра яго ж узгадвае гераіня Людмілы Гурчанкі ў кінастужцы «Любімая жанчына механіка Гаўрылава»: «У мяне няні не было, я на пяцідзёнцы расла...» Захаваліся яны і да сёння, хоць у значна меншай колькасці. І, нягледзячы на неадназначнае стаўленне сучаснікаў, тыя савецкія дзеці, хто наведваў «пяцідзёнкі», узгадваюць пра іх чамусьці з цеплынёй... «Я практычна выросла ў такім садку, — прызналася неяк знаёмая медсястра, — і не памятаю ніякіх асаблівых жахаў. Наадварот, мне здаецца, дзякуючы садку я вельмі рана стала самастойнай. Цяпер часам вельмі смешна слухаць, як маладыя бацькі выхваляюцца: «Майму сыну чатыры, а ён ужо чытае!» Мне выхавацелька давярала чытаць групе вершы ўслых дзесьці з 3,5 года. Дый хварэлі мы значна радзей, чым сучасныя дзеці, не было такога, што тыдзень у садку — два тыдні на бальнічным, загартоўка праходзіла хутка».

А яшчэ, прыгадваючы ўсё той жа фільм «Вусаты нянь» і вершы Маршака ды іншых савецкіх дзіцячых паэтаў, сучаснікі са здзіўленнем даведваюцца, што летам многія савецкія садкі... выязджалі на ўласныя дачы! Гэта, сапраўды, не мастацкае перабольшанне, а звычайная некалі практыка. «Прыкладна ў 1972—1974 гадах мы выязджалі ўсім ведамасным садком на дачу: бацькі спакойна працавалі ў горадзе, наведваючы нас раз на два тыдні, а садок у гэты час рамантавалі. Што мы рабілі? Як усе дзеці — насіліся, гарэзілі, сварыліся і мірыліся, каталіся на веласіпедах, — з замілаваннем у голасе распавядае цяперашні інжынер Сяргей Канстанцінавіч. — Вядома, былі і «дамашнія» дзеткі, якім цяжка было амаль 12 тыдняў знаходзіцца без бацькоў, тыя і плакалі, і капрызнічалі, але нам пашанцавала з нянечкамі і выхавацелямі: яны заўжды знаходзілі, на што пераключыць увагу такіх сумных малых. Як шкада, што ў маіх дзяцей і тым больш унукаў ужо няма такой магчымасці!» Зрэшты, ходзяць чуткі, што ў некаторых асабліва «моцных» ведамасных садках (прынамсі ў Расіі), гэта традыцыя захавалася, але ці праўда гэта, ці рэшткі настальгіі ўжо дарослых «савецкіх дзяцей» — так адразу і не вызначыць...

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Вясковы садок, 1970 год.

БОЛЬШ, ЧЫМ ПРОСТА ПРЫТУЛАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Аляксандр Анатольевіч профіль дзейнасці не змяняў: працягнуў працу майстра-рамонтніка, якім ён быў пры лясным тэхнікуме ў Данецку, рабочым на мясцовай піларараме. Антон, што працаваў да вайны на цагляным заводзе, цяпер падсобны рабочы ў турэцкай будаўнічай брыгадзе.

Падчас уборачнай Каця, якая дома працавала ў рэстаране чэшскага бровара, уладкавалася ў сталовую і развозіла абеды на поле. У верасні гарачая пара скончылася, а разам з ёй знікла і месца працы. Дзяўчына паехала ў Мінск, але знайсці месца па спецыяльнасці не ўдалося, і яна накіравалася ў Навагрудак на швейную фабрыку. Жыве ў інтэрнаце, атрымлівае няшмат, тым больш што аплата тут здзельная і залежыць ад колькасці пашытага, а ў гэтым месяцы ўвогуле абяцалі выдаць грошы «натурай». Але вешаць нос яна не збіраецца, бо памятае, што заўсёды знойдзецца выйсце.

ЗБЕГЧЫ АД ВАЙНЫ, КАБ... ЗНАЙСЦІ СЯМ'Ю

Нягледзячы на ўсе перажытыя жахі, сям'я ўладкоўваецца на новым месцы. А летам у Лондараў чакаецца папаўненне. Антон знайшоў дзяўчыну па сэрцы і праз два тыдні пасля знаёмства пераехаў да яе жыць.

— Мы пазнаёміліся з Вольгай у сельсавеце: яна працавала там прыбіральшчыцай, а наша брыгада займалася рамонтам. Запрасіла мяне на пірагі, дарэчы, вельмі смачныя. Да таго ж бацька сказаў, што «калі добра гатуе, то і нявестка добрая будзе», вось я і пайшоў да яе, — жартуе Антон. — Шкада толькі, што проста зараз мы не можам ажаніцца, праз мой украінскі пашпарт, бо я маю ў Беларусі часовую рэгістрацыю. Толькі ў жніўні, напэўна, нам усім афармяць пасведчанне на права жыхарства. Але гэта не перашкаджае чакаць немаўля.

Як сказала па сакрэце будучая свякроў, Вольга доўга не магла зацяжарыць, і з гэтай прычыны не склаліся яе мінулыя сямейныя адносіны, а тут не прайшло і месяца, як усё атрымалася. Напэўна, лёс. Дарэчы, Святлана ўпэўнена (па народных прыкметах), што будзе дзяўчынка. Сямейства радасна рыхтуецца да прыемных клопатаў.

Я ЗАСТАЮСЯ Ў БЕЛАРУСІ

Вяртацца назад сям'я Лондар не збіраецца, хоць там і засталіся бацькі Аляксандра Анатольевіча, якіх даглядае яго сястра і іншыя родныя.

— Маім бацькам ужо восьмы дзясятак: у такім узросце яны нізавошта нікуды б не паехалі. Яны ў Луганску разам з маёй сястрой, якая ўсё жыццё з імі і цяпер засталася, хоць яе сын падаўся ў Расію, — расказвае гаспадар. — Ім там вельмі цяжка. Сястра трохі ходзіць на працу, грошы нерэгулярныя, але гэта хоць штосьці больш-менш стабільнае. Пенсіі таксама даўно не плацяць, і мае старыя ўжо «праелі» свае «смяротныя», бо цэны на ўсё проста жахлівыя. Тым не менш, мы падтрымліваем сувязь праз сацыяльныя сеткі, калі ў іх працуе інтэрнэт, а старэйшаму сыну час ад часу тэлефануем на мабільны.

— У мяне ва Украіне застаўся малады чалавек, і я вельмі хачу, каб ён прыехаў сюды, — марыць Каця. — Цяпер спрабую адшукаць яму тут жыллё і працу, мы кожны дзень размаўляем праз скайп, плануем нашу сустрэчу і марым, што будзем жыць у Беларусі разам.

— Я дамовіўся з братам — буду даглядаць нашых бацькоў, так што я там, дзе яны. Тым больш што ў мяне тут ужо стварылася свая сям'я, я нясу адказнасць яшчэ і за іх. Застаюся ў Беларусі, — выказваецца Антон.

— Чым бы ні скончылася вайна: застанецца Украіна адзінай або распадзецца на аўтаноміі — вяртаючыся туды, трэба мець «залаты» запас, каб узняцца на ногі, а яго ў нас няма, — разважае Святлана. — Любая ўлада найперш пачне аднаўляць заводы, бальніцы, школы і садкі. Калі там яшчэ дойдзе чарга да будынкаў, тым больш у сёлах... Не адна пяцігодка пройдзе, перш чым усё наладзіцца. Спачатку я вельмі імкнулася назад, потым успамінала, што дома ўжо няма, спынялася, старалася змірыцца. Кажуць, што на любой працы, якой бы цяжкай яна ні была, калі пратрымаешся паўгода, так і звыкнешся, і застанешся. Так і тут — мы свае паўгода ў Беларусі ўжо пражылі, тут і застанемся ўжо назаўсёды.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

■ Асабістае

СЁСТРЫ



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

–МАНЯ!.. Ма-а-ня!.. — раз-пораз клікала баба Ганна.

— Што? Тут я. На, патрымай маю руку. Што ты хочаш?— адазвалася Маня, задаволеная, што Ганна кліча не кагосьці з сясцёр, а менавіта яе.

Чула ці не баба Ганна сястрыны словы ў адказ — невядома, але кліч паўтараўся між цяжкімі стогнамі. Час ад часу яна прасіла вады, але, цяжка глынуўшы, вымаўляла з доляй расчаравання, што гэта не вада. І зноў, і зноў прасіла хоць кроплю вады — сапраўднай, з калодзежа.

Унучка Ліда была ўзрушана станам бабулі Ганны — дзедавай сястры, ёй было так яе шкада, так балюча, што бабуля трызніць, але плакаць маладзіца не магла, бо побач сядзелі яшчэ тры сястры Мані і Ганны і «расколвалі» скнару Маню на пляшку віна. Маня, на дзіва, адгукнулася адразу, дастала пляшку, прынесла гуркоў з селядцом і халоднай бульбай. Жанчыны запрасілі да стала і Ліду, але яна так паглядзела на іх, што тыя не сталі настойваць, адвярнуліся і пачалі наліваць свае чаркі.

Часам, калі стогны бабы Ганны заціхалі і твар яе, здавалася, прасвятляўся, яна прасілася то дадому, то на вуліцу, на сонца.

Яна і была, і яе ўжо не было. Баба Ганна паміралa...

А памірaць Ганна лягла дзён сорак таму. Акурат тады яна з сястрой Маняй стала надта не ладзіць. Бацькоўская хата быццам стала цеснай для адзінокіх жанчын, лёс якіх вырашыла вайна.

МАНЯ была малодшай у шматдзетнай сям'і, ды пасля вайны жаніхоў усім не хапіла, і яна так і засталася векавухай. Яе ў час вайны хацелі забраць на прымусовыя работы ў Германію, але па просьбе маці замест Мані забралі Ганну. Ганне было крыўдна, што маці шкадуе не яе, а сястру, але пярэчыць не стала. Яна ўсю дарогу не піла, не ела і, як і некаторыя дзяўчаты, так нацёрла ногі бітым шклом, што яны крывавілі, і камісію дзяўчына не прайшла. Немцы дазволілі ёй і яшчэ некаторым змарнелым дзяўчатам вярнуцца назад, але Ганна аслабела так, што ледзь-ледзь за тры тыдні датэпала з Баранавіч дадому.

Пасля вайны сталі жанчыны дажываць разам у бацькоўскай хаце. Ганна нянькала Маню, як сваё дзіця. Маня ж была даволі капрызнай і лёгка дабівалася таго, што ёй хацелася. У стравах была пераборлівай, не ела сала, тлустага мяса і дазваляла сястры гатаваць ежу толькі на алеях або на сметанковым масле. Калі Ганна ехала ў горад, Маня заказвала пернікі, цукеркі, але грошай сваіх ні на якія прысмакі не давала. Так яны і жылі: Маня сваю зарплату, а потым пенсію складвала ў панчоху, а на Ганніны грошы выконваліся ўсе пажаданні Мані.

Мужчынскую работу па гаспадарцы і па хаце рабіў адзінокім сёстрам брат з хлопцамі сваімі, які таксама жыў на сяле. Ён, франтавік, Ганне быў асабліва дарагі. На 9 Мая штогод яна апранала найлепшую спадніцу і хустку, каб урачыста падзякаваць брату за Перамогу, за тое, што выжыў. За дапамогу брата па гаспадарцы адзінокія сёстры дапамагалі на братавым бульбяным полі ці на сенакосе. Ганна любіла ўсіх дзяцей сваіх замужніх старэйшых сясцер, але братавы дзеці былі для Ганны яе дзецьмі. Яна падхоплівалася з лаўкі, калі брат казаў каторамy нарваць зелля для свіней ці прынесці дроў у хату. Яна ў кожны свой прыход старалася прынесці аладку, піражок ці, расшпіліўшы шпільку на кішэні, даставала адтуль замуленую карамельку ці пернік для каго з дзяцей. Яна ж упіхвала рублік ці два кожны раз перад ад'ездам на вучобу каторамy са студэнтаў.

Маня таксама дапамагала брату, але работа яе была маруднай, бы дзіцячай. Маніны соткі і садзіліся, і капаліся з братавымі дзецьмі.

Можна сказаць, што дзве гэтыя жанчыны ўваходзілі ў сям'ю брата і з часам усе настолькі прывыклі да такога распарадку жыцця, што сям'я і снедаць не пачынала, пакуль у двары не з'явіцца дзве сухенькія постаці жанчын.

ТАК яны жылі дружна і мірна да «абвалу» грошай. Маня ў тыя дні развалу краіны ледзь не страціла розум, бо ў яе, аказалася, матрац быў напакаваны адборнымі і хрусткімі купюрамі. Частку грошай тады ёй дапамагла абмяняць братава дачка, але большая частка стала нікому не патрэбнымі паперкамі. Маня стала знерваванай, яшчэ больш капрызнай і невыносная, не пускала сястру начаваць, праклінала на чым свет стаіць. І адноічы Ганну ахапіў адчай. Яна лягла на ложак і перастала гаварыць і есці. Маня з нецярплівасцю чакала, калі сястра вызваліць ёй хату, радавалася, марачы, што адна зажыве шчасліва. Час ішоў, а здаровы арганізм Ганны не хацеў здавацца. Яна ляжала, стагнала на жалезным ложку, на падушцы без навалачкі, на кляёнцы, накрытай анучай, калі наведаўся ў гэту хату брат. Ніхто не ведае, што ён сказаў Мані, але дома брат-франтавік упершыню плакаў. З таго дня ён з жонкай кожны вечар хадзіў да Ганны, дапамагаў пераварочваць страшнае ад пролежняў сухое цела, каб змазаць яго. Ганна крычала ад болю і толькі праз некалькі гадзін супакойвалася. Праз некалькі дзён яна ўпала ў забыццё, не пазнавала нікога і ўсё клікала... Маню.

...Памерла Ганна ранкам на наступны дзень, як да яе прыходзілі сёстры і Ліда. Яна ляжала на лаве ціхая, супакоеная і нават... прыгожая. Па ёй многа плакалі, шкадавалі родныя, аднавяскоўцы, суседзі. Вячэру зрабілі добрую, было ўсе як у людзей, але Ліда ўсе здавалася, што Бог не даруе ёй смерці бабулі Ганны, што яна вінаватая, бо не адчула, як той было адзінока, бо не было каму пашкадаваць, проста прыціснуць худзенькія і, як раптам усвядоміласа, такія дарагія плечы.

Пасля пахавання Ганны Маня засталася ў хаце адна. Як марыла. Да брата спачатку не хадзіла, відаць, баялася яго гневу, але ў хуткім часе стала прыходзіць і скардзіцца, што ёй не даюць спаць розныя ведзьмы, якія тупацяць па хаце і робяць, што хочуць... Потым яна стала палохацца свайго адлюстравання ў люстэрку...

УСЕ разумелі, што Маня перастала сябраваць з галавой і трэба тэрмінова прымаць меры, а то яшчэ наробіць бяды ці наогул спаліць хату. Пытанне, хто забярэ Маню да сябе, павісла ў паветры. Сёстры — а іх жыло ў вёсцы па-ранейшаму тры — па чарзе адмовіліся ад Мані: маўляў, няма куды яе браць, свае дзеці... А брата, пакуль ішлі дэбаты, раптам прыкаваў да ложка інсульт. Яго з жонкай на зіму дзеці забралі ў горад, а Маню, як адзінокую, афармілі ў дом састарэлых.

Наведвалі яе зноў жа братавы дзеці. Маня радавалася іх прыезду, прагна ела хлеб з каўбасою, хавала пернікі ў кішэні і скардзілася, што суседкі па пакоі ўсё ў яе адбіраюць. Прасіла прыязджаць яшчэ... Яе абяцалі забраць. І планавалі зрабіць гэта летам.

Маня доўга чакала ля акна. Не ела амаль месяц, а ў канцы чэрвеня... памерла. Абмывалі яе санітаркі, а хаваць братавы дзеці прывезлі дадому.

Ліда ў дзень пахавання якраз была ў бацькоў і прыйшла развітацца з бабуляй Маняй. Такая ж схуднелая, як некалі Ганна, ляжала Маня ў труне. Яе цяжка было пазнаць... І непрыязнасць да бабы Мані за бабу Ганну раптам адступіла...

...Колькі гадоў прайшло з таго часу, ніхто ўжо і не лічыць, а Ліда і цяпер моліцца за гэтых дзвюх жанчын. Каб іх адзінокія душы знайшлі спакой на небе і Бог дараваў усім сваякам грэх за іх несагрэтую старасць.

Валянціна БОБРЫК,
г. Івацэвічы.

■ Выхаванне пачуццяў

НА ДОБРУЮ ПАМЯЦЬ

...Ручка была трафейная, нямецкая — з залатым пяром, з наканечнікам. Маша (а ў сям'і — Марылька) ведала, што вось такой ні ў кога няма ні ў школе, ні ва ўсім пасёлку! Як жа было ўтрымацца, як было не пахваліцца ёю ў класе? Таму, злавіўшы момант, калі ў хаце засталася адна (бацька паехаў у Гомель са справаздачай, маці пайшла даіць карову), Маша-Марылька зайшла ў залу, узяла ключык ад шуфлядкі, у якой бацькі захоўвалі дакументы ды іншыя свае каштоўнасці, адамкнула яе, дастала прадаўгаватую пушачку.

«З ручкай жа нічога не станецца, — разважала дзяўчынка. — Я толькі пакажу яе, каб усе паглядзелі, а потым пакладу назад... Дома ніхто і не заўважыць».

У школу, на другі канец пасёлка, яна даляцела птушкай.

— Я прынесла! Вось тая ручка! — крыкнула на ўвесь класс, вымаючы з палатнянай торбы пушачку.

Дзяўчынку тут жа з усіх бакоў абступілі аднакласнікі. Кожны хацеў не проста паглядзець на тую самапіску, але і патрымаць яе ў руках.

Марылька адчувала сябе шчаслівай! Яшчэ б — такая ўвага да яе, да таткавага трафея! Пецька Сазонаў ледзь з рук не вырваў.

...Апошні ўрок, урок фізкультуры, праходзіў на стадыёне. Перад тым, як пайсці туды, Маша паклала ручку ў пушачку, пушачку ў торбачку і пабегла да спартыўных снарадаў. Настрой у яе па-ранейшаму быў цудоўны.

Іншым ён стаў дома, бо, вярнуўшыся, яна перш-наперш хацела вярнуць у шуфлядку ручку, але... Пушачка была на месцы, а вось ручка...

Халадзеючы ад жаху, Марылька абмацала ўсе закуточкі сваёй торбачкі, абмацала кніжкі і сшыткі — пуста.

Позна ўвечары з Гомеля вярнуўся бацька.

— Ну, што ў нас новага? — стаў распытваць, адорваючы ўсіх гасцінцамі.

Маці, здаецца, нешта казала яму, але ён не вельмі і слухаў:

— Дачушка, ты што — двойку адхапіла? — звярнуўся ён да Марылькі.

Тая адмоўна пакруціла галавой і ажно зайшлася ад плачу.

Бацька, пачуўшы, у чым справа, пайшоў у залу правяраць шуфлядку. Дакументы і ўсе астатнія рэчы былі на месцы, ручка і сапраўды знікла.

Назаўтра з самага ранку ён разам з дачкой пайшоў у школу. Завітаў да дырэктара. Усе разам яны абшукалі, здаецца, усе куточкі, куды магла «закаціцца» ручка.

— Дзеці, можа, хто з вас знайшоў яе? — пытаўся бацька ў Марыльчыных аднакласнікаў. — А можа, хто ўзяў?.. Незнарок. Тады аддайце, прашу вас! Бо гэта не проста ручка... І рэч не ў тым, што яна з залатым пяром, — бацька Марылькі цяжка ўздыхнуў. — Яна — падарунак майго франтавога сябра. Ён на добрую памяць аддаў мне ручку, а я яму — свой гадзіннік... Мы стаялі ў штабе, ля акна. Я адступіў усяго на хвілінку... Ён заняў маё месца — і ўсё. Яго забіла напавал, відаць, снайперскай куляй... Ён загінуў замест мяне, разумееце?

У класе, дзе сядзелі трыццаць два першакласнікі і трое дарослых, цішыня стаяла мёртвая.

Потым нешта гаварыў дырэктар школы, настаўніца, але Маша амаль нічога не чула: яна плакала. Ёй неймаверна шкада было таго невядомага сябра, які разам з бацькам прайшоў усю вайну і загінуў у апошнія дні. Ёй сорамна было, што гэта праз яе выхваляннe тата страціў такі падарунак!

Аднак дзягу з цвіка ён не зняў... І на дачку зусім не сварыўся. Яна і без таго, неяк раптам пасталеўшы, усё зразумела...

Раіса ДЗЕЙКУН,
г. Гомель.

■ Фотаздымак з гісторыяй

БАЦЬКАЎ ЛЁС

Слова «вайна» для ўсіх гучыць па-рознаму. Для адных, пераважна прадстаўнікоў маладога пакалення, — гэта кадры старой кінахронікі і ўражлівыя экспанаты з музея гісторыі Вялікай Айчыннай, для іншых — уласныя шчымлівыя ўспаміны, дзе горыч па загінулых цесна пераплялася з радасцю сустрэчы родных, сяброў, аднавяскоўцаў, якія вярнуліся з фронту...

«Вялікая Айчынная вайна не абышла і нашу сям'ю, — піша ў сваім лісце наш даўні чытач і падпісчык з 30-гадовым «стажам» **Іван Лычкоўскі з Баранавічаў.** — Майго бацьку, Івана Патапавіча Лычкоўскага, 1912 года нараджэння, як адукаванага (яшчэ да вайны ён скончыў Рагачоўскі настаўніцкі інстытут), але не маючага вайсковай падрыхтоўкі ў 1939 годзе прызвалі на тэрміновую службу. Фотаздымак, дарэчы, зроблены якраз у гэтым годзе.

Армія, у склад якой уваходзіла 10-я Чырванасцяжная стралковая дывізія, дзе служыў бацька, знаходзілася ў той час у Латвіі. Прыбалтыйскія дзяржавы, паводле вядомага пакта Молатава-Рыбентропа, толькі што ўвайшлі ў СССР — мяжа Савецкага Саюза пасунулася на захад, і дывізію ў сувязі з гэтым перакінулі і размясцілі ўздоўж новай мяжы. Там пачалі ўзводзіць абарончы рубеж (папярэдне ўзарваўшы па незразумела чыёй камандзе абарончы рубеж на старой мяжы), таму 22 чэрвеня дывізія прыняла бой практычна на роўным месцы.

Для бацькі вайна пачалася якраз гэтым днём, у 4 раніцы, калі блізкім разрывам авіябомбы вынесла акно ў казарме і яго, засыпанага шклом, знесла на падлогу. Немцы дакладна ведалі, што бамбяць штаб дывізіі, таму неўзабаве кіраванне было згублена, абарона ж уяўляла сабой не суцэльную лінію, а асобныя ўчасткі — і досыць хутка савецкія войскі вымушаны былі адступіць...

Адступленне працягвалася. Пад Рыгай рэшткі дывізіі былі акружаны і пасля ўпартага бою трапілі ў палон. Для іх пачалося жыццё, поўнае здзекаў, допытаў і катаванняў... Баракаў, як узгадваў бацька, на ўсіх не хапала, і палонных размяшчалі ў адкрытым полі, абгарадзіўшы тэрыторыю калючым дротам у некалькі радоў. Лета заканчвалася, і, каб хоць неяк сагрэцца, людзі па начах збіваліся ў вялізныя «табуны». Многія з палонных кашлялі, слабелі і дрэнна спраўляліся з дзённымі працамі, сілы для якіх ледзь-ледзь падтрымлівала пустая баланда з некалькімі лісткамі капусты ды парай жменяў панцаку на ўвесь кацёл. Тых, хто зусім знясільваў, немцы забіралі з лагера, і іх ніхто ўжо больш не бачыў.

На валаску ад смерці аказаўся і бацька, у якога, мяркуючы па сімптомах, пачалася дызентэрыя. Даведзены да адчаю, ён падышоў жа пажылога ахоўніка, зняў апошнюю каштоўную рэч — наручны гадзіннік «Кіраўскі», які невядома якім цудам пры вобыску не забралі, — і, як мог, жэстамі патлумачыў, што хворы і просіць за гадзіннік прынесці бохан хлеба. Той зразумеў, сказаў: «Гут». А назаўтра прынёс хлеб, які бацька ўмудрыўся разламаць і разрэзаць, высушыць і цягам некалькіх дзён харчавацца толькі гэтымі самаробнымі сухарамі. Магчыма, гэта яго і выратавала — хвароба адступіла.

За час палону бацьку некалькі разоў пераводзілі з аднаго лагера ў іншы, і падчас аднаго з такіх пераходаў ён разам з сябрамі вырашыў бегчы. Дачакаўшыся, калі дарога пайшла праз лес, яны кінуліся наўцёкі, а за імі пабеглі яшчэ некалькі ваеннапалонных. Для аховы гэта стала нечаканасцю, і хоць немцы хутка ачомаліся і сталі страляць, кулі нікога са збеглых не зачапілі. Блукаючы па лесе, яны выйшлі на край поля, дзе працавала нейкая жанчына. Асцярожна загаварылі з ёй — аказалася, гэта руская, вывезеная на прымусовыя работы, а ў найбліжэйшай вёсцы месцяцца яшчэ французскія ваеннапалонныя. Уцекачы таемна папрасіліся да французаў у лагер пад выглядам «сваіх», але паколькі тых шараніцу і штовечар пералічвалі, на ноч савецкія салдаты мусілі шукаць іншага прытулку... Бацька ўспамінаў, што іх сустрэлі ветліва, тут жа пераапранулі і далі берэты на галаву, толькі што заўважылі, маўляў, усё адно не вельмі падобны да француза, а вось яго сябар, чарнявы хлопец родам з Украіны, — «амаль сапраўдны». Беглыя цэлы месяц прабылі ў французскім лагеры, дзе і ўмовы ўтрымання, і харчаванне былі зусім іншымі — на абед палонным давалі нават па 20 грамаў масла, якое па форме і аб'ёме нагадвала пачак ад запалак...

Але фронт набліжаўся, і французскіх палонных сталі рыхтаваць для перасылкі ўглыб Германіі, таму бацьку з таварышам давялося зноў сыходзіць у лес, дзе яны слухалі грымоты блізкіх баёў, а пры першай магчымасці здаліся савецкім войскам і трапілі ў фільтрацыйны лагер.

Дахаты тата вярнуўся толькі ў верасні 1945 года. Паколькі ўсю вайну пра яго нічога не было вядома, родзічы лічылі яго без вестак прапаўшым, а ў бацькоўскім доме жылі яго старэйшы брат з трыма дзецьмі і малодшая сястра — удава кадравага ваеннага з двума малалетнімі сынамі. Да гонару жыхароў гэтай вёскі, у час акупацыі ніхто з

іх не выдаў немцам, што тут жыве сям'я савецкага афіцэра.

Бацька адшукаў маму, якая разам з маёй бабуляй знаходзілася ў эвакуацыі ў Мардовіі і працавала ў школе, вырашылі ехаць разам на яе малую радзіму, у Баранавіцкую вобласць. У былым Гарадзішчанскім раёне тату прапанавалі ўзначаліць тады сямігадовую Сталовіцкую школу, што размяшчалася ў дзвюх драўляных будынінах, а малодшыя класы наогул былі раскіданы па ўсёй вёсцы ў арандаваных у людзей памяшканнях. Пры бацьку ў 1953 годзе ўзвялі новы — двухпавярховы, цагляны — школьны будынак, з электрычным асвятленнем замест ранейшых газовак з абажурамі, развешанымі пад столлю, з прасторнымі класамі. У 1956 годзе адбыўся першы школьны выпуск, а сама яна выросла з сямігодкі да сярэдняй. У гэтай школе мае бацькі і працавалі ўсё жыццё, аж да выхаду на пенсію...»

* * *

Паважаныя чытачы! Другі сезон рэдакцыйнага конкурсу «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.

5 ФІЛЬМАЎ

для прагляду ў сямейным коле

Марына КАРАЛЕВІЧ, хатняя гаспадыня, маці траіх дзяцей:

1 «Папялушка». Тая самая, старая-старая, яшчэ чорна-белая савецкая кінаказка. Зрэшты, гэта мне яна мілая ў чорна-белай версіі, а калі вам падабаецца колер — смела выбірайце расфарбаваны, крыху «дыснееўскі» варыянт. Нягледзячы на ўзрост фільма, у ім гучаць вельмі мудрыя рэчы, у прыватнасці пра тое, як важна своечасова атрымаць пахвалу, калі ты яе заслугоўваеш, і пра тое, што «ніякія сувязі не зробяць ножку маленькай, а сэрца — вялікім»... Рэчы, якія мы ўсе як быццам ведаем, але іх, я ўпэўнена, ніколі не лішне паўтарыць яшчэ раз.

2 Мультфільм «Ледавіковы перыяд». Я параіла б паглядзець менавіта першую, самую раннюю, частку гэтай гісторыі, можа, не самую камерцыйна паспяховую, але, на мой погляд, самую шчырую і кранальную. Сюжэт празрысты і зразумелы дзецям любога ўзросту, жарты бяскрыўдныя і без усялякага двайнога сэнсу, а пасыл каштоўнасці сапраўднага сяброўства і ўзаемавыручкі не надакучліва павучальны, а вельмі натуральны.

3 «Мэры Попінс, да пабачэння!». Нам часта здараецца, быццам мы ведаем, што патрэбна нашым дзецям, лепш за іх саміх. Вось і я трапіла ў падобную пастку з гэтым фільмам. Мне здавалася — ды не, я была абсалютна ўпэўнена! — што сучасныя дзеці 12, 9 і 5 гадоў глядзець падобнае не будуць, ім давай мультфільмы пра Вінкс і камп'ютарныя гульні. Тым больш вялікім і прыемным было здзіўленне, калі аднойчы я, звярнуўшы ўвагу на незвычайную цішыню, знайшла сваіх гарэз утопленымі ў экран тэлевізара, дзе якраз ішла «Мэры Попінс». Хоць, напэўна, ніякага цуду тут няма: мабыць, усе дзеці мараць мець побач дарослага — блізкага сябра, які іх разумее і з якім кожны дзень будзе поўны цікавых і добрых прыгод.

4 «Хаціка: самы верны сябар». Абсалютна неабходная прышчэпка ад жорсткасці і чэрствасці. У маім дзяцінстве гэта быў фільм «Белы Бім, чорнае вуха», пасля якога, напэўна, не адна тысяча савецкіх дзяцей плакала ў падушкі. Амерыканскі фільм не такі пранізліва страшны, але ўсё адно трагічны, праўдзівы, сентыментальны і каштоўны. Так, гэта слёзы, але яны ачышчаюць душу, вучаць суперажыванню і прымушаюць пераглядзець сістэму каштоўнасцяў... Дарэчы, неўзабаве пасля прагляду гэтага фільма ў нашай сям'і з'явіўся сабака, на якога ўсе дзеці нарадавацца не могуць.

5 «Прыгоды Падзінгтана». Літаральна нядаўняе наша кінаадкрыццё — гісторыя забаўнага мядзведзяняці Падзінгтана, вялікага ахвотніка да мармеладу, які прыехаў з Перу ў Еўропу, каб стаць сапраўдным брытанскім джэнтльменам і знайсці новую сям'ю. Пяшчотнае, смешнае і вельмі брытанскае кіно — без усялякіх навамодных паглыбленняў у «змрочную рэальнасць», проста казка, якую варта паглядзець.

Па якой сцяжынцы мама-качка прыплыве да качанят?

Расфарбуй яе.



Балбатухі

Дзве балбочуць балбатухі.
І гудуць яны, як мухі.
Стаяць разам ля бярозы
І стракочуць, як стакозы.
І гагочуць, быццам гусі,
І качаюцца на пузе,
Зубы скаляць, як бабры
І пішчаць, як камары,
І балбочуць, і балбочуць,
І дадому йсці не хочуць,
І лятаюць, як сарокі,
І забылі пра урокі.

Закрычалі крумкачы:
«Балбачы, не балбачы —
Дзеткам трэба спаць уначы!»

3D малюнак



Знайдзіце 10 адрозненняў



Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.



Гучыць, як музыка: «Нафтан», БМЗ, АЭС...

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Родам са Слуцка. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Атрымаў накіраванне ў Наваполацк і пачынаў у «Прамналадцы». Праз некаторы час перайшоў у «Белсантэхмантаж» майстрам. Шэсць гадоў адпрацаваў начальнікам участка падрыхтоўкі вытворчасці, шаснаццаць — галоўным інжынерам. Пятнаццаты год паспяхова кіруе калектывам.

Такі паслужны спіс робіць гонар любому калектыву: удзел у аднаўленні разбуранага землятрусам Кіравакана ў Арменіі, дзясяткі ўзведзеных аб'ектаў у Пыталаўскім раёне на Пскоўшчыне, амаль тры сотні дамоў для перасяленцаў пасля аварыі на ЧАЭС... І ўсё ж самы прыкметны «ордэн» на грудзях — Нафтаград.

Вам даводзілася чуць, каб адно будаўнічае ўпраўленне магло запісаць у свой актыў амаль цалкам такі горад-прыгажун, як Наваполацк? Гэта сапраўды ўнікальны выпадак: фактычна ўвесь яго жылы фонд узведзены з непасрэдным удзелам Наваполацкага мантажнага ўпраўлення. Яно з'яўляецца філіялам знакамітага ААТ «Трэст «Белсантэхмантаж» №1» і займаецца мантажом інжынерных сістэм — водаправоду, каналізацыі, цеплавых сетак, кацельных установак, вентыляцыі і кандыцыянавання паветра.

— Сапраўды, галоўная заслуга — «Нафтан», — лічыць кіраўнік калектыву, заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь Міхаіл Эляшэвіч. — Наша ўпраўленне было арганізавана ў 1960 годзе, калі толькі нараджаўся Наваполацк, у асноўным для будаўніцтва аб'ектаў «Нафтана» і «Паліміра», самога горада і яго інфраструктуры. За 55 гадоў існавання ўсе работы пералічанага профілю ў горадзе і на яго прадпрыемствах на 99 працэнтаў выкананы адной арганізацыяй — нашай. Што датычыцца жылля, то ва ўсім горадзе, магчыма, знойдуцца два-тры дамы, якія ўзводзіліся без нашага ўдзелу. Я іх памятаю і магу назваць, бо ва ўпраўленні працую саракавы год.

Праўда, зараз зона нашага дзеяння пашырылася. З таго часу, як у горадзе аб'ёмаў стала не хапаць, працуем у 17 раёнах Віцебскай вобласці, а таксама ў абласным цэнтры. Вось і цяпер занятыя не толькі ў Полацку і Наваполацку (адна брыгада пастаянна задзейнічана на «Нафтане», на бягучым рамонце), але і возім людзей у Віцебск, Бешанковічы, Верхнядзвінск. Працуем на двух аб'ектах у абласным цэнтры і штодня возім людзей.

Паспелі папрацаваць на ўзвядзенні Беларускай атамнай станцыі ў Астраўцы. Летась даволі сур'ёзныя аб'ёмы выканалі ў Мінску: на аквапарку, на басейне Універсітэта фізічнай культуры, узвялі два шматкватэрныя дамы агульнай колькасцю 249 кватэр.

Нашым спецыялістам рады і на Гомельшчыне, у прыватнасці на «Гомельдрэве». А на Беларускім металургічным заводзе ў Жлобіне будуецца новы пракатны стан, і мы ўжо чатыры месяцы выконваем мантаж трубаправодаў, параправодаў. Патэнцыял нашага ўпраўлення значна перавышае ўсё, што нам могуць прапанаваць на Віцебшчыне, і даводзіцца шукаць работу па ўсёй краіне.

Калі гаварыць пра вынікі мінулага года, то ён быў вельмі складаным — менавіта з прычыны адсутнасці паўнавартаснага партфеля заказаў. І толькі дзякуючы сваёй мабільнасці справіліся з усімі паказчыкамі. Аб'ём работ летась склаў 118,4 мільярда рублёў на 200 працуючых, пры гэтым прадукцыйнасць працы па рэалізацыі — 613,7 мільёна на аднаго працуючага. Рэнтабельнасць — больш за 10 працэнтаў, атрыманы нармальны прыбытак. Зарплата — вартая, і людзі ад нас практычна не звальняюцца. Такіх вынікаў змаглі дасягнуць намаганнямі ўсяго калектыву. Усё, што зроблена, — агульная заслуга.

У нас, як ні ў каго іншага, за апошнія 15-20 гадоў змянілася тэхналогія выканання работ. Калі раней усе інжынерныя камунікацыі выконваліся са сталёвых труб, то зараз практычна на 80-90 працэнтаў перайшлі на паліморныя матэрыялы. Як і паўсюдна ў Еўропе. Сістэмы ацяплення робяцца з паліморных труб, што дазволіла адмовіцца ад зварных работ і цяжкай фізічнай працы. Водаправоды вырабляем з поліпрапілену, які варыцца элементарнымі прыстасаваннямі. Трубы не ржавеюць, і якасць вады зусім іншая. Практычна гэта вечныя трубаправоды. Усе нашы тэхналогіі адпавядаюць часу.

У сувязі з вандроўным ладам жыцця стараемся забяспечыць людзям належныя бытавыя ўмовы. У нас кожная брыгада мае па два-тры мабільныя бытавыя памяшканні. Нават калі ёй трэба адпрацаваць на аб'екце ўсяго тыдзень, спачатку перамяшчаем туды мабільныя бытоўкі. У іх ёсць усё неабходнае, каб памыцца, пераапрануцца, паесці гарачага. А на аб'ектах брыгады забяспечаны нормакамплектамі, сучаснай тэхнікай і аснасткай — усё гэта дапамагае працаваць эфектыўна.

Упраўленне лічыцца вядучай арганізацыяй нашага профілю не толькі ў горадзе, але і ў рэгіёне, — працягвае свой расповед дырэктар. — Прыемна, што да яго паўсюдна адносяцца з павагай — аўтарытэт высокі. За 55 гадоў калектыў склаўся дружны, высокапрафесійны, лёгкі на пад'ём. А калі мець на ўвазе, што па стажы работы шмат тых, хто адпрацаваў па 40 гадоў і больш, а асноўны касцяк — па 20-30 гадоў, то нам не складана «падцягваць» новых работнікаў да ўзроўню ветэранаў. Навучанне на рабочых месцах — справа патрэбная, бо за апошні час у рабочыя брыгады прыйшла моладзь.

Шмат працоўных дынастый. І калі наш спецыяліст прыводзіць і рэкамендуе на працу сына, спачатку выдаём накіраванне ў базавы ліцэй, дзе хлопец праходзіць першыя «ўніверсітэты». Я палічыў: 50 чалавек з 200 — гэта менавіта прадстаўнікі працоўных дынастый. Як вядома, яны «цэментуюць» любы калектыў.

...Вяртаешся ўвечары з камандзіроўкі дамоў у Наваполацк, і цябе сустракае разлітае мора агнёў. Горад новы, без прыватнага сектара, і першае, што бачыш, — дзясяткі шматпавярховых дамоў у агнях. І з гонарам думаеш: практычна ў кожнай кватэры ўсю сантэхніку зманціравалі мы. Свецяцца агнямі вытворчыя карпусы «Нафтана», «Паліміра», «Вымяральніка», іншых прадпрыемстваў. Таксама наша работа. Вось усім гэтым і ганаруся...

На сцяне дырэктарскага кабінета — сапраўдны «іканастас». Дыплом «Чалавек года Віцебшчыны», дыплом пераможцы конкурсу «За найвышэйшыя дасягненні ў будаўнічай галіне», дыплом «Найлепшы кіраўнік Віцебскай вобласці», россып ганаровых грамат. Што ж, па працы і пашана.

УНП 300041825

Замершчык Аляксандр СЕРГІЕНКА, інжынер Таісія ЗУЕВА, намеснік начальніка вытворчага аддзела Валянцін ЖДАНАЎ.

Прараб Аляксандр БАКАЕЎ і брыгадзір Дзмітрый КРЫСЬКО.

Ад слова «гасціннасць»

Расказвае **дырэктар гасцініцы «Беларусь» у Наваполацку Аляксандр КАЛАЦЕЙ:**

— Гасцініца «Беларусь»— адна са старэйшых у горадзе. Адпавядае ўсім сучасным патрабаванням, і гэта кожны год пацвярджаецца вынікамі сертыфікацыі, якую праводзяць упаўнаважаныя арганізацыі. Юрыдычную самастойнасць мы атрымалі з 1 кастрычніка 2012 года, пасля рэфармавання Наваполацкага КУП ЖКГ і вылучэння з яго шэрагу прадпрыемстваў.

Самастойнасць лёгка не даецца; давялося шмат папрацаваць усяму калектыву, вырашаць шматлікія пытанні, пачынаючы ад аптымізацыі штатнага раскладу да рамонту нумарнога фонду гасцініцы. Цяпер прадпрыемства жыве па законах самаакупнасці, адпаведна і штат работнікаў у нас аптымальны.

Свае паслугі прадастаўляем па дагаворах з арганізацыямі, фірмамі і прадпрыемствамі і па іх заяўках на размяшчэнне, а таксама па прынцыпе свабоднага засялення пры наяўнасці месцаў. Як грамадзянам Беларусі і СНД, так і далёкага замежжа. Тарыфы на паслугі ў нас, як і ва ўсім горадзе, адзіныя, незалежна ад грамадзянства.

Браніраванне нумароў ажыццяўляецца анлайн, на ўласным сайце гасцініцы **www.hotel-belarus.by**, па электроннай пошце і тэлефоне. Праводзіцца таксама браніраванне па міжнароднай сістэме **booking.com**. Інфармацыя пра гатэль размешчана ў інтэрнэце на сайце горада і на некалькіх інтэрнэт-парталах.

Маем 126 нумароў разнастайных катэгорый на 167 месцаў. Цэны залежаць ад узроўню іх камфортнасці. Нумары аснашчаны сучаснай мэбляй, халадзільнікамі, тэлефоннай сувяззю, спадарожнікавым тэлебачаннем. Дарэчы, набылі вадкакрысталічныя тэлевізары новага пакалення. Ёсць і нумары люкс, адпаведным чынам аснашчаныя. Акрамя таго, у кожным нумары прысутнічаюць элементы дэкору і дадатковыя аксесуары, якія ствараюць камфорт і ўтульнасць для кліентаў.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Родам таксама з Наваполацка. Пачынаў вучыцца ў Наваполацкім політэхнічным інстытуце, але пасля перайменавання гэтай вышэйшай навучальнай установы заканчваў ужо Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

Працаваў інжынерам на прадпрыемстве «Белінэкомп», якое займаецца наладкай сістэм вентыляцыі на прадпрыемствах нафтаперапрацоўкі і аховай паветраных басейнаў. Потым перайшоў у КУП ЖКГ: вядучы інжынер, начальнік службы гасцініцы «Беларусь», дырэктар гасцініцы.

Для гасцей горада прапануецца комплекс дадатковых паслуг: дробны рамонт, мыццё і прасаванне адзення, захоўванне ручной паклажы і рэчаў. У холе арганізаваны рознічны гандаль таварамі першай неабходнасці і сувеніраў. Можна карыстацца факсам, капіравальным апаратам і міжгароднім таксафонам. Праведзены работы па абсталяванні гасцініцы пунктамі шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт па тэхналогіі WI-FI, для чаго РУП «Белтэлекам» падведзена оптавалаконная лінія. 32 пункты ўжо працуюць, на чарзе яшчэ 80, на гэты раз хуткасных. Задавальненне для нас дарагое, але без яго цяпер нельга. Бо тым жа бізнес-турыстам проста неабходны доступ у інтэрнэт для сувязі са сваім офісам ці кліентамі.

Маем канферэнц-залу, якая можа быць арандавана для правядзення семінараў, нарад, дзелавых сустрэч.

На другім паверсе гасцініцы размешчаны буфет на 24 пасадачныя месцы, асартыментны пералік якога ўключае гарачыя стравы, выпечку, каву, гарбату, ахаладжальныя напіткі. Тут арганізавана харчаванне і ў выхадныя дні.

На тэрыторыі гасцініцы ёсць ахоўная аўтастаянка. З мэтай прыцягнення да карыстання ёю і жыхароў горада ўвялі месячны абанемент.

Вестыбюль зробіць гонар любому еўрапейскаму гатэлю.

У адным з пакояў трохпакаёвага «люкса».

У снежні мінулага года Віцебскім цэнтрам стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі праведзена праверка паслуг гасцініцы на адпаведнасць патрабаванням і на захаванне правілаў і тэхналогій аказання паслуг. І яны гэтую адпаведнасць пацвердзілі. Так што свае «дзве зоркі» мы апраўдваем. Калі дабівацца трэцяй, то патрэбна ўкладваць значныя фінансавыя сродкі, праводзіць перапланіроўку і больш сур'ёзную рэканструкцыю, аб'ядноўваць нумары, каб павялічыць іх плошчу. Гэта можа быць проста не рэнтабельна.

Лічым, што лепш ужо сёння працаваць так, як з трыма зоркамі — каб было чыста, утульна, надзейна. Сёлета сродкі збіраемся направіць на рэканструкцыю саўны, рамонт і свежую пафарбоўку фасада. Завяршылі замену неонавых шыльдаў на святлодыёдныя. А гэта таксама каштавала нятанна. Але ж мы размешчаны ў цэнтры горада, і трэба, каб было прыгожа.

У 2013 годзе на прадпрыемстве ўкаранёна сістэма аховы працы. У адпаведнасці з санітарнымі нормамі абсталяваны санітарна-бытавыя памяшканні для персаналу. Праводзяцца Дні аховы працы.

Надаём увагу прафесійнай вучобе калектыву. У мінулым годзе заплацілі грошы, і да нас прыязджалі спецыялісты, якія правялі абучэнне пакаёвак. Перад гэтым у сталічнай аўдытарскай фірме заказалі праверку нашага гасцінічнага бізнесу. Праверка не афішыравалася і выявіла некаторыя недахопы адміністратараў і пакаёвак, пасля чаго мы і правялі вучобу.

Дарэчы, адным з абавязковых патрабаванняў да адміністратараў гасцініцы з'яўляецца валоданне замежнай мовай на высокім узроўні. Так што моўнага бар'еру пры стасунках з замежнымі гасцямі няма.

Стратэгіяй нашага маркетынгу, скіраванага на павелічэнне попыту на гасцінічныя паслугі, — тлумачыць Аляксандр Мікалаевіч, — з'яўляецца павышэнне станоўчага іміджу «Беларусі» як прадпрыемства, якое стабільна працуе, а калектыў яго гарантуе высокую якасць работы і паслуг, а таксама абгрунтаваную цэнавую палітыку.

Што датычыць цэнавай палітыкі, то ўсяго адзін прыклад: кошт пражывання ў нашых двухмесных нумарах мінімальны — за суткі кліент заплаціць усяго 200 тысяч. Як вы разумееце, гэта не многа.

Прадастаўляем кліентам зніжкі, ёсць адпаведнае палажэнне аб іх. Калі засяленне адбываецца ў выхадны дзень, калі заязджаюць групы і г.д.

А што датычыць станоўчага іміджу, то сёння ён ёсць, а на тое, каб захаваць яго і ў будучыні, накіраваны рэальныя намаганні ўсяго калектыву, ад дырэктара да пакаёўкі.

УНП 391487312

Рухавік прагрэсу павінен быць «экалагічна чыстым»

ПРЫЕМНА было падчас камандзіроўкі пазнаёміцца яшчэ з адным надзвычай творчым калектывам, фактычна — калегамі. Архітэктурна-вытворчае бюро было створана ў 2001 годзе на базе гаспадарча-разліковага камунальнага прадпрыемства і спачатку займалася толькі выдачай будаўнічай дакументацыі на ўзвядзенне аб'ектаў у горадзе.

— Мы і сёння рыхтуем рашэнні выканкама на праектаванне і будаўніцтва розных аб'ектаў, на нас ускладзена гэтая адказная функцыя, — расказвае **дырэктар бюро Аляксандр ПІСАРУК.** — Але кола абавязкаў значна пашырылася. Займаемся афармленнем гарадскога асяроддзя, у тым ліку распрацоўкай дызайн-праектаў. У якасці прыкладу можна сказаць, што распрацоўвалі гарадскую эмблему да 1150-годдзя Полацка. Выконвалі канцэпцыю яго афармлення, а таксама канцэпцыю афармлення разнастайных мерапрыемстваў у нашым горадзе. Цяпер рыхтуемся да 70-годдзя Перамогі. Разгортваецца перадвыбарная кампанія, і мы таксама ўключыліся ў работу.

Калі дэталізаваць, то вельмі спецыфічны наш абавязак заключаецца ў кантролі вонкавай рэкламы ў Наваполацку. Уся гэтая праца пачалася ў 2005 годзе пасля выхаду Указа Прэзідэнта «Аб рэгуляванні рэкламнага рынку». На той час у горадзе не было ніводнага білборда і налічвалася вельмі мала рэкламных канструкцый. Напрыклад, магазіны абыходзіліся маленькімі прымітыўнымі шыльдамі. Сёння ў нас у горадзе больш за 1200 рэкламных палёў, якія зарэгістраваны і ў абавязковым парадку праходзяць пашпартызацыю.

У нашу функцыю ўваходзіць выдача дазвольнай дакументацыі на вонкавую рэкламу — пашпартоў, заключэнне дагавораў на выкарыстанне гарадской прасторы. Адсюль лагічна вынікае, што наш клопат таксама — папаўненне гарадскога бюджэту. Некаторыя лічаць, што гэта «плата за паветра». А гэта дастаткова сур'ёзныя паступленні ў бюджэт. Летась за выкарыстанне гарадской прасторы пад рэкламу ў бюджэт горада паступіла больш за мільярд рублёў! Сёлета плануем зарабіць больш. І бачым, што перспектывы ў гэтым кірунку вялікія.

Мы зыходзім з таго, што рэклама — рухавік прагрэсу і рухавік гандлю, і нашаму айчыннаму таваравытворцу важна рэкламаваць сваю прадукцыю і паслугі, каб замацавацца на рынках і быць канкурэнтаздольным.

Больш за тое, рэклама фарміруе і вонкавы воблік горада. І інфармуе яго гасцей, якія знакамітыя вытворчыя калектывы працуюць у гэтым буйным індустрыяльным цэнтры.

Так што работы хапае і сёння. Але плануем развівацца, і ўжо ў недалёкай перспектыве. Тым больш што не толькі вядзём кантроль, але і самі выходзім на рынак як вытворца вонкавай рэкламы.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Нарадзіўся ў Наваполацку. Вучыўся ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце, спецыялізацыя «Праектаванне выставак і рэкламы». Другую вышэйшую адукацыю, прававеда, атрымаў у Полацкім універсітэце. Працаваў у прыватных фірмах, пасля службы ў арміі паспрабаваў хлеб індывідуальнага прадпрымальніка, дзякуючы чаму ведае спецыфіку вонкавай рэкламы да дробязяў. Гадуе трох сыноў і лічыць гэта самым вялікім сваім дасягненнем. Праўда, граматы і падзякі на сцяне рабочага кабінета — у тым ліку ад старшыні гарвыканкама, ад архіепіскапа Полацкага і Глыбоцкага Феадосія, ад фонду «Шанц» сведчаць і пра іншыя вышыні — прафесійныя.

Збіраемся не толькі больш актыўна ўстанаўліваць свае канструкцыі, але і пашыраць уласную вытворчасць па вырабе рэкламы. Мы набылі шырокафарматны плотар новага пакалення, латаксны, на воднай аснове, ён выдае экалагічна чысты матэрыял. І зможам больш энергічна аказваць паслугі па вырабе вонкавай рэкламы. У тым ліку паслугі насельніцтву, у прыватнасці, па вырабе фоташпалер; можам друкаваць на тканінах і разнастайных матэрыялах.

Спецыяльна хачу падкрэсліць: дзякуючы таму, што набылі гэтае сучаснае абсталяванне, можам аказваць паслугі па шырокафарматным друку. Такі плотар першы на Віцебшчыне, больш няма ні ў каго. У недалёкай перспектыве — стварэнне спецыяльнага цэха, нават калі спатрэбіцца арандаваць памяшканне.

— Тэндэнцыі на рынку вонкавай рэкламы можна назваць дастаткова супярэчлівымі...

— Арыентуемся на патрабаванні, якія прад'яўляюцца мастацкім саветам. Рашэннем выканкама ў горадзе створаны мастацкі савет, куды ўваходзяць кампетэнтныя спецыялісты — мастакі, прадстаўнікі выканаўчай «вертыкалі». Так што абапіраемся на яго рашэнні. Вызначаем і парадак размяшчэння вонкавай рэкламы, і яе дызайнерскую аснову. У тым ліку патрабаванні, што прад'яўляюцца да тых жа магазінаў, якія адкрываюцца, па ўстаноўцы білбордаў, узгадненні сюжэтаў. Самае галоўнае патрабаванне — рэклама павінна быць сучаснай і стыльнай, каб фарміраваць прывабны воблік горада. Пажадана — аб'ёмнай і з падсветкай. І каб падсветка была святлодыёднай, што адпавядае дырэктыве па эканоміі энергарэсурсаў. Гэта ў інтарэсах і самога рэкламадаўцы — менш сродкаў спатрэбіцца на падсвечванне і выглядаць будзе прыгожа.

— Ці ёсць у горадзе рэклама на роднай мове, Аляксандр Іванавіч?

— Рэклама на беларускай мове ёсць — і «Рыба не паскардзіцца», і іншая экалагічная, і прапаганда роднай мовы, якая робіцца, я спадзяюся, не надакучліва. Заклікае пісаць правільна па-беларуску. «Арбуз» і «кавун», «шыповник» і «шыпшына»... Паколькі ў нас дзве дзяржаўныя мовы, то і рэкламу выконваем на абедзвюх.

— Падзяліцеся прафесійнымі сакрэтамі: якая ў вас тактыка?

— Сюжэты на ўсіх білбордах імкнёмся мяняць як мага часцей, як і іх «дыслакацыю», каб не завісалі на адным месцы і вока ў людзей не замыльвалася. І каб патрэбная інфармацыя была ў горадзе ў розных яго раёнах. Сёння вісіць на адной вуліцы, праз некаторы час перавешваем на іншую. І чытаюць жыхары розных гарадскіх раёнаў. У нас ёсць свая сетка рэкламных канструкцый, 23 уласныя білборды, а ўсяго 108 камунальных канструкцый. Прапануем размяшчаць рэкламу і дзяржаўным, і камерцыйным прадпрыемствам — нашым і віцебскім, і наогул айчынным. Выходзім з таго, што калі ўязджаеш у горад, цябе павінна сустракаць рэклама прадпрыемстваў, якія ў горадзе працуюць. На гэты конт ёсць нават адпаведнае даручэнне губернатара. У нас пры ўездзе ў Наваполацк размешчаны рэкламныя шчыты «Нафтана», «Паліміра», «Базіса» і іншых.

Плануем паступова выходзіць і на іншыя тэрыторыі — суседняга Полацка, абласнога цэнтра. Тым больш што кожны год праводзіцца «Славянскі базар», а на такім свяце запатрабавана і прыгожая, змястоўная рэклама. Па-другое, па тэрыторыі Віцебшчыны праходзяць дыхтоўныя трасы — на Піцер, у Прыбалтыку, якая побач. А на наш нафтаперапрацоўчы гігант прыязджае шмат замежных спецыялістаў. Так што ў нас сапраўды перспектыўны раён.

— Першая частка вашай афіцыйнай назвы — архітэктурна... Што маецца на ўвазе?

— Вось перад вамі партфоліа бюро, пагартайце і ўбачыце, што мы актыўна займаемся дызайнерскімі праектамі. Распрацоўваем колеравыя рашэнні фасадаў будынкаў, іх падсветкі, распрацоўваем дызайн-праекты аб'ектаў менавіта з архітэктурнага пункту погляду. Як я ўжо казаў, выдаём дазвол на праектаванне і будаўніцтва аб'ектаў, якія ўзводзяцца ў горадзе і рэгіёне, на перапланіроўкі. Плюс ускладзены функцыі па вядзенні картаграфічных пошукаў, таму трымаем архіў па картаграфічных здымках у Наваполацку. Там сабраны сістэматызаваныя звесткі, дзе якія сеткі пракладваліся і пракладваюцца. Магчыма, інтарэсы горада запатрабуюць і стварэння ў хуткім часе спецыяльнай праектнай групы. Каб быць канкурэнтаздольнымі на рынку праектавання, спатрэбіцца сур'ёзная прафесійная каманда, вядзем перамовы з людзьмі.

— А мэта рэкламы ў горадзе, акрамя чыста рыначных функцый — гэта толькі інфармаванне насельніцтва ці яшчэ і выхаванне?

— Складана раздзяляць. Вельмі часта гэта і інфармаванне, і выхаванне. Прыкладна на 30 працэнтах нашых канструкцый размешчана сацыяльная рэклама. Яе мы імкнёмся ставіць на прыярытэтных месцах. Дзякуючы гэтаму гараджане ведаюць, што 2015-ы — гэта Год моладзі, вісіць спецыяльны банер. Ёсць білборд, на якім самая лепшая маладая сям'я горада — сям'я Ніканчукоў, яна перамагла ў спаборніцтве. Нядаўна прайшло мерапрыемства, у ходзе якога прысуджалася званне «Чалавек года Віцебшчыны». Рыхтуем банер, ён на зацвярджэнні ў выканкаме.

Сацыяльная рэклама скіравана супраць СНІДу, супраць алкаголю, спайсаў — усё гэта носіць чыста выхаваўчую функцыю. І гэта правільна. Калі «адпусціць» моладзь, пойдзе не па тым шляху.

Прапагандуем беларускую сімволіку, каб было пачуццё павагі да нашага сцяга, герба. А таксама да нашых «зорак» — я маю на ўвазе буйныя здымкі Дар'і Домрачавай, Вадзіма Дзевятоўскага, чэмпіёна свету па бодзібілдынгу Ілы Лагуна.

Выраблялем разнастайную паліграфічную прадукцыю — паштоўкі, бланкі, гэта таксама наша функцыя. Аказваем насельніцтву паслугі па ксеракапіраванні, раздрукоўцы здымкаў і чарцяжоў любым фарматам, па вырабе бэйджаў, візітак. Плюс каляровы друк, паслугі сканіравання, дызайнерскія паслугі. Імкнёмся да шматфункцыянальнасці. Калектыў у нас склаўся, працуем дружна.

Цесна супрацоўнічаем з вядучымі калектывамі горада — з «Нафтанам», «Палімірам», «Дружбай» — у прыватнасці, раздрукоўваем для іх плакаты. Зараз «Базіс» адкрывае новы магазін, сапраўдны гандлёвы цэнтр, мы падрыхтавалі для іх прапановы па вырабе поўнага комплексу вонкавай рэкламы на гэтым буйным гандлёвым аб'екце. Цяпер вызначаемся з назвай. Мікрараён носіць назву Васілеўцы, там у свой час стаяла вёска з такой назвай, таму адзін з варыянтаў — «Васілёк», і яго можна цікава аформіць у беларускім стылі. Тым больш што на лагатыпе «Славянскага базару» таксама прысутнічае выява гэтай прыгожай кветкі.

Раней мы афармлялі для іх кавярню «Лілея», у тым ліку вонкавую рэкламу, гэта цалкам наша работа. І я задаволены ёю.

З першачарговых задач — афармленне горада да 70-годдзя Перамогі. У нашым распараджэнні толькі сакавік. Будуць абноўлены плакаты, іншыя сродкі нагляднасці і на вуліцах горада, і на гандлёвых прадпрыемствах, на транспарце. Ужо стала традыцыяй, што калі праводзіцца нейкае буйное мерапрыемства, то яго сімволіка размяшчаецца на ўсім транспарце, нават на маршрутках. У горадзе ёсць святлодыёдны экран, зараз рыхтуемся ўстанавіць да 9 мая яшчэ адзін, побач са «Стралецкім капіталам». І зусім нядаўна, у снежні, на адным са скрыжаванняў з'явіўся прызматрон, а гэта канструкцыя, дзе выявы мяняюць адна адну. Задзейнічаем усе гэтыя навінкі.

Вядучыя спецыялісты Вольга МУДРАЯ, Наталля ЯЦКЕВІЧ, Вольга ШЭК і Таццяна МІШКОВА абмяркоўваюць дызайн-праект новага супермаркета.

Падсумоўваючы сказанае, Аляксандр Пісарук зазначае:

— У нашай рэкламе ёсць нейкая свая апраўданая і дастаткова строгая стылістыка ў падачы, калі браць нават у параўнанні з суседнімі Польшчай і Латвіяй, дзе пабываў. Няма неразбярыхі, пастаянна ідзе кантроль і адбор. І рэклама не можа быць агрэсіўнай, як на Захадзе, яна не мае права трымаць людзей у напружанні, бо гэта абавязкова адаб'ецца на грамадскім самаадчуванні. А быць збалансаванай, калі нічога лішняга, бо ў яе, як мы толькі што гаварылі, і інфармацыйная, і выхаваўчая функцыі. Кажучы вобразна, гэты бясспрэчны рухавік прагрэсу і сам павінен быць «экалагічна чыстым». І павінна прысутнічаць сімволіка Беларусі, каб выхоўваць пачуццё гонару за сваю краіну.

Маляўнічыя пано і білборды — характэрная рыса гарадскога пейзажу.

УНП 300041917

ГАСПАДАРЫЦЬ АШЧАДНА

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Сям'я Ларыных прыехала ў Наваполацк у 1978 годзе — з таго часу Аляксей Генадзьевіч лічыць сябе навапалачанінам. Закончыў Наваполацкі політэхнічны інстытут. Прыйшоў на «Водаканал», які тады быў у складзе КУП ЖКГ, начальнікам цэха. Вырас да генеральнага дырэктара КУП ЖКГ. Пасля рэарганізацыі вярнуўся ў свой калектыў і ўзначаліў яго. Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Наш суразмоўца — **дырэктар ДП «Наваполацкводаканал» Аляксей ЛАРЫН.**

— Апошні раз журналісты «Звязды» былі ў вашым калектыве амаль два гады таму. За гэты час вы сталі ўдзельнікамі цікавага эксперыменту.

— На мэце яго была аптымізацыя структуры кіравання гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркай. Ён завяршыўся паспяхова, і ў выніку мы атрымалі эканамічную самастойнасць. Эксперымент праводзіўся па ініцыятыве віцэ-прэм'ера Анатолія Мікалаевіча Калініна і згодна з рашэннем Наваполацкага гарвыканкама, на базе КУП ЖКГ з яго даччынымі прадпрыемствамі. Усе яны былі рэарганізаваны, атрымалі юрыдычную самастойнасць і за мінулы час паказалі сваю фінансавую самадастатковасць. А «Водаканал» зрабіў такія крокі, і перш за ўсё ў тэхнічным перааснашчэнні, якія не мог зрабіць на працягу дастаткова працяглага часу.

Замянілі ўсю землярыйную тэхніку, і ў першую чаргу набылі новыя экскаватары. Купілі каналапрамывачную машыну, новы гідраманітор для прачысткі каналізацыйных сетак, самазвал, трактар. Плюс тое, што называецца малой механізацыяй і што адразу адбілася на аснашчанасці аварыйных брыгад інструментамі, якаснымі матэрыяламі, запчасткамі, спецвопраткай, разнастайнымі прыстасаваннямі для аператыўнага выканання работ. Зараз у кожнай аварыйнай брыгады — дызель-генератар, мотапомпа і многае іншае, што дазваляе мінімізаваць тэрміны выканання аварыйна-аднаўленчых работ.

Ацаніце лічбы: план мадэрнізацыі прадпрыемства за 2014 год выкананы на 187,8 %, на гэтыя мэты затрачана 4 мільярды 600 мільёнаў беларускіх рублёў. А план інвестыцый у асноўны капітал у супастаўных цэнах за 2014 год перавыкананы і складае 152,4 працэнта. Усяго ў яго накіравана больш за 9,6 млрд рублёў.

— Гэта значыць, ваша фінансавая самастойнасць становіцца адным з бясспрэчных стымулаў паспяховай працы...

— Які дае матывацыю калектыву зарабляць грошы. Людзі не толькі добрасумленна займаюцца сваімі прамымі службовымі абавязкамі, але і аказваюць арганізацыям і насельніцтву дадатковыя платныя паслугі.

Гэта стымул для больш уважанага падыходу да інвесціравання зароблены сродкаў, больш эфектыўнага іх выкарыстання. У ранейшых рамках дабіцца гэтага было практычна немагчыма, бо адчуваўся дэфіцыт бюджэтнага фінансавання, калі закрываліся ў першую чаргу найбольш вострыя пытанні.

Увогуле, наша стратэгія і тактыка скіраваны на павышэнне рэнтабельнасці працы прадпрыемства. У гэтым сэнсе не можа не радаваць, што мы дасягнулі апераджальнага тэмпу росту даходаў над ростам затрат на вытворчасць прадукцыі. У многім дзякуючы таму, што ўдалося аптымізаваць вытворчую структуру, знізіць транспартныя і накладныя расходы і невытворчыя страты вады. Усяго адзін прыклад. Складаную задачу для кіраўніцтва любога калектыву ўяўляе з сябе аптымізацыя колькаснага яго саставу. Нам удалося гэта зрабіць без вялікага вызвалення работнікаў на рынак працы, за кошт так званага натуральнага скарачэння. І калі па стане на 1 студзеня 2013 года працавалі 417 чалавек, то на 1 студзеня 2015 года — ужо 384. І гэта нягледзячы на тое, што прыняты на баланс новыя аб'екты — водаправодныя і каналізацыйныя сеткі, сеткі дажджавой каналізацыі, павышальныя насосныя станцыі, ачышчальныя збудаванні г.п. Баравуха і іншае.

Мы разумеем, што значную ўдзельную вагу ў бягучых затратах маюць матэрыяльныя рэсурсы, асабліва энергарэсурсы, іх рацыянальнае і эканомнае выкарыстанне значна зніжае сабекошт адзінкі прадукцыі. За два мінулыя гады мы правялі шэраг энерга- і рэсурсазберагальных мерапрыемстваў, і ў выніку летась

На станцыі абезжалезвання.

нават пасля павелічэння колькасці памяшканняў для абагрэву расходы на цеплавую энергію ўзраслі толькі на 8%, пры тым што вартасць па цяпле ўзрасла ў сярэднім за год на 15,6% у параўнанні з адпаведным перыядам 2013 года. А па артыкуле «Электрычная энергія» выдаткі ўзраслі на 5,6 % пры павелічэнні кошту 1 кВтч на 15,3 % у адносінах да мінулага года.

Свой плён далі замена пагружных помпаў на водазаборы «Акунёва», установка 263 энергаэфектыўных свяцільнікаў, замена на некалькіх каналізацыйных помпавых станцыях помпаў на больш прагрэсіўныя і іншае. Мы ўстанаўліваем толькі перадавое абсталяванне. Летась на аб'ектах, дзе няма цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і забеспячэння цяплом, пачалі ўкараняць цеплавыя помпы, якія выкарыстоўваюць энергію паветра і вады. Да гэтага часу задача вырашалася электраацяпленнем. А вось для гарачага водазабеспячэння помпавай станцыі трэцяга пад'ёма ў летні час усталявана сонечная воданагравальная сістэма.

Наша звышзадача — забяспечыць горад якаснай вадой. Вада ў Наваполацку вельмі смачная, уся — з артэзіянскіх свідравін. Але трэба адзначыць, што высокая якасць пітной вады забяспечваецца і стараннай працай калектыву «Водаканала». Ён у нас працаздольны і дружны, і калі кіраўніка просяць назваць імёны найлепшых, заўсёды аказваешся ў нялёгкім становішчы, бо называць патрэбна ледзьве не ўсіх. У нашай з вамі размове ўдзельнічае Ірына Яўгенаўна Зернякова. Яна — «Чалавек года Віцебшчыны», як і слесар-рамонтнік Аляксандр Аляксандравіч Мацуганаў. Найвышэйшай узнагародай міністэрства — знакам «Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі» ўзнагароджаны 12 чалавек. Добрыя словы можна сказаць у адрас начальніка цэха водаправодна-каналізацыйных сетак Уладзіслава Мікалаевіча Прарубшчыкава. Цудоўны калектыў на ўчастку водаправодных сетак — там летась брыгадзір слесараў АВР Дзмітрый Аляксандравіч Сташкевіч атрымаў званне «Залатыя рукі». Надзвычай высокакваліфікаваны ў нас склад выпрабавальнай лабараторыі на чале з Аленай Іпалітаўнай Волкавай. Яны выпрабоўваюць якасць вады — пітной і сцёкавай, пробы бяруць кругласутачна. Тут таксама выкарыстоўваюцца новыя тэхналогіі, нядаўна набылі атамна-абсарбцыйны спектрометр коштам амаль 700 мільёнаў рублёў — такіх у Беларусі не шмат.

Назваць можна вельмі многіх, бо супрацоўнікі заслугоўваюць гэтага. Карыстаюся выпадкам, віншую свой калектыў і ўсіх калег са святам — Днём работнікаў бытавога абслугоўвання насельніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Аналіз вады праводзіць інжынер-хімік Зінаіда ПЕТРАЧЭНКА.

УНП 391487287

ХОЧАШ ПРЫГАЖОСЦІ? ПРАЦУЙ



ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Юрый Аляксандравіч — палачанін. Скончыў Наваполацкі політэхнічны інстытут. У сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі з 1987 года. Спачатку ў Полацку, потым у Наваполацку. Бацька дваіх дзяцей і дзядуля дваіх унукаў хоча бачыць абодва гарады зялёнымі, прыгожымі. І шмат для гэтага робіць.

У ліку калектываў, якія ў выніку праведзенага эксперыменту атрымалі юрыдычную і эканамічную самастойнасць, і дзяржаўнае прадпрыемства «Наваполацкая спецаўтабаза». Яе **дырэктар Юрый ШЫПКІН** распавядае:

— Адразу зазначым, што спецаўтабаза з'яўляецца шматпрофільным прадпрыемствам. У першую чаргу адказваем за ўборку і ўтрыманне ў належным парадку гарадскіх тэрыторый, гэтым займаецца ўчастак санітарнай уборкі. Яго задача — ачыстка вуліц ад снегу зімой, а летам — ад пяску і бруду. Спадзяюся, вы звярнулі ўвагу, што ў нашым горадзе чыста.

Мы адказваем за размеркаванне і продаж электраэнергіі, вонкавае асвятленне вуліц і бягучае ўтрыманне электрычных сетак — у нашу структуру ўваходзіць цэх па вонкавым асвятленні горада. Хлопцы працуюць надзейна. Калі «выскоквае» нейкая аварыйная сітуацыя, яны ведаюць, што рабіць. Апошні раз справіліся за 15 хвілін.

Эксплуатацыя і ўтрыманне дарог, тратуараў і пешаходных дарожак — таксама наш клопат, як і ямачны рамонт. Для гэтага маем свой асфальтавы завод і тэхніку для ўкладкі асфальту.

За «зялёную гаспадарку» горада адказвае ўчастак зялёнага будаўніцтва (а гэта — высадка кветак на вуліцах, фарміраванне газонаў і іх догляд, абрэзка і фарміраванне кронаў дрэў).

Участак саначысткі мае свой палігон для захавання цвёрдых камунальных адходаў. Ім карыстаюцца два гарады — Полацк і Наваполацк.

Маем таксама ўчастак па абслугоўванні аўтатрактарнай тэхнікі. У нас яе многа, і рамантуем у асноўным самі. У нас уласная добрая майстэрня — тут і шынамантаж, і профільныя цэхі, і свае добрыя майстры.

У калектыве працуюць 365 чалавек. Як бачыце, рабочыя рукі ёсць, і яны дастаткова ўмелыя. Таму імкнёмся зарабіць сродкі і на асфальтаванні тэрыторыі прадпрыемстваў, прадастаўленні індывідуальных паслуг, у тым ліку прадастаўленні тэхнікі, на транспартных паслугах, электрамантажных работах, наогул устаноўцы інжынернага абсталявання, будаўніцтве інжынерных збудаванняў, земляных работах, шукаем іншы занятак. У 2014 годзе сур'ёзныя аб'ёмы работ выконвалі нават у Гарадку, дзе праходзілі «Дажынкі», і мне за калектыў сорамна не было. Сёлета яны пройдуць у Талачыне, і мы таксама спатрэбіліся: ужо атрымалі запрашэнне прыняць удзел у падрыхтоўцы гэтага свята хлебаробаў.

— У якім сэнсе можна гаварыць, Юрый Аляксандравіч, што вашы спецыялісты ўплываюць на эканомію электраэнергіі?

— Даводзіцца адпаведны паказчык — мы яго выконваем. У прыватнасці ставім шафы кіравання вулічным асвятленнем з рэгулюемымі ўзмацняльнікамі магутнасці. У залежнасці ад часу сутак аўтаматыка рэгулюе інтэнсіўнасць асвятлення вуліц і прыносіць 51 мільён рублёў эканоміі на кожнай шафе. Сёлета паставім яшчэ некалькі такіх, — і ў нас будзе закрыты ўвесь горад. Упраўляецца ўся гэтая сістэма камп'ютарам. Важна, каб яна працавала бездакорна. А на ўсіх пешаходных пераходах, замест звычайных лямпаў, усталяваны энергаэфектыўныя святлодыёдныя свяцільнікі.

Клапоцімся і пра тэхнічную ўзброенасць сваіх брыгад. Купілі зараз дадаткова два камбінаваныя МАЗы. На лета на такі аўтамабіль ставіцца палівамыечная машына са шчоткай, а зімой — пяскараскідвальнае абсталяванне. Да гэтага часу працавала адна такая «ўмеліца».

Пасля атрымання самастойнасці наша прадпрыемства прыбытковае. Летась паспяхова выканалі даведзеныя заданні па выручцы ад рэалізацыі прадукцыі ў разліку на аднаго працуючага, зніжэнні ўзроўню затрат на вытворчасць прадукцыі ў фактычных цэнах, інвестыцыях у асноўны капітал, росце заработнай платы. Суадносіны росту прадукцыйнасці працы да заработнай платы — 132% пры плане 105%. Стараемся забяспечыць работнікам усе выплаты, прадугледжаныя калектыўным дагаворам. Даём прэмію і да Дня камунальніка, дзяцей супрацоўнікаў адпраўляем у лагеры адпачынку, аказваем матэрыяльную дапамогу да адпачынку і Новага года — паўтара мільёна (можна накрыць прыгожы стол і годна сустрэць свята).

Успамінаецца такі факт: нейкі час таму мы працавалі на субпадрадзе па добраўпарадкаванні і азеляненні Браслаўскага масласырзавода. Ужо тады я зразумеў, што з нашымі людзьмі можна брацца і за большыя аб'ёмы. Напярэдадні прафесійнага свята назавём імёны найбольш старанных. Гэта галоўны інжынер Дзмітрый Аляксандравіч Сакалоў, начальнік аўтатрактарнай калоны Дзмітрый Алегавіч Кірэй, машыніст аўтагрэйдара Сяргей Пятровіч Лобыр, вадзіцель Віктар Міхайлавіч Гарбачэўскі, трактарысты Яўген Віктаравіч Смяян і Дзмітрый Яўгенавіч Вараб'ёў, начальнік участка санітарнай уборкі горада Алена Станіславаўна Іспянкова, уборшчыкі тэрыторыі Іна Аляксандраўна Тарара і Мая Казіміраўна Заблоцкая, рабочыя зялёнага будаўніцтва Ірына Васільеўна Марозава, Марына Дзмітрыеўна Карабцова, Андрэй Уладзіміравіч Касач і Яраслаў Мікалаевіч Ляухін, начальнік цэха па вонкавым асвятленні горада Эдуард Аляксандравіч Уласаў, начальнік перасоўнай электратэхнічнай лабараторыі Алег Пятровіч Паўленка, электраманцёр Сяргей Пятровіч Іваноў. Пералік можна працягваць.

Сёння хачу сказаць усім шчыры дзякуй за добрасумленную працу і павіншаваць са святам!



Бездакорна выконваюць свае абавязкі Наталля КОТАВА і Ларыса ПРОТАС.

Рабочы ўчастка зялёнага будаўніцтва Яраслаў ЛЯУХІН.

УНП 391487274

Спецвыпуск падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Творчая брыгада «Звязды» шчыра дзякуе за дапамогу ў падрыхтоўцы спецвыпуску галоўнаму спецыялісту аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наваполацкага гарвыканкама Уладзіміру Бяляеву, намесніку дырэктара ДП «Наваполацкводаканал» Івану Крывелю, намесніку дырэктара ААТ «Базіс-Наваполацк» Таццяне Малаток, намесніку дырэктара ДП «Наваполацкая спецаўтабаза» Іне Кулазе — усім, хто нам спрыяў.

■ Узровень-40

ПЕРШЫ ПРЫКЛАД У ЖЫЦЦІ

Бацьку Уладзіміру Васільевічу...

Кажуць, што чалавек пачынае памятаць сам сябе прыкладна з пяцігадовага ўзросту. Мой жа першы дзіцячы ўспамін адсылае да іншай даты... Бацькі ў той час будаваліся, таму часова жылі ў сястры маці. Яны купілі хату ў іншым раёне. Ужо бацькава сястра адвяла нам пад сядзібу кавалак уласнага ўчастка. Адлегласць напрасткі паміж дзвюма кропкамі — метраў чатырыста... Дзіўныя адчуванні: я быццам назіраю сам за сабой малым збоку. Бягу па доўгім вузкім завулку, мне страшна. Нарэшце спыняюся ў яго канцы і бачу дах нашай хаты. На каньку разам з іншымі мужчынамі сядзіць мой бацька у белай майцы і нешта прыбівае. Зараз мне трэба збочыць улева, потым амаль адразу направа пад узгорак, яшчэ крыху — і я на месцы. Але якраз на гэты момант дах з бацькам знікне з вачэй. Уздыхаю і раблю першы крок... Брамка была расчынена ці яе ўвогуле яшчэ не было — я забягаю ў двор. Пад нагамі стружка, сасновая кара ад жэрдак. Прыціскаю рукі да грудзей і моўчкі гляджу ўверх на бацьку... Нехта з мужчын заўважае мяне і крычыць штосьці яму. Той хутка спускаецца да мяне, амаль у гэты ж момант з'яўляецца і ўсхваляваная маці. Відаць, я з ёй ужо праходзіў гэты шлях і запомніў дарогу. Калі пазней суадносілі гэта здарэнне з момантам будоўлі, выходзіла, што мне на той момант было крышачку больш за тры гады...

ЯШЧЭ адзін успамін таксама звязаны з бацькам, дакладней з яго армейскай фатаграфіяй. Ён, відаць, быў на працы, мы дома ўдвух з маці. Каб нечым заняць мяне, яна дастае вялікі цяжкі альбом з сямейнымі здымкамі, і я адразу выцягваю і не выпускаю з рук адзін. Бацька служыў у Групе савецкіх войск у Германіі. На здымку — зняты збоку танк у нейкім ельніку. На пярэднім плане на брані — бравы танкіст, мой бацька... Паглядзеўшы на фатаграфію, жонка толькі сцвярджальна кіўнула галавой, калі я прызнаўся, што, гледзячы на здымак, доўгія гады марыў стаць танкістам. Маўляў, зразумела чаму. Хлопчыкі заўсёды хочуць быць падобнымі на татаў. Як для некага БМВ апошняй мадэлі — запаветная мара, так для мяне і дагэтуль танкі — узор вытанчаных формаў і дызайну ў брані...

У нашай сям'і ўсе любяць жарты, гумар, з лёгкасцю могуць пакпіць з саміх сябе. Маці — тая яшчэ прыдумшчыца. Колькі разоў казаў жонцы, што калі б тая з пачатку замужжа запісвала за ёй смешныя словы і выразы, ужо выдала б пяцітомнік. У нас столькі прыдуманых слоўцаў, нейкіх скарачэнняў, што часам староннему чалавеку даводзіцца перакладаць, пра што мы гаварылі. І ўсё ж лічу, што ўменне жартаваць у мяне ад бацькі.

АДНОЙЧЫ мы з ім збіралі каларадскіх жукоў. Напрыканцы занятку я спытаў, што мы з імі будзем рабіць. «Смажыць», — адказаў бацька. Я сумеўся. Як смажыць, гэтага ж ніхто не робіць?! Але бацька быў сур'ёзны. Больш за тое, ён схадзіў у хату, вынес гранёны кілішак, які ўручыў мне са словамі: «Адна бяда — алей скончыўся. Я пакуль прыгатую патэльню, а ты збегай да цёткі Зіны, пазыч кілішак алею». Ідучы праз агарод і адчуваю, што нешта тут не тое. Але ж бацька сказаў! Заходжу ў двор да цёткі, якая выходзіць насустрач. Так і так, кажу, бацька прасіў пазычыць алею. «А навошта?» — чамусьці ўсміхаецца цётка. «Жукоў каларадскіх смажыць будзем!» Тут яна ўвогуле пачынае прыкрываць рот рукой... Памятаю, што дадому вяртаўся разам з цёткай Зінай, якая адразу пачала ўшчуваць бацьку. А мне было крыўдна: і з прычыны таго, што бацька падмануў, і з прычыны таго, што я паверыў. А не паверыць яму я не мог: гэта ж бацька! Затое, напэўна, менавіта з таго моманту запомніў на ўсё жыццё: калі хочаш, каб жарт атрымаўся, ты павінен вымаўляць яго з самым сур'ёзным выглядам. Каб ні ў каго нават ценю сумнення не ўзнікла, што гэта няпраўда. Яшчэ адзін падобны выпадак адбыўся пазней. Неяк я ўгаварыў бацьку паехаць са мной на рыбалку на сажалку палавіць карасікаў. Ну, вельмі мне хацелася паехаць з ім! А ён вельмі супраціўляўся (працы па гаспадарцы хапала заўсёды), але ў выніку здаўся. Я падрыхтаваў вуды, зрабіў цеста. Прыехалі, расклаліся. І тут бацька пытаецца ў мяне з сур'ёзным выглядам, пазіраючы на цеста: «А як яго вешаць на кручок?» Вы не паверыце, сусвет для мяне літаральна ледзь не абрынуўся. Як, мой бацька нечага не ведае?! Штосьці не ўмее?.. Вядома, гэта быў яго чарговы жарт.

БАЦЬКА быў майстрам на ўсе рукі ў прамым сэнсе гэтых слоў. Ніхто ў радні з мужчын не рабіў нічога так якасна і надзейна, як бацька. Дагэтуль захавалася шмат зробленага яго рукамі. Шчыміць сэрца, калі зараз з братам нам даводзіцца нешта перароблівать, мяняць... Усё гэта пераняў мой малодшы брат. Я абсалютна ўпэўнены, што калі яму даць адпаведны станок і паказаць, як робяць агранку каштоўных камянёў, ён здолее гэта паўтарыць. Бацька сапраўды рабіў на дзесяцігоддзі. Прычым, як правіла, у большасці сваёй выконваў нават цяжкую працу адзін. Заліваў дарожкі на ўчастку і бетонныя калодзежныя кольцы, ставіў агароджы, калоў дровы... Маё дзяцінства прайшло на валяльна-лямцавай фабрыцы, дзе працавалі мае бацькі і шматлікія родныя. Я сноўдаў па цэхах, складах ад аднаго родзіча да другога, але найбольш падабалася быць з бацькам. Майстэрні, шматлікія станкі, інструменты, розныя цікавыя хлапечым вачам і рукам жалезкі... Улетку наладчыкі ў сваіх чорных, прапахлых воўнай робах у вольны час выходзілі на лаўку пад дрэвамі, курылі, жартавалі, а мне падабалася сядзець з імі. І сюды ж беглі работніцы, калі выходзіў са строю часальны станок: шукаць найперш бацьку. Усе ведалі, што той абавязкова зробіць, адрамантуе. Па дапамогу звярталіся і суседзі, і сваякі.

ЁН без слоў апранаўся, браў ліхтарык і позна ўвечары, у мароз і дождж ішоў у хлеў, лез на гарышча па нашай з братам просьбе па якую-небудзь драбязу, без якой наша хлапечае існаванне ў той самы момант было проста немагчымым! Маці нешта незадаволена казала, а ён ішоў і прыносіў патрэбнае. Дапамагчы нешта адпілаваць, выстругаць? На кухні каля печкі ставілася табурэтка і праца кіпела!.. Захацелася папускаць у ручаі, што бурліў увесну на скрыжаванні ад талага снегу, не проста папяровы карабелік, а катар? Выразаем яго разам з тоўстага кавалка сасновай кары. Аднойчы папрасіў вытачыць гранату-«лімонку». З цурак выразаць «боепрыпасы» з ручкамі я і сам налаўчыўся, а тут захацелася менавіта такую. Паслухаў, нічога не абяцаў. А праз дзень ці два моўчкі працягнуў вытачаную на станку «лімонку»... Сапраўднай скарбніцай для нас быў набор бацькавых інструментаў! Яшчэ драўляныя гэблікі, нажоўкі, сякеркі, стамескі, малаткі — ніякіх табе цяперашніх шрубавёртаў і электрадрыляў. Можаце ўявіць, што мы часам сваімі няўмелымі рукамі рабілі з тым інструментам? Возьмеш нажоўку па метале і палатно, а тое і два, зараз зламаеш. Ці сякерай — па цвіку. Не сказаць, каб тое выклікала ў бацькі радасць, але і папрокаў асаблівых мы не чулі. А самай страшнай пагрозай з яго боку для мяне было пазбавіцца любімай сякеркі за тое, што часта сек сабе пальцы.

Ён без слоў апранаўся, браў ліхтарык і позна ўвечары, у мароз і дождж ішоў у хлеў, лез на гарышча па нашай з братам просьбе па якую-небудзь драбязу, без якой наша хлапечае існаванне ў той самы момант было проста немагчымым.

НЕ было такога, каб ён падняў на нас руку. Памятаю толькі некалькі эпізодаў, прычым, вінаваты быў я сам. Аднойчы папрасіў яго ўсталяваць на веласіпедзе новы багажнік. Бацька прывёз яго з Мінска, паставіў, але нешта не паспеў падкруціць. Сказаў, што катацца на веласіпедзе магу, але на багажніку каб нічога не перавозіў. А за брамкай ужо сябры чакаюць. Пахваліцца ж хочацца, вось і прапанаваў адразу некаму сесці ззаду. А тут бацька якраз на вуліцу выйшаў. Убачыў, схапіў нейкі дубец і — па спіне, па куртцы. Балюча не было, толькі крыўдна, што перад хлопцамі. Іншым разам знаёмая «спаліла» нас. Калі мы кампаніяй курылі, паабяцала расказаць бацькам. А тыя якраз па крамах пайшлі, так што мелі ўсе шанцы сустрэцца з той жанчынай. Вяртаюцца, адчуваю, справа нічым добрым для мяне не скончыцца... Але маці пагаварыла з бацькам, і ўсё абышлося толькі словамі... Яшчэ памятаю яго рэакцыю, калі ўпершыню назваў бацькам. Ужо падлетак, казаць «тата» неяк няёмка — быццам па-дзіцячаму. «Отец» — наадварот, занадта, як мне падавалася, афіцыйна. Мабыць, яму было крыўдна, ён адчуў нейкі негатыўны падтэкст... Зноў умяшалася маці, патлумачыла, што ў беларускім «бацьку» няма нічога такога. Ён нейкі час прызвычайваўся, пакуль перастаў напружвацца пры гэтым слове.

...Наш Уладзімір Васільевіч памёр у сакавіку. Мне было 13, малодшаму брату — 10. Зараз я практычна ў такім жа ўзросце, у якім бацька пайшоў ад нас...

Ямагу гэтак жа доўга, як і ён, сядзець на кукішках, выконваючы якую манатонную працу. Мыючы посуд, прыгадваю, як гэта рабіў некалі бацька. Гэтак жа, як на даўніх фотаздымках ён, часта стаю з цыгарэтай, прытуліўшыся ў калідоры да дзвярнога касяка. Увечары зімой, каб не выходзіць на холад, бацька прыадчыняў у печцы юшку і выпускаў у комін дым. Я зараз уключаю кухонную выцяжку... І справа, вядома, не ў знешнім падабенстве, перанятых на свядомым ці падсвядомым узроўні бытавых звычках.

Нам не выпала сесці з бацькам пасля сумесна зробленай працы за адзін стол, перакурыць, паслухаць ад яго якую параду. І ўсё ж я думаю, што галоўнае ён паспеў закласці ў нас. Жыццё без яго — гэта таксама досвед, толькі іншы, не такі, як у астатніх. Мы такія, якія мы ёсць... Мы ўсе родам з дзяцінства...

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Шлях да духоўнасці

КНІГА ДЛЯ ЯДНАННЯ СЭРЦАЎ

Размова аб ролі кнігі ў сённяшняй сістэме каштоўнасцяў стала галоўнай тэмай Дня праваслаўнай кнігі, які ў Беларусі адзначаецца пяты раз. У Гомельскай абласной бібліятэцы з гэтай нагоды прадставілі літаратурна-мастацкую кампазіцыю «Жывая крыніца духоўнасці». Цэнтральным экспанатам кніжнай выставы стала Біблія 1888 года выдання.

— Фаліянт быў выпушчаны расійскім выдаўцом Маўрыкіем Вольфам, — расказаў намеснік дырэктара ўстановы Алег Ананьеў. — Гэта першы з трох тамоў Бібліі, якая выдадзена тыражом усяго 100 асобнікаў. У кнізе 230 ілюстрацый французскага мастака Гюстава Дарэ, выкананых у 1864—1866 гадах. Вытанчаныя гравюры жывымі карцінамі раскрываюць перад позіркам чытача шматвяковую біблейскую гісторыю.

Мэта сёлетняга свята — яшчэ раз звярнуць увагу людзей на карысць, якую прыносіць праваслаўная кніга. У гэтым годзе мерапрыемствы прымеркаваны да 1000-годдзя смерці святога роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра. Епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан нагадаў, што пару стагоддзяў таму дзяцей вучылі чытаць па псалтыры:

— Першыя кнігі царкоўнага прызначэння, якія трапілі на Русь, былі на грэчаскай мове. Яны паслужылі адукацыі нашых народаў. Сапраўды, кніга адыграла велізарную ролю ў вывучэнні навук, фарміраванні светапогляду і спазнанні Бога людзьмі. Было б добра, каб мы захоўвалі старыя выданні, з любоўю ставіліся да новых, якія нясуць святло і дабро, і памяталі, што гэта — багацце нашага народа, дзяржавы, гэта — наша мудрасць. Калі бярэш старажытную кнігу, гартаеш жоўтыя старонкі — бачыш пазнакі, разумееш, колькі чалавечых рук яе трымалі, колькі душ пражылі жыццё разам з ёй. Кніга аб'ядноўвае сотні пакаленняў, нашы славянскія народы. Менавіта праз яе людзі маюць трывалыя стасункі і моляцца аб еднасці сэрцаў у Праваслаўнай царкве.

Таксама ў гэты дзень прайшла прэзентацыя літаратурнага конкурсу «Праваслаўе — мая надзея». Яго сумесна праводзяць Гомельскае епархіяльнае ўпраўленне і Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Конкурс праходзіць па пяці намінацыях: паэзія, проза, публіцыстыка, дзіцячая літаратура і аўтарская песня. Аўтары маюць магчымасць падаць свае творы да 1 ліпеня 2015 года.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара



ПРОСТА медсястра МАРЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі пачалася вайна, жаночага вайсковага адзення ў нас не было, бо ў той час вельмі мала ў арміі служыла жанчын. Нам выдалі кальсоны і сарочку. Толькі рэйтузы жаночыя. Боты кірзавыя 40-га памеру. Мы анучы ніяк не маглі навучыцца накручваць. Колькі мазалёў крывавых намулялі! Боцікі і панчохі з'явіліся значна пазней — недзе ў 1944 годзе. А ў 1943 годзе нам выдалі жаночыя гімнасцёркі з пагонамі і спадніцы. Станікі да самага канца вайны мы шылі самі — з той тканіны, што давалі на анучы. Пісалі лісты ў тыл і прасілі: дасылайце выкрайкі станікаў. Боты ў канцы вайны для мяне сшыў адзін салдат, што лячыўся ў шпіталі. Кажа аднойчы: «У цябе ёсць брызентавы рэчмяшок? Давай я табе боты пашыю». І пашыў.

На грудзях 94-гадовай Марыі Аляксандраўны сярод шматлікіх узнагарод — сціплы на выгляд медаль «За адвагу». Яго часта называюць салдацкім ордэнам — выдавалі толькі за асабістую мужнасць і адвагу ў баях. Без усялякага пафасу старшы сяржант медыцынскай службы расказвае аб тым, як была атрымана ўзнагарода:

— Я спачатку служыла ў зенітным палку санінструктарам — зусім блізка да фронту. Наш полк стаяў недалёка ад Асташкавіч, гэта ў сённяшнім Светлагорскім раёне. Ішла доўгая падрыхтоўка да правядзення аперацыі «Багратыён». Ведаю, што тады ў нашу 65-ю армію, якой камандаваў генерал Павел Батаў, прыязджалі маршалы Георгій Жукаў і Канстанцін Ракасоўскі. Калі аперацыя пачалася, нямецкія самалёты наляцелі бамбіць і нашы сем зенітных батарэй. Вось тады мне давялося выносіць параненых з поля бою. Пра смерць нават думкі не было. Перад наступленнем усім прыносілі па 100 грамаў. Салдатам выдавалі тытунь, афіцэрам — цыгарэты. І ўсім — па шакаладцы. Але ж спірт і махорку я аддавала мужчынам, а яны мне — шакаладкі. У мяне былі адны шакаладкі. Я потым з хлопцамі дзялілася — наце закусіце. Мы тады нічога не баяліся. Званок раздаецца па спецсувязі: медсястру хутчэй! Я і пабегла. Салдат у галаву быў паранены. Асколак невялікі, але крыві многа. Толькі я яго перавязала, адцягнула ў бяспечнае месца, званок з другой батарэі — там таксама паранены. І так шмат разоў. Бягу — непадалёк узарвалася міна. Мяне выбухавай хваляй адкінула на дрэва, параніла нагу. З траншэі салдаты выцягнулі — і ў шпіталь. Там тры дні паляжала, стала прасіцца выпісаць, а начальнік шпіталя не адпускае. Кажа, у нас не хапае хірургічных сёстраў і тваё месца цяпер тут. Так я засталася ў палкавым шпіталі. А медаль атрымала потым, нашмат пазней...

Выпілі, закусілі, а потым пачалі плакаць: дык хто ж нас прыме? Адзін без ног, другі без рук, хто ў галаву паранены, хто сляпы...

Дзяўчаты-медыкі не хадзілі ў атакі і нават зброю ў рукі не бралі. Яны выцягвалі параненых з поля бою. Пад цьмянымі лямпачкамі разам з урачамі рабілі складаныя аперацыі. Ампутавалі рукі і ногі, калі пагражала газавая гангрэна. Запасу донарскай крыві не было. Таму, калі прывозілі параненага, урач аддаваў загад: «Марыя, у цябе другая група — лажыся на стол побач». Вось так, прамым пераліванем 300-400 грамаў сваёй крыві юныя сястрычкі выратоўвалі жыцці салдат і афіцэраў.

— Яму адразу лягчэй, а я стаю, галава

кружыцца, іду ў куток, выпіваю шклянку салодкага чаю, кавалак хлеба з'ядаю. Было, што не праходзіла гадзіны, як зноў клікалі працаваць. Дарэчы, донарамі часта прасілі стаць і тых параненых, якія ўжо ішлі на папраўку. Калі наступленне — было, што і суткамі ў аперацыйных і перавязачных працавалі. Многа рук ды ног тады маладым хлопцам адрэзалі... Як падумаю, колькі людзей маглі б выратаваць, калі б тады былі такія лекі, як сёння!.. А так — тры дні паляжаць у нас, і адпраўляем іх у тыл на санітарных цягніках. Было, што і цягнікі бамбілі, не ўсе да дому даязджалі...

«ГІТЛЕР КАПУТ, РУСКІ САЛДАТ — ГУТ»

Дзень Перамогі Марыя Аляксандраўна не забудзе ніколі. У 1945-м іх шпіталь размяшчаўся ў адным з невялікіх германскіх гарадоў. Камендант, які папярэдне выбіраў памяшканне для яго, расказваў, што ў будынку да гэтага размяшчалася бальніца для псіхічна хворых. Пацыентаў немцы расстралялі перад тым, як пакінуць горад. Усім было ўжо зразумела, што вайна вось-вось скончыцца, але і перад самай капітуляцыяй работы ў медыкаў хапала: у шпіталь прывозілі цяжкапараненых.

— Памятаю, як 8 мая нашы лёгкапараненыя сядзяць на вуліцы, кураць, чакаюць паведамленняў, нервуюцца... Раптам пачалася моцная стральба. Выйшаў хірург і кажа: «Відаць, немцы прарвалі наш кацёл». Такія выпадкі былі, калі немцы з катла прарываліся і знішчалі ўсё на сваім шляху, у тым ліку і шпіталі. Але тут зайшоў начальнік шпіталя і гаворыць: «Таварышы, вайна скончылася, перамога!». У мяне і цяпер мароз па скуры. Нам даў загад — акажыце лёгкапараненым дапамогу і выходзьце ў двор. На ўсё жыццё запомніла, якое ў той дзень узыходзіла вялікае прыгожае сонца! Яно таксама радавалася нашай перамозе. Мы пастроіліся ў дварэ, а потым са сваім белым з чырвоным крыжам сцягам прайшлі з песнямі па горадзе. А немцы таксама чакалі заканчэння вайны. З балконаў, з вокнаў яны крычалі: «Гітлер капут, Сталін гут, рускі салдат — гут». Калі мы вярнуліся, пайшлі па палатах да цяжкапараненых — іх апавясціць пра перамогу. Налілі па 100 грамаў франтавых, зрабілі бутэрброды, кажам: «Таварышы — перамога!» Яны ўсміхаюцца, хто можа. Выпілі, закусілі, а потым пачалі плакаць: дык хто ж нас прыме? Адзін без ног, другі без рук, хто ў галаву паранены, хто сляпы... Мы пачалі іх суцяшаць. Адзін малады салдат без нагі тады гаворыць: «Сястра, мы з табой яшчэ станцуем». Моцны быў. Мы і самі плакалі з імі. У той дзень мы накрылі сталы і разам з лёгкапараненымі адзначалі Дзень Перамогі. А потым прыехалі з палітаддзела, прывезлі для ўсіх нас медалі «Перамога над Германіяй».

Для Марыі, як і для многіх, вайсковая служба не скончылася ў маі 1945 года. Трэба было далечваць параненых, адпраўляць іх у Савецкі Саюз. Пры гэтым колькасць шпіталяў пастаянна скарачалася. Але, пакуль савецкія войскі стаялі ў Германіі, побач заставаліся і медыкі.

Дэмабілізавалася жанчына ў верасні 1946-га — ужо разам з мужам Аляксандрам і дзіцем пад сэрцам. Запіс пра рэгістрацыю шлюбу і прозвішча Амяльчук яна атрымала ў консульстве Познані. Там маладыя распісаліся без усялякіх сведак і пампезнасцяў.

«Я ПАСТАРАЮСЯ, І ТЫ МЯНЕ ПАКАХАЕШ»

Дарэчы, гісторыя кахання Марыі і Аляксандра вартая асобнай увагі. Яшчэ да вайны яна пайшла з сяброўкай за кампанію да варажбіткі. Тая сказала сяброўцы, што дзяўчына хутка выйдзе замуж, а Марыі — што прыйдзецца доўга чакаць і нарачоны будзе вельмі здалёк. Так і атрымалася:

— Я пазнаёмілася з Сашам, калі ён раней прыязджаў у наш зенітны полк. Там дзяўчат было толькі пяць, і таму мы ўсе карысталіся папулярнасцю. На святах пакуль адзін хлопец танцуе з дзяўчынай, другі чакае. Кажа: ну ўсё, табе хопіць, дай і мне патанцаваць. Вой, тады хлопцы зусім іншыя былі! Яны баяліся дакрануцца ці пацалаваць у шчаку. Сціплыя такія. А ён, Саша, са мной нават не танцаваў. І я на яго не звяртала ўвагі. А вось калі закончылася вайна, мяне адправілі па перавязачныя матэрыялы на склад у суседні нямецкі горад Барт. Там стаяў штаб арміі, і ў ім працавала вольнанаёмнай машыністкай мая сяброўка, таксама Маша. З ёй мы сустрэліся і пайшлі вячэраць у афіцэрскую сталовую. Дзе і сустрэлі Аляксандра. Маша прапанавала: «Саша, пазнаёмся». Я кажу: «Мы крыху знаёмыя». Потым маю сяброўку тэрмінова выклікалі друкаваць матэрыялы для штаба фронту. Мы з Сашам пагулялі, у кіно схадзілі, на лаўцы пасядзелі. Ён мне ўсю сваю біяграфію расказаў, а потым кажа: «Выходзь за мяне замуж». Так вось адразу. Я кажу: «Ты ж мяне зусім не ведаеш». — «Я на працягу вайны ўвесь час, як мог, сачыў, дзе ты, у якім шпіталі працуеш. Ты мяне пакуль не кахаеш, але я пастараюся, і ты мяне пакахаеш». Мы ў той вечар сустрэлі знаёмага палкоўніка, які ўзрадаваўся нам абаім і запрасіў да сябе ў госці. Ён даў мне ключ ад свайго рабочага кабінета, каб мне было дзе пераначаваць. З вечара мы з Сашам развіталіся, а раніцай, а 6 гадзіне ён прыйшоў са снеданнем на падносе. Потым ён дамовіўся, што будзе суправаджаць мяне. І калі мы вечарам прыехалі ў шпіталь, ён пайшоў да майго начальніка і кажа яму: «Маша — мая нявеста». Кожны выхадны прыязджаў да мяне, а я ўсё не магла адважыцца выйсці за яго замуж. Наша фельчарка, Ніна, тады і кажа: «Табе пашанцавала, такі добры хлопец пакахаў. А мяне за вайну ніводзін хлопец нават не пацалаваў. Што ты яшчэ хочаш? Вось паедзеш дадому адна, а яго страціш». І ўрэшце я сама пачала думаць, што гэта мой лёс. Тым больш яго начальнік штаба мяне таксама ўгаворваў. Сказаў: «Афіцэры розныя ёсць, але ж капітана Аляксандра Амельчука я даўно ведаю, ён вельмі прыстойны чалавек». Мужа хацелі пакінуць у арміі, але яго ваенная кар'ера не хвалявала, і таму ў 1946 годзе мы разам дэмабілізаваліся.

У Аляксандра Гаўрылавіча не атрымалася вывучыцца на мастака, як ён марыў да вайны. Але ж дзве вышэйшыя адукацыі (эканамічная і будаўнічая), якія атрымаў ужо пасля дэмабілізацыі, забяспечылі запатрабаванасць на доўгае жыццё. Марыя пасля вайны на працягу 42 гадоў (з іх 16, ужо знаходзячыся на пенсіі) працавала старшай медсястрой паліклінікі № 8 Гомеля. Яны разам пражылі 56 гадоў. Нарадзілі дзвюх дачок, адна з якіх памерла ў дзяцінстве. Былі побач у горы і радасці. Марыя Аляксандраўна заўсёды ганарылася, што муж усё можа рабіць сам. І цяпер, праз 13 гадоў пасля яго смерці, паказвае мэблю, створаную яго рукамі.

«Запасу донарскай крыві не было. Таму, калі прывозілі параненага, урач аддаваў загад: «Марыя, у цябе другая група — лажыся на стол побач».

Жанчыны, чый лёс перакрэсліла Вялікая Айчынная, не абмяркоўвалі шыкоўныя сукенкі кіназорак, сілуэты спадніц, колер пазногцяў і ўласцівасці аўтамабіляў. Не разважалі яны над сэнсам існавання і не захапляліся псіхалагічнымі тэорыямі стасункаў. Але яны так сканцэнтравана пражылі чатыры гады жудаснага ліхалецця, што таго чалавечага і прафесійнага вопыту хапіла на ўсё астатняе жыццё. Яны перамаглі саму смерць, таму ведаюць сапраўдную цану ўсяго і ўсіх.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота з архіва Марыі АМЯЛЬЧУК.

■ З нагоды

Узнагароды — французскім ветэранам

Медалі «70 гадоў вызвалення Беларусі» яшчэ летась атрымалі ўсе ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны — беларусы. На днях такія ўзнагароды знайшлі сваіх герояў у Францыі.

Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка правёў сустрэчы ў Ліёне і Канах з ветэранамі французскай эскадрыллі «Нармандыя — Нёман». Як паведамляе Пасольства Беларусі ў Францыі, ад імя Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі Андрэ Піроні і Гаелю Табурэ ўручылі медалі «70 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Павел Латушка выказаў словы ўдзячнасці французскім ветэранам за іх гераізм і самаахвярнасць, праяўленыя ў ходзе Другой сусветнай вайны, за іх уклад у вызваленне Беларусі і іншых краін ад нямецка-фашысцкай акупацыі. Як адзначыў пасол, эскадрылля «Нармандыя — Нёман» у гады вайны з'яўлялася яскравым прыкладам савецка-французскага баявога братэрства па зброі. «У Беларусі з вялікай павагай адносяцца да подзвігу французскіх лётчыкаў, ведаюць і шануюць памяць аб усіх французскіх салдатах і афіцэрах, якія змагаліся за вызваленне Беларусі», — падкрэсліў Павел Латушка.

Як паведамілі ў пасольстве, 4 чэрвеня ў Музеі космасу і паветраплавання ў горадзе Ле Буржэ адбудзецца адкрыццё новай экспазіцыі, прысвечанай авіяпалку «Нармандыя — Нёман».

Вераніка КАНЮТА

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 31 марта 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)		
Наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества	**Начальная цена предмета торгов без НДС, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708118745, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Трудовая, 6-3 (общая площадь 282,4 кв.м, наименование – Административно-производственные помещения; назначение – административное помещение)	1 484 032 000	200 000 000

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **31 марта 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 20.03.2015 по 27.03.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 – (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона) по поручению
ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (продавец)
ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ИМУЩЕСТВА:

